Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 3 студзеня 1986 г. № 1 (3307) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 10 кап.

Сёння, калі камп'ютэрызацыя вытворчасці набывае нябачны размах, ці не адна з самых прэстыжных спецыяльнасцей — аператар ЭВМ. Менавіта асновамі гэтай спецыяльнасці авалодваюць вучні 19-й мінскай сярэдняй школы. Дзвюх з іх — дзесяцікласніц Іну Дубовік і Ганну Сакалоўскую вы бачыце на гэтым здымку. Аб'ектыў фотаапарата занатаваў іх у класе, дзе адбываюцца ўрокі асноў інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі. Да паслуг навучэнцаў электронна-вылічальная машына, дысплеі, іншая сучасная апаратура. Практычна знаёмяць вучняў з мовай кібернетычных машын шэфы — супрацоўнікі Беларускага навукова-даследчага інстытута прыборабудавання.

Фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.

Унумары:

Павел ДЗЮБАЙЛА.
БЫТ ЦІ БЫЦЦЁ?
СУЧАСНАСЦЬ І СУЧАСНАЯ ЛІТАРАТУРА

●

Паэзія
Новыя вершы
Рыгора БАРАДУЛІНА

●

ПРОЗА
АПАВЯДАННЕ
Леаніда ГАЎРЫЛКІНА

●

ЧАС ПЕРАМЕН І АДКАЗНАСЦІ
РАЗВАГІ РЭЖЫСЁРА У. КАРАТКЕВІЧА

●

ТАКІ НЯЛЁГКІ «ЛЁГКІ» ЖАНР
«Круглы стол» «ЛіМа»

Валянцін МЫСЛІВЕЦ

ШКОЛА гаспадарання

Нядаўна я сустрэўся са сваім земляком, дырэктарам аднаго са сталічных заводаў. Зразумела, пасля невялікага ўступу, гаворка зайшла пра работу прадпрыемстваў і аб'яднанняў у новых умовах. Гаспадарнік не з апошніх, ён мне шчыра прызнаўся:

— Дацягнуць бы да пенсіі. У нашых умовах разлічваць на поспех эканамічнага эксперыменту — проста фантазія... Добра, што навінка пакуль што абышла наш завод.

Зямляк мяне проста збянтэжыў. Спецыяліст са стажам, вопытны кіраўнік — і раптам кажа такое...

Што ж палохае яго ў эканамічным эксперыменце? Брыгадная праца, як вядома, уздымаецца на новую, больш высокую і больш якасную арбіту. Ідзе комплекснае ўдасканальванне ўсіх службаў вытворчасці з тым, каб гаспадарчы разлік стаў асновай у рабоце кожнай пярвічнай вытворчай ячэйкі. Ставіцца пытанне не толькі аб эканоміі працоўных і матэрыяльных рэсурсаў. Для перадавых прадпрыемстваў гэтага ўжо мала. Вынікі брыгаднай працы тут строга ўвязваюцца з планамі цэха і завода, што павінна забяспечыць выкананне калектывам усіх дагаворных абавязацельстваў.

— Хапілі мы гора з пераходам на брыгадную форму работы завода,— даказваў зямляк. Уводзілі вазаўскую сістэму, ліквідоўвалі вузкія месцы ў нарміраванні, умацоўвалі дысцыпліну і парадак. Не звярталі ўвагі на тое, што некаторыя спецыялісты, нашы лепшыя работнікі, не вытрымлівалі новых патрабаванняў. Пэўны час недахоп рабочай сілы мы кампенсавалі за кошт новай тэхналогіі і тэхнікі. Відавочнымі сталі на нашым заводзе тэмпы росту прадукцыйнасці працы, самыя прагрэсіўныя расходы нормы... І самымі сціплымі—заробкі... Людзі пайшлі ад нас на тыя прадпрыемствы, дзе працавалі па-старому. Па-мойму, эканамічны эксперымент можа толькі ўскладніць вытворчыя сувязі і ўзаемаадносіны.

— Чаму?— пытаюся я, начытаны і наслуханы пра тое, што пры правядзенні эканамічнага эксперыменту асаблівае значэнне надаецца планаванню, стварэнню такіх умоў прадпрыемствам і аб'яднанням, якія б стымулявалі якасную, высокапрадукцыйную працу, ініцыятыву і прадпрымальнасць, забяспечвалі паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу, інтэнсіфікацыі вытворчасці.

Дырэктар не адразу дае мне адказ. Ківае галавою, як бы сам з сабою разважае:

— Лепшыя спецыялісты ад нас пайшлі. Засталося многа баласту, тых, хто своечасова прыходзіў на работу, адбываў свае гадзіны, задавальняўся нізкай зарплатай... Выканаць план па ўсіх дагаворных абавязацельствах на сто працэнтаў у нашых умовах амаль немагчыма. План сто працэнтаў! Ні больш, ні менш! Яшчэ не было такога месяца, каб не падводзілі сумежнікі. А малейшае адступленне ад ста працэнтаў пазбаўляе калектыў тых пераваг, якія прадугледжаны пастановай аб расшырэнні правоў і эканамічнай самастойнасці прадпрыемстваў. Устаноўленыя ж у пяцігадовым плане нарматывы нельга змяніць ці перазацвярджаць.

— І добра!— падхопліваю я. — Бо якія ж раней былі планы і нарматывы прадпрыемствам, калі яны заніжаліся, здаралася, па некалькі разоў у годзе, дзесяткі разоў за пяцігодку? Планы, нібыта, выконваліся, а на самай справе ў сямідзесятыя і ў пачатку васьмідзесятых гадоў у развіцці краіны побач з дасягнутымі бясспрэчнымі поспехамі мелі месца і ўныя неспрыяльныя тэндэнцыі і цяжкасці.

— Гэта так. Але ж ва ўмовах эканамічнага эксперыменту заводы будуць пазбаўлены пэўнага манеўру...

Гаворка тая з земляком пакінула непрыемны асадак на душы. Вопытны інжынер-гаспадарнік, які за пасляваенныя гады перажыў не адну рэформу і бачыў, што яны на пэўным этапе спрыялі поспеху, раптам аказаўся праціўнікам эканамічнага эксперыменту?

На Мінскі электратэхнічны імя В. І. Казлова завод я не спяшаўся. Даведаўся, што ва ўмовах эксперыменту прадпрыемству даецца магчымасць самастойна выкарыстоўваць частку сродкаў адзінага фонду развіцця навукі і тэхнікі для правядзення па сваёй ініцыятыве праектна-канструктарскіх работ і стварэння новай тэхнікі. Расходы на рэканструкцыю пакрываюцца дзяржаўнымі выдаткамі. Сродкі фонду развіцця, якія зберагло прадпрыемства, застаюцца за ім. Застаюцца і дабаўкі за экспартную прадукцыю. Пры стопрацэнтным плане прэміяльны фонд павялічваецца на пятнаццаць працэнтаў. Такога раней не было. Не было дабавак за прафесійнае майстэрства рабочым, майстрам, начальнікам цэхаў, інжынерна-тэхнічным работнікам.

Дырэктара завода Аляксандра Пятровіча Казлова я ведаў даўно, як добрага чалавека і прынцыповага, дзелавога кіраўніка. Амаль трыццаць гадоў ён аддаў Мінскаму трактарнаму заводу. Быў майстрам, старшым майстрам, галоўным інжынерам прадпрыемства, сакратаром парткома. Пры яго ўдзеле будаваліся і былі пушчаны ў дзеянне прэсавы, сталеліцейны, два новыя чыгуналіцейныя цэхі, рэканструяваны галоўны канвеер... Але найбольш радаснымі Аляксандр Пятровіч называе дні, калі завод атрымаў вестку аб прысваенні Дзяржаўных прэмій СССР Байкову, Войцікаву, Грузду, Дронгу, Прыцкеру, Слюнькову, Цімашонку, Шышонку за стварэнне новага сямейства трактароў, якія ведае цяпер увесь свет. Урачыста віншаваў ён Яўгена Іванавіча Клімчанку, Галіну Паўлаўну Мягкову, Розу Кандратаўну Прусаву і Фёдара Конанавіча Самусёва з прысваеннем ім званняў Героя Сацыялістычнай Працы. Гэта былі і яго перамогі.

Шосты год Аляксандр Пятровіч Казлоў працуе дырэктарам Мінскага электратэхнічнага завода. Вясёлы, гаваркі, шчыры і адкрыты.

Аляксандр Пятровіч, нібы ведаючы мае сумненні, гаворыць, што ў пазалеташнім і першых кварталах мінулага года іх прадпрыемства, якое працуе толькі на дагаворных пачатках, выканала на сто працэнтаў план па ўсіх паказчыках, атрымала пятнаццаць працэнтаў надбаўкі з прэміяльнага фонду.

Адлягло ў мяне на душы. Значыць, можна працаваць ва ўмовах эканамічнага эксперыменту!

— Аляксандр Пятровіч, а чаму такая жорсткая стаўка толькі на стопрацэнтны план?— пытаюся я, помнячы, што заўсёсёды заахвочвалася перавыкананне плана.

— Вельмі правільная стаўка для нашага завода. Навошта нам перавыконваць план? Аддай тое, што патрэбна народнай гаспадарцы. А то раней як было? Рабілі і мы звышпланавую прадукцыю калгасам, іншым прадпрыемствам. Яна ж, як правіла, доўга не выкарыстоўвалася, валялася, іржавела, спісвалася. Чаму? Таму, што мы давалі прадукцыю, а іншыя прадпрыемствы такой няпланавай прадукцыі не давалі, каб цалкам укамплектаваць якую-небудзь сістэму... Эканамічны эксперымент,— разгаварыўся дырэктар завода,— мае на ўвазе стабільную работу ўсіх прадпрыемстваў. Зрывы тут не дапускаюцца. Інакш парвецца ланцужок. У нас цяпер, як у альпіністаў...

— А раптам, Аляксандр Пятровіч, «абарвецца» адзін, другі альпініст-пастаўшчык?— пытаюся я.

— У мінулым годзе былі такія, але з рытму наш завод не выбілі. А нашаму прадпрыемству пастаўляюць дэталі і камплекты больш за тысячу заводаў з усіх канцоў краіны. Парушальнікі дагаворных абавязацельстваў караюцца матэрыяльна і маральна. Кіраўнікі самі сябе зжываюць з пасады...

— Кіраўнік сабе месца знойдзе,— кажу я.— А вось як быць у такіх выпадках рабочым?

— Зразумела, сітуацыя можа скласціся не з лёгкіх,— ківае галавою Аляксандр Пятровіч. — Але што нам арыентавацца на дрэнную работу? Я скажу пра свой завод. За апошні год у нас у два разы зменшылася цякучка кадраў. Рэдкімі сталі парушэнні працоўнай дысцыпліны... У мінулым годзе мы не скарысталі ніводнай няпланавай суботы, не займалі ні рабочых, ні інжынераў у выхадныя і святочныя дні. Ні адзін чалавек не працаваў пасля змены. Прадукцыйнасць жа працы вырасла. Сэканомлена, як ніколі раней, больш за тысячу тон пракату, каля мільёна кілаватгадзін электраэнергіі. Паўмільёна рублёў чыстай эканоміі маем ад зніжэння затрат на рубель выпускаемай прадукцыі.

— І як жа вам удалося так падрыхтавацца да работы ў новых умовах?—не хаваю я свайго задавальнення.— Усё ў вас прадугледжана, прадумана...

— На заводзе працуе спецыяльна створаны кансультацыйны пункт па правядзенні эканамічнага эксперыменту. Палітычнай і тэхнічнай падрыхтоўкай кадраў кіруе сакратар партбюро Васіль Мікалаевіч Давыдзенка. У яго матэрыялаў — на раман,— жартуе дырэктар.— А начальнікі цэхаў як працуюць... Брыгадзіры, майстры...

— Значыць, Аляксандр Пятровіч, у вас ніякіх праблем?— пытаюся я, устаўшы з крэсла.

— Чаму ж, ёсць,— выходзіць з-за стала дырэктар.— Нам так скарацілі паліва для транспарту, што задыхаемся. Па-мойму, гэта не мае ніякага дачынення да разумнай эканоміі...

Даведаўшыся, што пазней у сакратара партбюро будзе планавая, штотыднёвая нарада па выкананні эксперыменту, я сышоў на першы паверх, агледзеў сёмы цэх, дзе ўсе былі заняты справай. Згадаўшы, што эксперымент называецца эканамічным, зайшоў да эканаміста цэха Ніны Аляксандраўны Маславай. Маўляў, дапамажыце разабрацца...

— А ўсё ж ясна,— захвалявалася, пачырванела яна.— Пашырыліся правы цэхаў, участкаў, змен, брыгад. Павысілася адказнасць людзей за вынікі працы. Хоць не ўсё яшчэ зроблена. Планы даведзены агульназаводскія ўсім службам. А нам не далі папярэдніх разлікаў для выпрацоўкі тэхніка-эканамічных планаў цэха. Не зроблены разлікі ў норма-гадзінах работы наменклатуры і службы забеспячэння. Колькасць работнікаў у брыгадах цвёрда не вызначана. Справаздачы брыгадзіраў робяцца ўручную, хоць для гэтага на заводзе ёсць машына...

Па дарозе ў партбюро я зрабіў вывад: калі і пры такіх недаробках завод працуе паспяхова, дык на прадпрыемстве маюцца вялікія рэзервы.

Давыдзенка пагадзіўся і расказаў, што эканамічным эксперыментам у іх займаецца спецыяльная камісія з прадстаўнікоў адміністрацыі, партыйнай, прафсаюзнай, камсамольскай арганізацый, вядучых спецыялістаў цэхаў і аддзелаў, перадавых рабочых. У выніку яе работы палепшыліся планаванне, тэхнічнае аснашчэнне вытворчасці, творчая ініцыятыва, павысілася зацікаўленасць калектыву ў росце эфектыўнасці працы, умацаванні гаспадарчага разліку.

— Мы значна павялічылі выпуск высакаякаснай прадукцыі вытворчага прызначэння і тавараў для насельніцтва. Эксперымент ліквідаваў многія паказчыкі, якія ўскладнялі нам жыццё,— працягваў расказваць Васіль Мікалаевіч.— Павысілася адказнасць і выканаўчая дысцыпліна эканамічнай службы...

Партбюро, здавалася, прадугледзела ўсё. Сістэма эксперыменту адладжана, уключана ў дзеянне. Цяпер падтрымлівай яе работу ў патрэбным рэжыме, абагульняй вынікі працы калектыву...

Але — праз колькі хвілін пачалася нарада. І тут устае брыгадзір слесараў-зборшчыкаў Васіль Васільевіч Каваленка:

— Наш дзесяты цэх ставіць задачу павысіць надзейнасць вырабаў. Мы стараемся. Але колькі можна цярпець сумежнікаў, таварышы? Іншыя камплектуючыя вузлы і дэталі даводзіцца капітальна рамантаваць!

— Мы пішам пісьмы на тыя прадпрыемствы,— удакладняе сакратар Давыдзенка,— якія прысылаюць брак.

— А толку з таго, Васіль Мікалаевіч? Брак ідзе паласой. Ніхто на нашы пісьмы не адказвае. Хто і калі з гэтым разбярэцца? А возьмем знешні выгляд нашай прадукцыі, якая адзначана Знакам якасці. Мы часта не дасушваем эмаль, складаем дэталі адна на адну. Яны зліпаюцца, паліроўка абдзіраецца. Накрыўкі і заглушкі звалены ў кучу — пакуль выбераш адтуль дэталь па колеру, зноў псуецца эмаль. А як безгаспадарча абыходзяцца з нашай прадукцыяй заказчыкі! Нядаўна я быў на Калінінскай атамнай. Не пазнаў сваіх блокаў: усё паабдзірана, пагнута... Васіль Мікалаевіч, трэба ставіць пытанне ў міністэрстве.

— Абмяркоўвалі гэтае пытанне, Васіль Васільевіч,— кажа сакратар партбюро. — Відаць, трэба звярнуцца да саміх рабочых.

— Яшчэ скажу пра брыгады, — працягвае Каваленка. —Яны створаны ўсюды, добра сябе зарэкамендавалі. Але ці ўсё мы робім магчымае для лепшай іх работы, яшчэ большай аддачы? Мяркуйце самі. Учора слесар Шырко пяць разоў хадзіў на склад, каб выбраць прыгодны для работы гайкавёрт! Там яго не знайшлі. Выручылі хлопцы з другой брыгады. А часу колькі затрачана марна?.. Або ўцечка сціснутага паветра праз дзіркі ў шлангах. Жывыя грошы ляцяць на вецер...

Спадабаўся мне брыгадзір Васіль Якавенка. Змагаецца за якасць, за эканомію. І дае адчуць, што не ўсё яшчэ адладжана на заводзе для спакойнай, рытмічнай работы ва ўмовах эксперыменту.

У начальніка аддзела працы і заработнай платы Аляксандра Сідаравіча Кібкова адзін клопат: ёсць на рахунку грошы, больш шчодра выкарыстоўвайце іх для ўзнагароджання дастойных, асабліва майстроў і брыгадзіраў, тэхнічных работнікаў...

— Раней мы прадукцыю вымяралі тонамі,— гаворыць начальнік першага цэха Ісак Якаўлевіч Левін.— Новая эканамічная сістэма ўсё мяняе. Але не дае права расслабляцца. Мне не верылася, што ў першым паўгоддзі па пастаўках мы выцягваем на сто працэнтаў. Асабліва цяжка даваліся апошнія працэнты. А чаму? Гатовую прадукцыю цэхі здаюць у апошнія дні месяца. Здараецца, на платформах выпраўляем брак, недаробкі. А я дамагаюся таго, каб прадукцыя паступала штодзённа. Вузкім месцам стаў склад гатовай прадукцыі...

Так, новы склад пабудаваць не проста. А вось здаваць прадукцыю можна рытмічна. Тым больш, што эканамічны эксперымент патрабуе: прадукцыя лічыцца здадзенай, калі яе атрымаў заказчык...

У начальніка бюро новай тэхнікі Леаніда Макаравіча Касцяна свае праблемы. Эксперымент патрабуе ад яго службы асобага напружання. Але не ўсё ўкараняецца ў вытворчасць, што можна скарыстаць з карысцю для завода. Амаль бяздзейнічае ўстаноўка для электраіскравога легіравання штампаў. Эканомія магла б быць на трыццаць тысяч рублёў, на ўчастку вызвалілася б шаснаццаць рабочых, было б сэканомлена шаснаццаць тон пракату чорных металаў...

Далей Леанід Макаравіч называе рэзервы і эканомію на сем мільёнаў рублёў, якія ў бліжэйшы час дадуць новаўвядзенні.

Вось гэта магчымасці эканамічнага эксперыменту!

Слесар дзевятага цэха Уладзімір Міхайлавіч Пупшыновіч выказвае свае радасці і засмучэнні. Працуюць яны добра. Прадукцыйнасць працы ў іх вышэйшая за агульнагарадскую не на адзін працэнт. За кошт яе ў мінулым годзе і сёлета на сто працэнтаў забяспечаны прырост аб'ёмаў вытворчасці. Каэфіцыент рытмічнасці ў брыгадзе — таксама каля ста працэнтаў. На пяць працэнтаў штогод зніжаюцца страты рабочага часу. Цяпер вядзецца ў цэху рэарганізацыя створаных у спецыцы брыгад...

Трывога за брыгады, за іх аддачу гучала ў многіх выступленнях. Так, які ўжо раз за апошнія дзесяцігоддзі ствараліся яны паспешна, без падбору аднадумцаў, блізкіх характарамі і звычаямі людзей. Ствараліся не па закліку родных, сяброўскіх сэрцаў, а загадам начальніка цэха. І распадаліся...

Некалькі дзён пасля нарады ў сакратара партбюро жыў я роздумам пра брыгады. Былы рабочы, які пачынаў сваё працоўнае жыццё ў брыгадзе, душою я разумею, што брыгадная сістэма садзейнічае дысцыпліне і парадку, росту прадукцыйнасці працы, шчыраму сяброўству, узаемнай дапамозе і вучобе, выпраменьвае ўсепераможны дух калектывізму. Доўга пераконваў я сябе і пераканаў на многіх прыкладах, што добраму чалавеку і сапраўднаму спецыялісту няма розніцы, як працаваць: у брыгадзе ці індывідуальна. Але брыгада лепш служыць праяўленню чалавекам сваіх здольнасцей, спрыяе хутчэйшаму росту майстэрства маладых рабочых, самаму справядліваму размеркаванню заробкаў. А праблемы ёсць...

Пайшоў я зноў на завод, у зборачны цэх, дзе працуе лепшы брыгадзір прадпрыемства Васіль Васільевіч Якавенка. Той, што выступаў на нарадзе ў сакратара партбюро, але, здалося, нечага не дагаварыў. Адчувалася ж, што калектыў у яго зладжаны, дружны. Як жа ён падбіраўся?

Дзевяты год працуе Васіль Васільевіч на Мінскім электратэхнічным заводзе. Быў інжынерам, на добрым уліку ў адміністрацыі. І раптам — папрасіўся Якавенка ў брыгадзіры. Начальнік цэха зборкі Мікалай Уладзіміравіч Бутчан як не пачуў яго слоў. Моўчкі выслухаў інжынера і моўчкі пайшоў.

Не адзін дзень пасля таго яны сустракаліся, віталіся і разыходзіліся, думаючы амаль адно і тое ж. Начальнік баяўся, каб не доўгі рубель пацягнуў інжынера ў брыгадзіры. А будучы брыгадзір не адважваўся сказаць, што зусім не грошы яго цікавяць, хоць і яны нешта значаць у жыцці. На пасадзе брыгадзіра ён проста будзе на сваім месцы, больш прынясе карысці цэху, заводу, дзяржаве і сабе самому, сям'і.

І ўсё роўна не спяшаўся начальнік цэха ствараць новую брыгаду, хоць і бачыў, што касцяк яе ўжо ёсць, падабраўся. Бутчан перагаварыў з парторгам Давыдзенкам, дырэктарам Казловым. Разам абмеркавалі, хто зможа працаваць у будучай брыгадзе.

Брыгада Якавенкі нарадзілася. Ядром яе сталі вопытныя спецыялісты Іван Лукіч Васілінчык, Аляксандр Уладзіміравіч Плішкін, Віктар Уладзіміравіч Ігнаценка, Аляксандр Васільевіч Максімук...

— Па душы падабралі сабе хлопцаў?— пытаюся ў брыгадзіра, упэўнены ў тым, што склалася брыгада сапраўдных аднадумцаў.

— На заводзе, у брыгадзе не гэта галоўнае, — смяецца Васіль Васільевіч, здзіўляючы мяне сваім адказам. — Галоўнае ў нас — дзелавыя якасці спецыяліста, яго сумленныя адносіны да працы, да выканання сваіх абавязкаў, да сяброў-таварышаў. А што характары ў людзей розныя, дык гэта і добра. Весялей так жыць. Мы можам і пажартаваць, і пазлавацца, і паспрачацца, і нават адзін аднаму пад гарачую руку сказаць не вельмі прыемныя словы. Гэта жыццё... А працуем мы па прынцыпе сацыялізму: што зарабіў, тое і атрымлівай. Заробкі дзеліць сама брыгада. Выбіраецца савет, які і вызначае каэфіцыент працоўнага ўдзелу. Улічваецца разрад, майстэрства, актыўнасць. У нас усё на вачах. Ні майстар, ні начальнік цэха, ні дырэктар нас не паправяць. А то раней хадзіў нарміроўшчык з секундамерам, падлічваў... Людзі вельмі востра адчуваюць справядлівасць, праўду, хочуць жыць сумленна...

— А як адчувае сябе пры гэтым брыгадзір?

— Цудоўна! — ускліквае Васіль Васільевіч. — Мая пасада выбарная. Маю работу ацэньвае савет брыгады. Выносіць свае прапановы на калектыў. Тры разы ўжо мяне выбіралі і зацвярджалі зноў!

Яшчэ адно адкрыццё зрабіў для мяне брыгадзір Васіль Якавенка. Эканамічны эксперымент нябачнымі ніткамі прывязвае да вытворчасці сям'ю работніка. Брыгада да пачатку работы мае заданне і фонд зарплаты. Жонка і дзеці за месяц, за два да зарплаты ведаюць, колькі атрымае муж і бацька, калі добра будзе працаваць...

— Першачарговае вызначэнне задання і фонду зарплаты,— сцвярджае брыгадзір Якавенка,— абавязвае працаваць з поўнай аддачай, з выдумкай і вынаходніцтвам. Яно выключае ўсякія спрэчкі з майстрамі, нарміроўшчыкамі, начальнікамі цэхаў. Эканамічны эксперымент укараняе свабодную, творчую, арганізаваную працу, выключае штурмаўшчыну...

— І ўсё ж— а што ён патрабуе ад рабочага ў брыгадзе? — пытаюся я.

—Пастаяннага ўдасканальвання майстэрства, пастаяннай вучобы. Кожны ў брыгадзе зацікаўлены мець больш высокі разрад. Атрымлівае работнік у брыгадзе па трэцім разрадзе, напрыклад, дзвесце рублёў. Павысіў ён разрад — па чацвёртым разрадзе заробкі павышаюцца на шаснаццаць працэнтаў. Простая арыфметыка. Па пятым разрадзе заробкі падскокваюць яшчэ на дваццаць чатыры працэнты! Але ў брыгадзе можа павысіць разрад толькі той, хто набывае прафесіяналізм і вялікі кругагляд. Механічнае павышэнне разраду выключаецца.

Развітваюся я з брыгадзірам Васілём Васільевічам Якавенкам і выходжу з цэха, за прахадную завода. Любуюся новым вышынным будынкам заводакіраўніцтва, які так удала ўпісаўся ў пейзаж горада, і думаю: а як упішацца вопыт работы Мінскага электратэхнічнага завода імя В. І. Казлова ў рабочы рытм горада, рэспублікі, краіны? Вопыт значны, важны, набыты вучобай і ўдарнай працай. Вопыт, які не выключае ўдасканалення, дапаўненняў, але ўжо і на гэтай стадыі дастойны пераймання, шырокага ўкаранення ў вытворчасць.

ПОСТУП ТЫДНЯ

НАСУСТРАЧ З'ЕЗДУ

У Мінскім Доме афіцэраў пачаўся цыкл вечароў, прысвечаных XXVII з'езду КПСС. «Прысягаем партыі на вернасць» — так называўся першы вечар з гэтага цыкла, які адбыўся ў тэатральнай зале Дома афіцэраў горада-героя Мінска.

Прамоўцы — член Саюза пісьменнікаў БССР генерал-маёр Анатоль Сульянаў, ветэран партыі, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, генерал-маёр у адстаўцы Іван Дуднік, Герой Савецкага Саюза палкоўнік запасу Аляксандр Бярданаў і іншыя—гаварылі пра адданасць савецкіх воінаў партыі і народу, іх вернасці воінскай прысязе, а таксама выказалі вялікую ўдзячнасць КПСС за клопат аб савецкіх воінах.

Цікава вялі вечар заслужаная артыстка БССР Зінаіда Бандарэнка і афіцэр Мікалай Шаўчэнка.

У вялікай канцэртнай праграме выступілі ансамбль песні і танца і аркестр штаба БВА, народны ансамбль ветэранаў вайны і арміі Мінскага Дома афіцэраў, народны харэаграфічны ансамбль «Чараўніцы» і іншыя калектывы.

З вялікай цікавасцю ўдзельнікі вечара пазнаёміліся з выстаўкай кніг «Свяшчэнны доўг, ганаровы абавязак».

П. ГАРДЗІЕНКА.

ЧАРГОВЫ ВЫПУСК «СУЧАСНІКА»

Чарговы выпуск штогодніка знаёміць чытача з разнастайнымі матэрыяламі, прысвечанымі шматграннаму жыццю нашых сучаснікаў. Першы раздзел «40 год Вялікай Перамогі» вяртае да незабыўных часоў барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Друкуюцца нарысы К. Грушавай «Загадка рукапіснага сшытка» з каментарыем укладальніка зборніка В. Супрунчука, «Удовін двор» М. Вайцяшонак, франтавыя запісы «Салдацкая мужнасць» П. Прыходзькі.

З дырэктарам Беларускага навукова-даследчага інстытута меліярацыі і воднай гаспадаркі У. Карлоўскім гутарыць М. Замскі — «Меліярацыя: учора, сёння, заўтра».

У раздзеле «Вёска... надзённае» — нарысы «Чалавек на зямлі» Л. Левановіча і «Наталенне смагі» У. Глушакова.

Розныя аспекты жыцця сучаснага горада закранаюць матэрыялы В. Жука «Намалюем — будзем жыць?!», І. Канановіча «Рабочая дынастыя», Б. Шарашэўскай «Галасы нашага горада», прадстаўленыя ў раздзеле «Гарадскія вітражы».

«Школьны бал» — публіцыстычны роздум С. Курылёвай.

«Слова пра бацьку» напісала Н. Машэрава. «Проста ўспомніў я цябе...» — эсэ В. Карамазава пра А. Пысіна. Наведаць знакамітыя мясціны запрашае К. Цвірка — «Туганавічы».

А. Марціновіч рэцэнзуе кнігу С. Паўлава «Імперская паранойя», В. Супрунчук падрыхтаваў падборку матэрыялаў «Правда» і «Звязда» паведамлялі...».

Г. ЛЯВОЦКІ.

НА ДНЯХ САВЕЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў ЧЭХАСЛАВАКІІ

У Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспубліцы прайшлі Дні савецкай культуры, у якіх прыняла ўдзел дэлегацыя вядомых савецкіх пісьменнікаў на чале з Ю. Верчанкам. У дэлегацыю ўваходзіў першы сакратар праўлення СП БССР Н. Гілевіч.

Госці прынялі ўдзел у пасяджэнні «круглага стала» «Творчасць маладых і фарміраванне сацыялістычнай свядомасці маладога пакалення», гутарылі з партыйнымі работнікамі, наведалі выдавецтва «Альбатрос».

ЧАС НАЗЫВАЕ ТЭМЫ

Тэматычная кампазіцыя ў сучасным беларускім выяўленчым мастацтве і роля мастацкай крытыкі ў яе развіцці — тэма размовы, якая адбылася на пленуме праўлення Саюза мастакоў БССР. Яго ўдзельнікі гаварылі пра ўзрастаючую ролю мастацтва ў жыцці грамадства, пра мацнеючыя сувязі мастакоў з народам. Нямала ўвагі надавалі выступаўшыя праблемам удасканалення прафесійнага майстэрства.

У прынятай рэзалюцыі адзначаецца, што работа па ідэйна-мастацкім выхаванні працоўных па-ранейшаму застаецца важнейшай задачай майстроў пэндзля і разца. Падкрэсліваецца таксама асаблівая роля крытыкі ў развіцці лепшых традыцый і прынцыпаў сацыялістычнага рэалізму.

Пленум разгледзеў пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай да выстаўкі «Мы будуем камунізм», прымеркаванай да XXVII з'езда КПСС і XXX з'езда Кампартыі Беларусі.

БЕЛТА.

НАКАНАВАНА НЕЎМІРУЧАСЦЬ

Савет па літаратурных музеях, помніках гісторыі і культуры і літаратурнай спадчыне Маскоўскага аддзялення Саюза пісьменнікаў РСФСР правёў у малой зале Цэнтральнага Дома літаратараў у Маскве вечар, прысвечаны 800-годдзю «Слова пра паход Ігаравы». Вядомыя пісьменнікі і даследчыкі літаратуры ў сваіх выступленнях адзначалі значнасць гэтага літаратурнага помніка ў сусветнай культуры.

Сярод тых, хто выступіў на вечары, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Рыгор Барадулін, дзякуючы якому нядаўна «Слова...» у чарговы раз загучала па-беларуску.

З. СОМАУ.

●

Акадэмія навук СССР, Саюз пісьменнікаў СССР, Усесаюзнае таварыства «Веды» правялі канферэнцыю, прысвечаную 800-годдзю «Слова пра паход Ігаравы», на якой выступілі вядомыя савецкія і замежныя вучоныя.

Прысутныя пазнаёміліся таксама з дакладамі віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук БССР, акадэміка І. Навуменкі і доктара філалагічных навук А. Лойкі.

В. ЦЯРЭШКА.

ВЕЧАРЫ, СУСТРЭЧЫ

СПРАВАЗДАЧА ПАЭТЭСЫ

Тыдзень назад, 27 снежня мінулага года, вялікая зала Дома літаратара сабрала з усяго горада аматараў і прыхільнікаў паэтычнага слова. Але прыйшлі сюды не проста тыя, што любяць паэзію наогул,—прыйшлі прыхільнікі паэтычнага слова Таісы Бондар: тут адбыўся яе творчы вечар.

Уступным словам яго адкрыў лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Аляксей Дудараў. Потым увагай прысутных амаль на дзве гадзіны завалодала паэтэса. Яна расказвала пра сябе, пра свой творчы шлях, пра свае пісьменніцкія (і не толькі пісьменніцкія, бо яна не толькі паэт-і празаік, а яшчэ і намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Беларусь») клопаты і інтарэсы, пра свае бліжэйшыя і далейшыя творчыя планы, адказвала на шматлікія пытанні тых, што сабраліся ў зале, а, галоўным чынам, чытала свае вершы—даўнія і новыя.

На вечары выступілі таксама паэт Мікола Мятліцкі і кампазітар Людміла Шлег.

Г. МАКСІМОВІЧ.

Таіса Бондар адказвае на пытанні прысутных.

Фота Ул. КРУКА.

З УЗНАГАРОДАЙ!

За заслугі ў развіцці беларускай савецкай літаратуры і актыўную грамадскую работу Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР прысвоіў пісьменніку **СКРЫГАНУ** Івану Аляксеевічу (Яну СКРЫГАНУ) ганаровае званне заслужанага работніка культуры БССР.

●

За заслугі ў развіцці харэаграфічнага мастацтва і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларускай ССР узнагародзіў мастацкага кіраўніка Беларускага дзяржаўнага харэаграфічнага вучылішча народную артыстку Беларускай ССР **МАЛЫШАВУ** Клару Мікалаеўну Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

●

За заслугі ў развіцці і ўдасканаленні тэлебачання, вялікі ўклад у камуністычнае выхаванне працоўных рэспублікі Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларускай ССР прысвоіў ганаровыя званні: народнага артыста Беларускай ССР — дыктару **БАНДАРЭНКА** Зінаідзе Аляксандраўне; заслужанага работніка культуры Беларускай ССР — галоўнаму рэдактару сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі **КЛЕБАНОВІЧУ** Міхаілу Іванавічу, галоўнаму рэдактару галоўнай рэдакцыі народнай гаспадаркі **ХАДАРЫНУ** Аляксею Рыгоравічу.

●

За заслугі ў развіцці беларускай савецкай літаратуры, актыўную грамадскую дзейнасць і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларускай ССР узнагародзіў пісьменніка **КУДРАЎЦА** Анатоля Паўлавіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

ПАДЗЕІ І ДАТЫ

КРЫНІЦА ВЕДАЎ, НАТХНЕННЯ, ПАЭЗІІ

Але, брацці, не сокалаў дзесяць
Выпушчаў ў свет Баян з пералесіц
На лябяжае стада, бы ў байцы, —
А ён клаў свае вешчыя пальцы
На пявучыя струны, а тыя
Пелі славу князям, як жывыя...

Што гэта? Адкуль гэта? Чаму, учуўшы гэтыя словы, раптам скаланецца душа, затрымціць, захвалюецца, памкнецца кудысьці ўвысь, напоўніцца чымсьці святым, і чыстым, і ўзнёслым?

Дык пачнем жа мы, брацці, сказ гэты
Ад старога Уладзіміра летаў
Да сучаснага Ігара-воя,
Што скуў розум свой сілаю ўдвое,
Навастрыў сваё сэрца адвагай,
Барацьбянай напоўніў дух смагай
І павёў цераз сёлы і вёскі
Свае дужыя, храбрыя войскі
На зямлю палаўчан, на змаганне
Да за Рускай зямлі бытаванне!..

Чым бяруць у палон гэтыя (пераказаныя «сягачасным ладам» вялікім Янкам Купалам) радкі? У чым таямнічая і чароўная ўлада іх? Што за дзівосная сіла змушае трымцець душу?

800 гадоў назад невядомы, але геніяльны паэт занатаваў на адбеленым пергаменце сваю песню-быліну пра няўдалы паход князя Ігара на полаўцаў. Пішучы яе, выспеўваючы радок за радком, не думаў ён, вядома ж, пра тое, што песня яго не памрэ, не згубіцца ў смузе часу, што, спазнаўшы доўгае забыццё, яна праз стагоддзі адшукаецца, агукнецца, вернецца да далёкіх яго нашчадкаў і здабудзе неўміручасць. Тым больш не думаў ён пра тое, што прыйдзе яна да нашчадкаў не проста старадаўняй песняй, не проста фактам ці з'явай старажытнарускай літаратуры, а найвышэйшым узорам паэзіі, неўміручым помнікам мастацкай творчасці ўсходніх славян, падмуркам, пачаткам пачаткаў літаратур трох братніх народаў — рускага, беларускага, украінскага.

«Слова аб палку Ігаравым»... Яго слаўнае васьмісотгоддзе па рашэнні XXII канферэнцыі ЮНЕСКО адзначыў летась увесь свет. Самыя ж вялікія ўрачыстасці адбыліся, натуральна, у нашай краіне. Паўсюль прайшлі кніжныя і мастацкія выстаўкі, прысвечаныя «Слову», навуковыя і чытацкія канферэнцыі, шматлікія літаратурныя вечары і сустрэчы, у тым ліку і ў Беларусі.

Твор гэты жыве сёння актыўным і напоўненым жыццём. За час, які мінуўся з дня яго другога нараджэння ў пачатку XIX стагоддзя, толькі адных кніг пра яго выйшла ў свет больш чым тысяча, а даследаванняў і рознага плана публікацый — некалькі тысяч. Чаму? Чым вытлумачыць такую велізарную зацікаўленасць «Словам» навуковай (і не толькі навуковай) грамадскасці? Таму што яно дае нам важкія, хвалюючыя ўрокі патрыятычнага, гістарычнага, эстэтычнага зместу.

«Слова» вучыць нас любіць Радзіму, даражыць ёю. Нам блізкі і зразумелы той пафас, тое пачуццё, якое калісьці прымусіла ўзяцца за пяро яго невядомага аўтара, — пачуццё, што асуджае сваркі і заклікае жыць у згодзе і еднасці. Мы, нашчадкі аўтара «Слова» канца XX трывожнага стагоддзя, пашыраем гэты заклік да згоды і паразумеласці на ўсіх людзей планеты.

«Слова» — гэта невычэрпная крыніца гістарычных ведаў аб даўнім часе, шматлікіх дакладных звестак, якія дапамагаюць нам яскравей уявіць клопаты, турботы, побыт нашых далёкіх продкаў, іх помыслы і памкненні, адзенне і ўзбраенне, прылады працы і ратнай службы, а таксама многае іншае.

Урэшце, «Слова» — найвялікшы, непераўзыдзены ўзор паэтычнага майстэрства. Паэзія, і прытым самая высокая, тут ва ўсім: у вобразным ладзе, у надзвычай тонкім адчуванні слова і фразы, у дакладнасці інтанацый, у глыбокім псіхалагізме пісьма, у музыцы, якою прасякнуты твор ад пачатку да канца. «Слова» і сёння, праз восемсот гадоў пасля стварэння, дае паэтам павучальныя ўрокі майстэрства, і кожнае новае пакаленне паэтаў, далучаючыся да гэтай скарбніцы паэзіі, зведвае шчаслівае і ўдзячнае пачуццё, а разам з тым і пачуццё адказнасці: працаваць у літаратуры, у якой было «Слова», — сапраўды шчасна і сапраўды адказна.

Пра значнасць «Слова» ў гісторыі літаратуры расказвае В. Чамярыцкі. Фота Ул. КРУКА.

Пра ўсё гэта ішла гаворка на вечары, прысвечаным юбілею «Слова аб палку Ігаравым», што адбыўся на мінулым тыдні, на сконе года, у Доме літаратара. Пра гэта гаварыў, адкрываючы і ведучы вечар, першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Н. Гілевіч.

Аб ролі і значэнні «Слова» ў развіцці агульнаславянскай культуры, яго мастацкім ладзе, аб яго неўміручасці менавіта як паэтычнага твора, чым яно найперш хвалюе і сённяшняга чытача, аб яго блізкасці да фальклорных традыцый, аб старонках твора, звязаных з тагачаснымі «беларускімі» гарадамі і землямі, гаварыў вядомы наш гісторык літаратуры, кандыдат філалагічных навук В. Чамярыцкі.

Перакладам «Слова» на мовы свету, найперш на сучасныя славянскія мовы, гісторыі гэтых перакладаў і іх выданняў прысвяціў сваё выступленне вядомы мовазнавец, доктар філалагічных навук М. Булахаў.

Кандыдат філалагічных навук В. Дарашкевіч падзяліўся з прысутнымі назіраннямі над мовай «Слова», спрабаваў даць вытлумачэнне некаторых яго так званых «цьмяных мясцін». Ён жа прачытаў некалькі старонак «Слова» ў сваім перакладзе на беларускую мову.

Аб сваім, мастакоўскім, прачытанні неўміручага твора гаварыў на вечары лаўрэат прэміі імя Дж. Нэру, заслужаны дзеяч мастацтваў рэспублікі Г. Паплаўскі (летась у выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшла сувенірнае выданне «Слова» ў перакладзе Янкі Купалы з ілюстрацыямі мастака).

А пасля эстафету прынялі акцёры тэатра імя Янкі Купалы і тэатра оперы і балета. У іх выкананні прагучалі раздзелы «Слова» ў перакладах Янкі Купалы і Р. Барадуліна, а таксама арыі і сцэны з оперы «Князь Ігар».

М. КАВАЛІЦКІ.

КІНО

ЭКРАН — ЛЮСТЭРКА ТВОРЧАСЦІ

З X пленума праўлення Саюза кінематаграфістаў БССР

РАЗМОВА пра выяўленчую культуру прадукцыі «Беларусьфільма» адбылася ў Доме кіно напярэдадні новага года. Яе ўдзельнікі абмяркоўвалі прафесійныя, вытворчыя пытанні, што ўзнікаюць у сённяшняй практыцы мастакоў-пастаноўшчыкаў і кінааператараў.

«Тэндэнцыі развіцця выяўленчага ўвасаблення ў беларускім кіно на сучасным этапе» — чаму менавіта гэтую тэму абралі кінематаграфісты для свайго чарговага пленума? Відаць, таму, што партыйныя рашэнні і дакументы 1985 года, падрыхтоўка ўсяго савецкага грамадства да XXVII з'езда КПСС абавязваюць творчую інтэлігенцыю прынцыпова падсумаваць вынікі сваёй працы за пэўны перыяд. А вынікі працы кінематаграфістаў адлюстроўвае, у літаральным сэнсе, экран. Так, фільм — гэта «рухомыя карцінкі», відовішча. І яго выяўленчая культура, бадай, адзінае ідэйна-сэнсавае звяно, якое далучае задуму стваральнікаў фільма да думкі гледача.

На выяўленчую культуру фільма так ці інакш уплывае работа ўсіх удзельнікаў здымачнай групы. Зрокавае ўвасабленне задумана залежыць ад рэжысёра-пастаноўшчыка, аператара, мастака-пастаноўшчыка, мастака па касцюмах, мастака-грымёра. Пра гэта гаварылася ў дакладзе старшыні секцыі выяўленчага вырашэння фільмаў СК БССР, заслужанага дзеяча мастацтваў рэспублікі рэжысёра-аператара **Ю. Марухіна.** Ён падкрэсліў, наколькі важна стваральнікам карціны ведаць творчыя намеры адно аднаго, імкнуцца да сумяшчэння сваіх эстэтычных пазіцый у працы, да ўзаемаразумення. Інакш, як вядома, складваецца сітуацыя накшталт крылоўскай байкі пра Лебедзя, Рака і Шчупака...

На беларускай студыі з'яўляюцца фільмы, якія дакладчык назваў сапраўдным плёнам калектыўнай творчасці. Адзінства памкненняў усёй групы і разам з гэтым адметнасць індывідуальных прафесійных почыркаў адчуваюцца, прынамсі, у карцінах «Людзі на балоце», «Дзікае паляванне караля Стаха», «Бацькі і дзеці», «Судны дзень», «Рыжы, сумленны, закаханы...» і інш. Ёсць жа і такія, дзе без цітраў не разбярэшся, хто фільм паставіў, хто здымаў. Прычым, у цітрах безаблічнай стужкі надараецца ўбачыць, напрыклад, прозвішча аператара-майстра, вядомага па рабоце з іншымі рэжысёрамі. Чаму адбываюцца такія метамарфозы? Ці не дазваляе сабе таленавіты чалавек ленавацца? Ці не дапускае абыякавасць у адносінах да справы? Калі ён пагаджаецца ўдзельнічаць у здымках, значыць, падзяляе думкі аўтара сцэнарыя, намер рэжысёра. Значыць, павінен узяць на сябе і прафесійную адказнасць за выяўленчае вырашэнне фільма, не здымаць «як скажуць», «абы знята было».

АДКАЗНАСЦЬ за выяўленчае ўвасабленне сцэнарнай ідэі — крэда вядучых мастакоў «Беларусьфільма» Я. Ганкіна, Я. Ігнацьева, У. Дзяменцьева, В. Кубарава, зазначыў Ю. Марухін. Без пошуку, без рызыкі, без натхнення аператара-пастаноўшчыка таксама не можа быць непаўторнай карціны. А каб тэмперамент чалавека з кінакамерай адчулі гледачы, чалавек той павінен валодаць прафесіяй. Гэта значыць, дасканала ведаць кінаплёнку, не пачынаць здымкі, не праверыўшы яе якасці, кантраляваць яе хімічную апрацоўку. Гэта значыць, пастаянна трэніраваць сябе, каб свабодна і ўмела карыстацца ручной кінакамерай. (Дакладчык прызнаўся, што сам ён, год не здымаўшы, узяў камеру ў рукі і адчуў, як тая быццам «чужою» стала). Гэта значыць, загадзя рыхтавацца да першага дубля, прысутнічаць на рэпетыцыях, каб затым у працэсе здымак прапанаваць варыянты найбольш выйгрышнай для акцёра і адпаведнай псіхалагічнаму стану яго героя кампазіцыі кадра, оптыку і да т. п.

Зрэшты, патрабавальнасць да сябе — абавязковая адзнака творчай асобы. А патрабавальнасць да паплечнікаў? Калі рэжысёр не патрабуе выяўленчай культуры кадра, калі яго загадзя задавальняе ўсё, што зробяць мастак, грымёр, аператар, — ён кепскі рэжысёр.

«КІНО — справа калектыўная». Колькі разоў паўторана гэтая сакраментальная фраза з трыбуны розных кінематаграфічных форумаў. І ўсё ж гучыць яна заўсёды слушна. Сапраўды, нельга, напрыклад, адасобіць задачы, памкненні, нягоды, нават, аператараў і мастакоў кіно. І адны і другія маюць справу непасрэдна з вытворчасцю, з матэрыяльна-тэхнічнай базай будучага фільма. Адны і другія маюць справу і... са сцэнарным матэрыялам.

У сцэнарыях, як заўважыў заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, мастак-пастаноўшчык **Я. Ігнацьеў,** часам ёсць толькі «фанерная схема» падзей і персанажаў, без канкрэтнага азначэння побыту, асяроддзя, часу дзеяння. Усе належныя дэталі шукае мастак, прапануе эскізы, якія амалв заўсёды безагаворачна ўхваляюцца. Аднак на экране вынік ягонага пошуку мяняецца, бывае, да непазнавальнасці. Чаму? Вінаваты найперш сам мастак. Калі ён сумленна ставіцца да таго, што намаляваў у эскізах, павінен сумленна і настойліва дамагчыся выканання ў дэкарацыях. Павінен прысутнічаць на здымачнай пляцоўцы і кантраляваць увасабленне сваёй задумы. Бо рэжысёр амаль заўсёды заняты ўдасканаленнем сцэнарнага матэрыялу, перапрацоўкай тэксту роляў, і яму ўжо няма калі клапаціцца пра выяўленчыя нюансы сваёй работы.

У выступленні Я. Ігнацьева прагучала трывога: неяк заспакоена і раўнадушна жыве сёння студыя. Здаецца, узнікла тэндэнцыя запускаць у вытворчасць дрэнны сцэнарый і ўсімі агульнымі намаганнямі потым штосьці з яго «выцягваць». Роўна і «пісьменна» і як быццам без выдумкі працуюць маладыя калегі — і хоць бы хто з іх, робячы дэкарацыю, «памыліўся на карысць мастацтва»! Калі яшчэ і аператар здыме «звычайна», выяўленчыя выдаткі адаб'юцца на экране.

Некалі рэжысёр, аператар, мастак, працуючы над будучым фільмам, разам наведваліся ў бібліятэку. Цяпер нярэдкія выпадкі, калі рэжысёр і аператар не прыходзяць у майстэрню мастака паглядзець эскізы. Бывае, не знаходзяць пастаноўшчыкі і агульнай мовы, канфліктуюць між сабой.

Кінематаграфісты — баявыя памочнікі партыі ў фарміраванні асобы новага чалавека, гаварыў Я. Ігнацьеў. Для іх працы неабходны спрыяльныя ўмовы, і не толькі матэрыяльна-тэхнічныя. Трэба больш пільна ставіцца да рэжысёра як да творчай асобы, «фігуры нумар адзін» у кінапрацэсе. Яркім урокам грамадзянскасці і прафесіяналізму была для беларускіх кінематаграфістаў работа ў нас групы на чале з рэжысёрам Э. Клімавым («Ідзі і глядзі»). Іншая справа, калі «Беларусьфільм» прымае авантурыстаў ад рэжысуры, якія наязджаюць з Масквы ў Мінск... падзарабіць. Нельга дапускаць на студыі такога «рэжысёрскага браканьерства».

НА ТВОРЧЫ ПОШУК беларускіх кінадакументалістаў у выяўленчай культуры стужак звярнуў увагу аператар аб'яднання «Летапіс» **А. Алай.** Ён расказаў пра плённую працу В. Дашука, Ю. Лысятава, У. Цеслюка, А. Карпава-малодшага, Ю. Плюшчава, С. Пятроўскага, М. Сідорчанкі, С. Лук'янчыкава, Ф. Кучара, іншых рэжысёраў і аператараў у дакументальным кіно. Тут, зазначыў прамоўца, прыгожы і каштоўны такі кадр, у якім — праўда жыцця, у якім гледача не захапляюць «аператарскія штучкі». Вялікае значэнне набываюць сінхронныя здымкі. Але якасць іх далёка не заўсёды задавальняючая.

Сінхрон — прэрагатыва рэжысёра, які павінен знайсці непасрэдны кантакт з чалавекам, захапіць яго, «разгаварыць», дапамагчы раскрыцца перад камерай. Нярэдка ж рэжысёр аддае гэты вельмі адказны ўчастак работы ва ўладу аператара і гукааператара. Бывае ж, рэжысёр-дакументаліст захапляецца так званай пастановачнасцю кадра.

УДЗЕЛЬНІКАЎ пленума — рэжысёраў, аператараў, мастакоў, крытыкаў, мінчан і гасцей з Масквы — цікавілі надзённыя праблемы творчых работнікаў саюза, кінастудыі. Гаворка вялася пра мастакоўскую сумленнасць, патрабавальнасць да сябе, да калег, пра адказнасць перад гледачом. Пра вытворчую дысцыпліну. Пра выхаванне кадраў, праблему іх занятасці ў кінапрацэсе, іх творчага росту.

Па пытаннях, абмеркаваных на пленуме, прынята разгорнутая рэзалюцыя.

Наш кар.

Павел ДЗЮБАЙЛА

Быт ці быццё?

РОЗДУМ НАД БЕЛАРУСКАЙ АПОВЕСЦЮ АПОШНІХ ГОД

Сёння мы працягваем распачатую Таісай Грамадчанка гаворку на тэму «Сучаснасць і сучасная літаратура».

Нагадаем, што пад гэтай рубрыкай у «ЛіМе» летась былі змешчаны артыкулы і нататкі Міхася Кенькі (14 чэрвеня), Галіны Тычко (28 чэрвеня), Аляксея Рагулі (26 ліпеня і 2 жніўня, Ігара Жука (30 жніўня), Аляксандра Станюты (20 верасня), Уладзіміра Навумовіча (4 кастрычніка), Аляксея Пяткевіча (11 кастрычніка), Алеся Асташонка (25 кастрычніка), Пятра Васючэнкі (15 лістапада), Антанаса Дрылінгі і Анатоля Вярцінскага (29 лістапада).

У БЕЛАРУСКУЮ прозу ў апошнія гады прыйшлі людзі, якія не толькі добра ведаюць вёску, але і вытворчасць, горад. Змяншаецца небяспека другаснасці матэрыялу. І ўсё ж нават добрае веданне жыццёвага матэрыялу —не панацэя ад мастацкіх пралікаў і няўдач. Талент, грамадзянская сталасць пісьменніцкай пазіцыі, глыбокая зацікаўленасць праблемамі сучаснасці, тым, аб чым пішаш, «перажытасць» матэрыялу, карпатлівая праца над словам — вось што ў рэшце рэшт забяспечвае поспех.

Толькі ў такім выпадку творы будуць «служыць інтарэсам народа, справе камунізму, крыніцай радасці і натхнення для мільёнаў людзей, выражаць іх волю, пачуцці і думкі, актыўна дапамагаць іх ідэйнаму ўзбагачэнню і маральнаму выхаванню» (праект новай рэдакцыі Праграмы КПСС).

Вельмі важна, каб аб чым бы ні апавядалася ў творах, на першым плане заставаліся характар, душа чалавека, яго маральныя пошукі, пошукі духоўных каштоўнасцей, што, як правіла, выяўляюцца ў арганічнай, цеснай сувязі з часам, працоўным калектывам, урэшце, з народнай мараллю, яе каранямі.

Патрабавальнае стаўленне да сябе і іншых, маральны максімалізм характэрны для многіх герояў лепшых твораў апошняга часу, такіх, як «Алімпіяда» І. Пташнікава, «Паляванне на апошняга жураўля» А. Жука, «Сачыненне на вольную тэму» А. Кудраўца, «Неруш» В. Казько і інш. І гэта выяўляецца як у працы, так і ў асабістым жыцці герояў.

Галоўныя героі названых твораў трывала звязаны з народным светаразуменнем, народнымі звычаямі, мараллю, этыкай. Аднак гэта людзі сталага, часцей пенсійнага ўзросту.

Можа нават скласціся ўражанне, што пісьменнікі, зыходзячы па сутнасці з адной канцэпцыі народнага характару, паказваюць адзін і той жа тып, толькі вар'іруюць жыццёвыя калізіі, абставіны, што ёсць пагроза выпрацоўкі пэўнага стэрэатыпу, звужэння шматстайнасці жыццёвых характараў, пэўнай ідэалізацыі патрыярхальных асноў народнага жыцця.

Аднак гэта не зусім так.

Адзначаныя вышэй тэндэнцыі, магчыма, не так выразна, але выяўляюцца ва ўсёй савецкай літаратуры. С. Чупрынін у «Литературной газете» ў дыскусійным артыкуле «Як справы, малады чалавек?» ставіць пытанне: «Звярнуўшыся ў думках да герояў і гераінь нашай прозы апошніх двух дзесяцігоддзяў, каго мы сустрэнем у першую чаргу?» І адказвае: «Гэта, вядома, старыя жанчыны і мужчыны, якія робяць падрахункі ўжо не папярэдняга выніку свайго вельмі цяжкага жыцця...» І далей: «Я пагаджуся, калі скажуць, што, звярнуўшыся пераважна да даследавання вопыту старэйшых пакаленняў, літаратура, мастацтва да пэўнай ступені папоўнілі мінулы недахоп маральна-псіхалагічнай, мастацкай увагі да іх. Выдатна, што ў грамадскай свядомасці з'явіўся ўстойлівы, блізкі да шанавання інтарэс да «вытокаў», «каранёў» і традыцый...

Тут няма аб чым спрачацца. Але, па-першае, адзначаная тэндэнцыя, якая выклікала некалькі першакласных, сапраўды наватарскіх твораў, спарадзіла, як гэта звычайна здараецца, ці то інерцыю, ці то літаратурную моду. Распуцінская Ганна была адкрыццём, але... Запрацавалі пер'і, застракталі пішучыя машынкі, загудзелі лінатыпы, і цяпер ужо рэдкая кніга аб сённяшняй вёсцы абыходзіцца без абавязковай старой, якая ўвасабляе ў сабе церпялівую сялянскую мудрасць».

І ўсё ж у лепшых творах прозы выразна адчуваецца, што маральныя пошукі сталі больш арганічна звязвацца з надзённымі актуальнымі праблемамі народнага жыцця. Усё больш моцна выяўляецца імператыў сумлення, прага хлеба духоўнага. Разам з тым літаратура з трывогай паказвае, што адбываецца з чалавекам, калі яго бярэ ў палон утылітарна-спажывецкі клопат.

Так, проза пра вёску прайшла пэўны этап свайго развіцця. Але, думаецца, сёння адбываецца не завяршэнне ў распрацоўцы вясковай тэмы, а пошукі новых падыходаў, назапашванне новых рэсурсаў. Аднак, не пагаджаючыся са сцвярджэннем некаторых крытыкаў аб «вычарпанасці» прозы пра вёску, даводзіцца прызнаць, што яна знаходзіцца ў стане пэўнай «замінкі», будзем спадзявацца, перад новым этапам свайго развіцця.

Справядліва піша аб «замінцы» ў развіцці «вясковай» прозы ў «ЛіМе» М. Стральцоў: «У ёй у свой час былі прынцыповыя дасягненні, пазначаныя імёнамі... І. Пташнікава, І. Чыгрынава, Б. Сачанкі, А. Кудраўца, А. Жука, Я. Сіпакова, В. Казько — аўтараў, якія працуюць сёння часцей у іншых тэматычных сферах і іншых жанрах. «Вакуум» у так званай вясковай прозе запаўняецца пакуль слаба. Маладымі празаікамі пераважна бяруцца і развіваюцца нейкія прыватнасці з багатай палітры тэматычнага, выяўленчага і стылістычнага пошуку прозы ранейшай пары. Запозненым у іх здаецца матыў настальгіі па маральнай цэласнасці і духоўнай паўнаце быцця (запозненым у тым сэнсе, што ён не вырашаецца пановаму), матыў, найчасцей укаранёны, паводле аўтараў, у сялянскім пабыткаванні. Магчыма, але ці дастаткова гэтага для сцвярджэння жыццёва-паўнакроўнага ідэалу?»

Гаворачы аб тым, што маладыя пісьменнікі не заўсёды паспяхова развіваюць усё тое лепшае, што было зроблена да гэтага часу літаратурай пра вёску, М. Стральцоў слушна зазначае, што «маладым пакуль яшчэ, і гэта варта сказаць, бракуе глыбіні аналізу, спеласці грамадзянскай думкі».

Сапраўды, у творах нашых маладзейшых пісьменнікаў мала першаадкрыцця, навізны светаўспрымання і светаразумення, як правіла, вар'іруецца адзін і той жа матыў настальгіі, а таксама матыў вяртання да родных каранёў, да роднай бацькоўскай, старой хаты.

Час вымагае сёння рашучага, інтэнсіўнага паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, новых адносін да рэчаіснасці. Адкінуўшы звыклы погляд на традыцыйны сялянскі ўклад, побыт, працу, неабходна псіхалагічна перайначыцца, адчуць новы рытм нашага дня. Адчуць кожнаму працаўніку, а таксама і пісьменніку. Інакш літаратура адстане ад жыцця. На традыцыйнай народнай аснове трэба выяўляць і паказваць нараджэнне новай псіхалогіі, новых адносін да працы. Такія народныя характары, як Вялічка, Алімпіяда, Ігнат Сцяпанавіч, Сцяпан Дзямідчык, застануцца ў літаратуры яркімі жыццёвымі мастацкімі вобразамі пэўнага этапа. Іх галерэя, вядома, і далей будзе папаўняцца. Аднак, будзем спадзявацца, у нашай літаратуры ўсё часцей будуць з'яўляцца вобразы людзей, якія ўвасобяць самыя надзённыя тэндэнцыі нашага жыцця, працэсы інтэнсіўнага навукова-тэхнічнага прагрэсу. І не так важна, дзе яны будуць жыць і працаваць (вёска, поле — горад, завод), галоўнае — яны будуць знаходзіцца на стрыжні часу, у гушчы падзей сучаснасці.

Працэсы, што адбываюцца на вёсцы, змены ў бытавым укладзе селяніна, безумоўна, маюць аб'ектыўны, незваротны характар. Вядома, трэба бачыць у гэтых працэсах як прагрэсіўнае, перадавое, так і тыя выдаткі, якія спадарожнічаюць урбанізацыі. Цікавыя думкі аб гэтым выказаў І. Шамякін: «...усе шырокія і дарагія мерапрыемствы, рэарганізацыі не спыняць працэсу, што нарастае з хуткасцю снежнай лавіны, — самазнішчэння традыцыйнай вёскі з тыпова сялянскай псіхалогіяй і з бытам, які мала ў чым мяняўся на працягу стагоддзяў. Цяпер гэты быт руйнуецца, бо не задавальняе, не можа задаволіць таго чалавека, якога выхавала школа, літаратура, кіно, але яшчэ ў большай меры — само жыццё, урбанізацыя. У гэтым плане нельга не прызнаць сілу нашых ідэалагічных сродкаў; здорава мы пастараліся, каб развянчаць традыцыйную любоў селяніна да зямлі, гэтак жа добра папрацавалі, каб прывучыць моладзь да новага жыцця — без гною, свінні, з гарачай вадой і прадуктовым магазінам на першым паверсе». Сапраўды, далёка не ўсё ў традыцыйнай сялянскай псіхалогіі састарэла. Многае варта было б захаваць, развіць і перадаць новым пакаленням (працавітасць, любоў да зямлі, прыроды, пачуццё гаспадара на сваёй зямлі і г. д.), гэтаксама і ў вясковым, сялянскім побыце.

Бытавая сфера, як вядома, важнейшая сфера чалавечага жыцця. І як бы яна ні мянялася, усё ж застаецца асноўным асяродкам чалавечага існавання. Справа не ў тым, ці прапагандаваць, ці адмаўляць побыт, а ў тым, каб выявіць яго ідэйна-мастацкае значэнне, яго месца і ролю ў тым або іншым творы. Калі пісьменнік у мастацкім творы не замыкаецца на побыце, не капіруе яго натуралістычна, праз побыт выходзіць да важнейшых праблем дня, да чалавечага быцця, яго філасофска-маральнай сутнасці, то, вядома, варта толькі вітаць такі пісьменніцкі прынцып, шырокі зварот да побыту. Але гэта наглядаецца рэдка, часцей сустракаемся з натуралістычным узнаўленнем побыту.

Варта звярнуць увагу і на тое, што мы прывыклі бачыць побыт толькі ў літаратуры пра вёску. Як быццам гарадскі побыт занадта сучасна-стандартызаваны, таму не варты ўвагі літаратуры. Тут усё аднолькавае — і кухня, і пліта, і мэбля (могуць толькі вар'іравацца наборы мэблі). Пры гэтым забываемся пра надакучлівыя штампы ў паказе вясковага побыту. Дзесяткі, а можа, і сотні апавяданняў, аповесцей, раманаў пачынаюцца прыкладна так: гераіня (Ганна, Тэкля, Марыля) паднялася рана, ёй не спалася, здоўжылася ноч, шукае яна лучыну, каб падпаліць дровы ў печы, чысціць (скрабе, лупіць) бульбу, ставіць маленькі чыгунок для сябе ў печ, потым намывае вялікі чыгун бульбы для парсюка, уздымае на прыпечак (цяжка!), потым ужо налівае ваду конаўкай з вядра, што стаіць на ўслончыку і г. д., і г. д. Дзе ж тут разнастайнасць вясковага бытавога ўкладу? Ну, а калі яшчэ сын з горада ў госці прыехаў, то ў творы абавязкова будзе расказана, як маці стараецца не разбудзіць сына, калі пячэ бліны, працэджвае малако, а сын ляжыць за фіранкай і з замілаванасцю думае пра маці, пра родную вёску...

Радасці і беды штодзённага жыцця... Ці не замала гэта для сапраўднай літаратуры. Відаць, усё тут залежыць ад таленту пісьменніка, ідэйнай задумы, так сказаць, мэтавай устаноўкі. Поспех звычайна там, дзе ёсць мастацкая звышзадача — праз штодзённы побыт прыйсці да асэнсавання чалавечага быцця. І тады не з'явяцца думкі аб прапагандзе ў літаратуры «малых спраў», аб эстэтызацыі звычайнага побыту.

У аповесці Л. Арабей «Дзень мінулы, дзень наступны» даследуецца жыццё 35-гадовай журналісткі Тані Каштанавай: было каханне з жанатым чалавекам, нарадзіўся сын Сашка, потым дзень за днём пакацілася жыццё маці-адзіночкі. Паўстаюць пытанні: у чым шчасце чалавека? Як пазбегнуць у старасці адзіноцтва? Адназначных адказаў няма. І ўсё ж гераіня схільная пасіўна прыняць за норму тое, што ёсць (сэнс жыцця — у самім жыцці), а за ёй, відаць, і аўтар аповесці. Так, усё цячэ і мяняецца, а трэба жыць, пераносіць нягоды, і не толькі жыць, але і радавацца жыццю. Таму добраму, што ў ім ёсць. Нават тым прыемным дробязям, якія звязаны з свавольствам дзіцяці, яго забавамі.

Вось такая, трохі фатальная, усёпрымальная філасофія жыцця. Спачуваючы гераіні, увогуле сумленнаму і на рабоце, і ў побыце чалавеку, суперажываючы яе радасці і нягоды, тым не менш часам не хочацца пагадзіцца з яе пасіўнасцю, усёдаравальнасцю.

Свядомая ўстаноўка на падрабязнае ўзнаўленне побыту адчуваецца і ў аповесці З. Прыгодзіча «Ноч перад нядзеляю». На першы погляд можа скласціся ўражанне празмернага бытавізму. Але трэба ўлічваць тое, што ў цэнтры твора — старая вясковая жанчына, жыццё якой прайшло ў нялёгкіх турботах аб блізкіх і родных, іх здароўі і дабрабыце. Праз штодзённую бытавую плынь пісьменнік імкнуўся, як і А. Жук у аповесці «Халодная птушка» (Анэта), выявіць лепшыя рысы народнага характару, паказаць сумленнасць, дабрату, працавітасць, жаданне жыць па законах справядлівасці простай вясковай жанчыны Марылі. З. Прыгодзіч імкнецца выявіць прычыны, чаму нярэдка не захоўваюцца лепшыя народныя якасці, ірвуцца сувязі, моладзь не наследуе традыцый сваіх бацькоў. Паўстаюць актуальныя пытанні і праблемы: з чаго нараджаецца сучасны практыцызм, утылітарызм, прагматызм, дзяляцтва, сучаснае мяшчанства, якія вядуць чалавека да духоўнага збяднення, чэрствасці і эгаізму, які ўрон прыносяць чалавеку, сям'і і грамадству п'янства і алкагалізм.

Жыццё Марылі было сумленным, прайшло ў працы і ў калгасе і дома, а дачка Саня вырасла эгаістычнай і бесчалавечнай. Не склалася сямейнае жыццё ў сына Янака, які апусціўся, запіў, страціў сябе як чалавека і асобу. Зяць Віктар вельмі захапіўся ўласнай гаспадаркай, узбагачаючыся, траціў лепшыя свае якасці... Саня заяўляе: «Што грошы? Сёння яны ёсць, а заўтра няма. А добро застаецца. Дый нельга ж ад людзей адставаць! Чым мы горшыя за іншых?» А маці гэтага не можа зразумець.

Марыля дажывае свае апошнія дні, пытанні, чаму ўсё так адбываецца, не даюць ёй спакою. Берагла жыццё дзяцей, не думаючы пра сваё здароўе. Не было калі адпачываць, не было калі лячыцца. Не ў народнай традыцыі было залішне кволіцца ды хадзіць па дактарах.

Адзначаючы ідэйна-эстэтычную значнасць вобраза Марылі як увасаблення народнага характару, нельга не сказаць і пра тое, што З. Прыгодзіч не змог пазбегнуць, як і многія празаікі, распаўсюджанай тэндэнцыі — празмернай ідэалізацыі гераіні, якая страчвае канкрэтна-жыццёвыя рысы, становіцца рупарам аўтарскіх ідэй, абагульненым носьбітам народнай маралі і этыкі наогул, супрацьстаіць сучаснаму свету, нават маральнаму свету сваіх дзяцей.

І ўсё ж аповесць З. Прыгодзіча ў цэлым стварае даволі рэалістычны малюнак сучаснага вясковага побыту з усімі яго светлымі і ценевымі бакамі. Тут няма захаплення патрыярхальнасцю, аўтар, як нам здаецца, нават больш канцэнтруе ўвагу на негатыўных з'явах (прагматызм, прага ўзбагачэння, п'янства і інш.), бо яны прыводзяць

(Заканчэнне на стар. 6—7).

БЫТ ці БЫЦЦЁ?

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 5).

людзей да бездухоўнасці і страты чалавечага ў чалавеку, з'яўляюцца сацыяльна шкоднымі і небяспечнымі. Пісьменнік гэта добра адчувае і адкрыта, з выразных ідэйных пазіцый імкнецца па-мастацку даследаваць карані і прычыны негатыўных з'яў у нашым жыцці.

Імкненне праз побыт выявіць маральную пераемнасць паміж пакаленнямі, раскрыць жывыя карані выразна выяўляецца ў аповесці М. Гіля «Прагал». Тут таксама ў цэнтры аповесці старая вясковая жанчына — Стэфа, якая ўвасабляе здаровую народную мараль.

Што ж хвалявала і прыгнятала Стэфу? Здавалася, не было ў яе асаблівых нягодаў. Можна было ціха дажываць свае гады ў горадзе ў сына. Аднак з'ездзіла ў сваю Альхоўку, пабыла на могілках, паглядзела на месца-прагал, дзе стаяла яе хата, і страціла спакой. Зноў у думках успамінала ўсё сваё жыццё, асабліва страшныя ваенныя гады, блакаду, нялёгкі пасляваенны час, працу на ферме ў калгасе, час, калі падымала на ногі сваіх дзяцей і выпраўляла іх у горад... «Ці цяперся развіталася з Альхоўкай, усе свае карані там паабсякала, а ўсё адно цягне туды і цягне, як магнітам».

Як і Марыля ў аповесці З. Прыгодзіча, не можа Стэфа зразумець і прыняць многае ў жыцці сваіх дзяцей. Вельмі балюча перажывае яна тое, што рвуцца традыцыйныя маральныя сувязі паміж пакаленнямі. І перш чым памерці, ёй вельмі хочацца, каб хоць што добрае з жыцця старэйшых перадалося малодшым, яе дзецям і ўнукам. «Бянтэжыла яе, што дзеці быццам выракліся Альхоўкі: зрэдку ўспаміналі вёску, дзе панароджваліся і павыраслі, але ні разу, бадай, не паказвалі жадання з'ездзіць туды ў адведкі. Чаму ж так? Думала і не знаходзіла адказу».

А найбольш турбавала Стэфу тое, што дзеці, хоць і не цураліся працы, не мелі ад яе радасці. «Усё больш дзяціныя гаворкі круцяцца вакол таго, хто што дастаў і дзе, хто каго абняславіў і за што, хто каму дарогу перабег і навошта. І сумна робіцца ёй ад усяго гэтага. Бо — радасці ў дзяцей няма. Мала радасці. Найбольшую ж радасць работа прыносіць. Работа, а не што іншае».

Гераіня імкнецца дапамагчы сваім прыкладам, словам не збочыць у жыцці сваім дзецям і ўнукам. «Яны, праўда, не надта і прыслухоўваюцца, але — такой бяды. Цяпер не прыслухаюцца, дык мо пазней надарыцца тая хвіліна, калі матчына ці бабуліна слова прыбяжыць на памяць, а жыццё ў іх, асабліва ва ўнукаў, яшчэ наперадзе, і можа быць у тым жыцці яшчэ шмат чаго». Аднак часам імкненне да павучальнасці, да залішне назойлівай перадачы свайго жыццёвага і духоўнага вопыту малодшым пакаленням, на нашу думку, толькі зніжае мастацкую вартасць твора, яго маральны патэнцыял.

Вельмі часта ў прозе апошніх год вар'іруюцца ў самых розных формах матывы вяртання чалавека ў той куток, дзе, як кажуць, завязаны пупок. Але праблема гэта часам страчвае фактар навізны і першаадкрыцця, хоць па-ранейшаму з'яўляецца жыццёвай і актуальнай. На жаль, мала ў нас твораў, дзе ёсць такія характары, якія становяцца з'явай у літаратурным жыцці. Замнога з'явілася ў нашай літаратуры герояў, якіх называюць «вібрыруючымі героямі», «імітатарамі». «Для сябе ён ведае і верыць, што перашкоды, аб якія ён набіў сабе шышкі, у прынцыпе могуць быць пераадолены, але гэта — калі-небудзь і кім-небудзь. Ён жа, прабачце, не баец, ён проста сумленны, «добры чалавек», які наглядае, як фальшывыя словы адлятаюць ад фальшывых сценак, і атрымлівае за сваю прадпрымальную дабрадушнасць далёка не фальшывыя даброты.

Літаратура заўважыла з'яўленне гэтых «прамежкавых людзей», — пісаў нядаўна ў «Літаратурнай газеце» крытык В. Сакалоў.

Так, падобныя людзі ёсць у жыцці. Яны — не героі, яны своеасаблівыя прыстасаванцы. Але якой павінна быць пазіцыя пісьменніка, калі ён імкнецца ўвасобіць такога «амбівалентнага» чалавека ў вобразе героя? Думаецца, не ў вобразе «добрага чалавека». Цікава разважае пра такога чалавека герой аповесці В. Распуціна «Пажар»: «У жыццёвай практыцы ўжо той сёння добры чалавек, хто не робіць зла, хто без спросу ні ўва што не ўмешваецца і нічому не перашкаджае. Не натуральная схільнасць да дабра стала меркай добрага чалавека, а выбранае зручнае становішча паміж дабром і злом, пастаянная і ўраўнаважаная тэмпература душы. «Хата з краю» з вокнамі на два бакі перабралася ў цэнтр».

Для героя, як і для пісьменніка, такая пазіцыя непрымальная, бо «ў жыцці, відаць, самае важнае: кожнаму на сваім зададзеным месцы трымацца правільнага кірунку, а не крывіць без дарогі і не завязваць яе ў вузлы няпэўна-пошукавымі перабежкамі».

Не шукаў бакавых сцежак боцман Ахрэм Піліпавіч Забалотны—герой аповесці А. Крыгі «Бухта адзінокага чалавека», хоць лёс да яго нярэдка паварочваўся нягодамі. Праз усё жыццё пранёс ён вернасць франтавому брацтву, памяць пра тых, хто не дайшоў да Перамогі. Помніў ён і пра сваё каханне, пра былую жонку, якая здрадзіла яму... Як сапраўдны старэйшы таварыш адносіцца ён да маладых маракоў.

Праўда, задума стварыць шматгранны вобраз чалавека, які ў нялёгкіх жыццёвых абставінах заўсёды застаецца чалавекам, не ва ўсім знайшла адпаведнае, сапраўды глыбокае ўвасабленне. Не стае вобразу псіхалагічнай заглыбленасці, распрацаванасці. Тое ж можна сказаць і пра вобразы маладых герояў (Максім, Ігнат, Волька і інш.).

Аповесць А. Крыгі пашырае ідэйна-тэматычныя далягляды беларускай прозы. Аднак у ёй разам з гэтым адчуваецца звужанасць духоўнага жыцця героя, абмежаванасць яго думак у асноўным сферай успамінаў пра былое сямейнае жыццё, адарванасць іх ад надзённых праблем часу. Ды яшчэ зашмат у аповесці выпадковых сустрэч, якія цяжка вытлумачыць рэальнымі абставінамі жыцця, але якія патрэбныя аўтару, каб прывесці героя ў да шчаслівага фіналу, звязаць у адно цэлае ўсе сюжэтныя лініі аповесці.

Выпрабаванне чалавечнасці, духоўнасці, маральнасці ў жыцці адбываецца штодзённа— у працы, грамадскіх справах, у побыце, асабістых узаемаадносінах людзей. У апошні час часцей пісьменнікі «выпрабоўваюць» свайго героя «вещизмом», побытам. У аповесці «Сны не вяртаюцца» І. Капыловіч, наадварот, стварае вострыя сітуацыі, якія адразу выяўляюць, хто ёсць хто. Журналіст Дуброва ў час камандзіроўкі трапляе ў аўтааварыю, відаць, застанецца на ўсё жыццё інвалідам... Аня, якая лічыла сябе нявестай Алега, прыслала пісьмо ў бальніцу, адмовілася ад яго. А вясковая дзяўчына Лена, з якой некалі сустракаўся Дуброва, прыехала, каб падтрымаць яго ў цяжкі час.

Побач яшчэ адна падобная гісторыя: у бальніцы разам з Алегам знаходзіцца Міхась, які пасля няшчаснага выпадку таксама застаўся інвалідам і ад якога адказалася жонка.

Жыццё і ў мірны час бывае драматычным. І не кожны здольны ў складаных сітуацыях падтрымаць сябра, таварыша, не пакінуць яго ў бядзе. Што датычыцца Ані, то яна і раней здрадзіла свайму каханаму, не захацела ехаць з ім на працу на Палессе. Гэтак жа лёгка яна адказалася і ад Алега. Тут усё зразумела: прага мяшчанскага дабрабыту стала галоўным у яе жыцці, выцесніла ўсё тое добрае, што было ў яе характары, душы.

Алег змог сам перажыць бяду, знайсці сілы, каб не страціць сябе як чалавека, журналіста. І пісьменніку ў цэлым гэта ўдалося праўдзіва паказаць. Хоць рэзкае, а часам і лабавое супрацьпастаўленне чалавечнасці і бесчалавечнасці, духоўнасці і бездухоўнасці, адкрытая дыдактычнасць зніжаюць ідэйна-мастацкі, выхаваўчы патэнцыял твора.

Наогул, як ужо адзначалася, назойлівая павучальнасць і маралізатарства сталі ўжо вельмі відавочнымі ў беларускай прозе, асабліва ў аповесцях маладых пісьменнікаў. Многім творам бракуе сапраўднага псіхалагізму ў паказе праўды ўнутранага душэўнага жыцця нашага сучасніка, яго складаных маральных пошукаў. Нярэдка можна сустрэць самы звычайны інфантылізм мыслення не толькі герояў твораў, але і самога пісьменніка. Прастата становіцца спрошчанасцю, павярхоўнасцю. Гэта адмоўна ўплывае на агульны ўзровень мастацкага твора.

У маральных пошуках, пошуках сэнсу жыцця ў наш час у сувязі з жыццёвым і духоўным вопытам перыяду Вялікай Айчыннай вайны, з жывой і балючай памяццю аб ёй пастаянна знаходзяцца героі аповесці Т. Бондар «Жывыя жывуць».

Памяць аб трагічных падзеях вайны, аб незваротных стратах і ахвярах выклікае розны водгук у душах нашых сучаснікаў: адных яна і сёння прыгнятае, не дае шчасліва жыць, другіх яна, наадварот, пабуджае жыць актыўным, паўнакроўным жыццём, бо напакутаваліся, пагаравалі, жыць і за сябе, і за тых, каго даўно ўжо няма побач...

Смерць Сцяпана, партызана, самага роднага чалавека, Ніна не змагла перанесці — у выніку год цяжкай хваробы, доўгія пасляваенныя гады ў поўнай абыякавасці да жыцця, да мужа Павэлка... А Павэлак? Ён усё жыццё, яшчэ да Сцяпана, кахаў Ніну, не траціў надзеі праз гады вывесці яе са стану адчужанасці і пасіўнага сузірання. Але і Павэлак, які быў нядрэнным партызанам, не ў ладах з ваеннай памяццю: хоць сам і не прычасны да смерці Сцяпана, усё ж у парыве рэўнасці жадаў яе, а па сутнасці яго жаданне споўніў здраднік Ахрэм. А яшчэ выявілася, што ў яго быў сын ад партызанкі Фросі, які загінуў недарэчна дарослым у наш час у аўтамабільнай аварыі, а Павэлак нічога не ведаў пра яго... І зноў, як быццам, ён ні ў чым не вінаваты, але ж... але ж... Для Фросі, загінуўшай у вайну, было каханне, а для яго—выпадковыя сустрэчы... Не разгледзеў, не зразумеў дзяўчыну, абышоўся з ёй па сутнасці подла... І шукае ён сабе апраўдання: «А за што? Што ён — смерці Фросінай хацеў? І пра сына Павэлак не ведаў. І ўся яго віна ў тым, што не ведаў». Не мог зразумець сваёй віны, як і таго, «чаму ўсё-ткі так і не прыгарнулася да яго Ніна. Жонкай была, у ложак ягоны лягла, а не прыгарнулася. Ні тады, калі прывёў яе сюды, у сваю хату, ні потым. Чужой прыйшла, чужой і засталася. Ці мала ён патаптаўся вакол яе? Ці мала трываў, навучыўшыся цярплівасці? Не прыняла. Не прыгарнулася. Мо таму і дзяцей у іх не было...»

Цяжка было ў вайну, але тады — Павэлак ваяваў, атрымаў медаль «За адвагу». «Багата яе, адвагі, спатрэбілася кожнаму, каб пераламаць немца, адолець. Кожнаму і ўсім— усяму народу, адным словам. А медаль не ўсім далі. Яму, Павэлку, далі. Думалася пра гэта спакойна. Без асаблівага гонару. Усяго нагледзеўся за тры гады. Не на ўсё і яму, Павэлку, адвагі хапала». І ўсё ж тады, перад тварам смерці, для яго было больш яснасці, чым у некаторых пытаннях сёння. Наогул Павэлак не любіць гаварыць пра гераізм. Чалавек павінен рабіць тое, што патрэбна ў тых ці іншых абставінах. «А медалі... Не сядзеў жа і Павэлак, склаўшы рукі. Што мог, рабіў... І геройства ў тым. І ўсе, выходзіць, героі. Бо кожны хацеў выжыць. Кожны разам са сваім жыццём і зямлю бараніў. Бо як без зямлі? І жыве, і памірае чалавек на сваёй зямлі, калі па-людску жыў. Так і пры дзядах было».

Усё гэта не дае спакойна, нармальна жыць героям, пастаянна бударажыць іх, прымушае зноў і зноў вяртацца ў ваеннае мінулае, зноў перажываць даўно перажытае...

І толькі пісьмы Сцяпана ваеннага часу, што перадаў яго дзядзька Ніне, прымушаюць гераіню па-іншаму паглядзець на навакольны свет, на людзей, на свайго Павэлка, які, па сутнасці, ахвяраваў ёй сваё жыццё і ўсё яшчэ не траціў надзеі... Яна пачынае разумець, што ў імя памяці пра Сцяпана, пра трагедыю вайны яна, як і ўсе людзі, павінна жыць і працаваць, жыць актыўна, з поўнай аддачай, жыць у імя будучыні, міру, у імя новых пакаленняў, якія прыйдуць нам на змену.

Гэта, на маю думку, новы, цікавы паварот у раскрыцці памяці вайны ў нашай літаратуры. Не толькі адчуванне незваротнасці таго, што адбылося, цяжкая памяць удоў і сірот аб ахвярах, але і неабходнасць пераадолення трагізму, неабходнасць жыць у імя сучаснасці і будучыні.

І тут, вядома, да месца псіхалагічныя наплывы, кампазіцыйныя зрушэнні ў часе, пастаянныя пераходы ад сучаснасці да падзей вайны. Але ў аповесці далёка не ўсё з'яўляецца неабходным, арганічным і натуральным. Шмат тут прэтэнцыёзнага, фармальна-штучнага. Хоць бы гэтыя дасловныя паўтарэнні асобных момантаў псіхалагічнага жыцця, перададзеных у форме ўнутранага маналогу, зачыны ў форме выслоўяў і пагаворак. А яшчэ, як і ў многіх паэтаў, якія пачынаюць пісаць прозу, шматлікія паэтызмы, залішне прыгожая прэтэнцыёзная метафорыка.

Значная і важная праблема памяці, праблема адказнасці чалавека за ўсё, зробленае ім у жыцці, не знайшла ў поўнай меры свайго адпаведнага мастацкага ўвасаблення. Аповесці бракуе аналітызму. Слаба выяўлены ўнутраныя псіхалагічныя працэсы ў свядомасці, у душы Ніны, якія прывялі да пералому, да новага ўспрымання свету, свайго жыцця, адносін з людзьмі.

Стварыць вобраз нашага маладога сучасніка, паказаць яго не толькі ў сферы побыту, але і працы імкнуўся В. Супрунчук у аповесці «Сяргей Сяргеевіч». Які ж маральны ўрок вынікае з жыццёвай і духоўнай дзейнасці героя? Актыўны, энергічны, сумленны ў сямейным, грамадскім і працоўным жыцці Сяргей Сяргеевіч, малады старшыня перадавога калгаса, усяго сябе аддаваў справе. А ў фінале ён павінен несці адказнасць і па партыйнай лініі і па закону — даваў хабар прайдзісвету, каб дастаць запчасткі для калгаснай сельгастэхнікі..

Канфлікт гэты не новы для нашай літаратуры. Прыгадаем раман І. Шамякіна «Вазьму твой боль». Там са згоды дырэктара саўгаса «выбіваў» запчасткі старшыня рабачкома Якаў Качанок, і, вядома, таксама не за так. Але ўсе гэтыя справы абыходзілі бокам заслужанага дырэктара Астаповіча, які быў «чысценькі», і не толькі ў сувязі з хабарам, у маральных адносінах. Таму гэта праблема і не паўстала востра ў рамане.

Напамінала гэта праблема пра сябе яшчэ раней: «прабіўны» Карнач у рамане І. Шамякіна «Атланты і карыятыды» або Каравай, старшыня калгаса ў п'есе А. Макаёнка «Таблетку пад язык».

Сяргей Сяргеевіч — галоўны герой аповесці рэдка хаваецца за плечы сакратара парткома Уладзіміра Паўлавіча ці шафёра Аляксея, ён, як кажуць, выклікае агонь на сябе, мае непасрэдныя кантакты з «даставалам» Карасікам, сам распараджаецца выпісаць і завезці яму рыбу, мяса з калгаснага склада.

Праўда, «ох як не хацелася Сяргею Сяргеевічу званіць Адаму Міхайлавічу, чуць яго задаволены, хітры голас», але ўсё ж званіў, кланяўся Карасіку.

Сумленне — і абставіны... Адступленне ад законнасці, маралі ў імя агульнай справы, у імя калгаса. Дзе тая мера віны? Пытанне пастаўлена востра. Ці можна адступаць ад прынцыпаў камуністычнай маралі нават пад напорам абставін, калі гэта робіцца на карысць агульнай справе? Дасягненне мэты любымі сродкамі? Нават амаральнымі? Герой аповесці разумеў, што так нельга (адгэтуль і яго надзвычай вострыя сутычкі з Карасікам), аднак часам паддаваўся абставінам, ішоў на кампрамісы.

І ўсё ж разгледзець за гэтай, па сутнасці гаспадарчай праблемай больш важныя — ідэйныя, маральныя, духоўныя, — праблемы, паказаць іх як пэўную негатыўную тэндэнцыю ў нашым жыцці («ты мне — я табе») аўтару аповесці глыбока, па-мастацку не ўдалося.

І не толькі вытворчая, а і бытавая сфера, узноўленая ў аповесці (смерць бацькі Сяргея Сяргеевіча, быт яго сям'і, падзел маёмасці) адкрывалі шырокі прастор для выхаду з затхлага мяшчанскага побыту на шырокія праблемы чалавечага быцця. Аднак усё звялося да таго бескарыснага жэсту, калі герой адмаўляецца ад усяго, што належала яму па завяшчанні (машына, дача, грошы), дэманструе сваю станоўчасць, бескарыслівасць, амаль ідэальнасць.

У аповесці выявіўся вузкі погляд на духоўны свет нашага сучасніка, недастаткова глы-

бокае пранікненне ў яго душэўнае жыццё, наогул у праблемы сучаснасці.

Вядома, раскрыць стыхію вясковага жыцця цяжка без пранікнення ў стыхію народнага побыту, народнай мовы. Як пісьменніцкая ўдача прыгадваецца цёпла сустрэтая крытыкай аповесць М. Клебановіча «Іван Аляксеевіч».

Стылізацыя пад грубаватую народную мову, імкненне праз гумарыстычнае раскрыць сур'ёзныя праблемы бытавога жыцця характэрны яшчэ ў большай ступені новай аповесці М. Клебановіча «Манька». Тут, як і ў аповесці В. Дубінкі «Не плач, душа мая», чытач бачыць «прыгоды» вясковага «натуральнага» чалавека, які аказаўся ўпершыню ў нязвыклых для яго абставінах і выглядае дзіваком.

У такім выпадку вельмі важным з'яўляецца тое, хто з'яўляецца аб'ектам пісьменніцкай увагі. Ці варта з пункту гледжання нашай маралі і этыкі высмейваць яго, пацяшацца над ім?

Манька ў аповесці М. Клебановіча — не той вобраз вясковай жанчыны, з якой можна кпіць. Гаротнае, цяжкае дзяцінства, юнацтва... Усё рабіла, як мужчына, падарвалася на калгаснай працы... Выйшла замуж за настаўніка, а дзяцей няма. І вось першы раз паехала з дому, паехала лячыцца ў санаторый. Тут і прыгоды — цікавейшыя, чым былі ў дзядзькі Антося, калі ён трапіў у Вільню. Можна і пасмяяцца, бо Манька для многіх — патрыярхальна адсталая, вельмі ж несучасная жанчына. Хоць бы той эпізод, калі Манька зайшла ў вагоне ў туалет, выйсці ж, адкрыць дзверы не змагла: упершыню ехала ў цягніку. Чым не смешна? «Успомніла, што зашчапілася, дый закрутка тая заўпарцілася, не паварочвалася, пальцы слізгалі з блішчастага жалеза — ні туды ні сюды. Во халера. А мо хто там назнарок падпёр дзверы, не пускае. Прыслухалася — здэцца, ціха. Паспрабавала зноў — дзверы як забітыя. Вагон гэцкала, хістала, на нагах не адзержацца, на падлозе мокра, хоркала нешта ў той пасудзіне».

Ну, а далей? Людзі мяркуюць, што ў туалеце ці выпіваюць, ці хто любоў круціць. Вось і прыгоды! Вось вам і быт і быццё!

Думаецца, наўмысная стылізацыя пад грубавата народнае тут падвяла пісьменніка. Вобраз Манькі шмат у чым драматычны, ён вымагаў сур'ёзнага псіхалагічнага раскрыцця, а не парадзіравання.

Якія ж вывады можна зрабіць на аснове разгледжаных твораў? Якія тэндэнцыі выразна выяўляюцца ў апошні час ў беларускай прозе? Наглядаецца паступовы, але няўхільны паварот прозы да сучаснасці, пашырэнне яе ідэйна-тэматычных далягляданняў. Проза на матэрыяле вясковага жыцця працягвае ўзнаўляць і назапашваць багаты жыццёвы і духоўны вопыт працоўнага чалавека, ствараючы народныя характары-тыпы. Вядуцца даволі настойлівыя пошукі героя сучаснасці, чалавека актыўнай жыццёвай пазіцыі, выпрабоўваюцца разнастайныя прыёмы і сродкі яго ўвасаблення. І тым не менш прыходзіцца пагадзіцца, што сапраўдныя мастацкія здабыткі, відаць, яшчэ наперадзе. Сёння адбываюцца прыкметныя зрухі ў свядомасці нашага сучасніка, прыходзіць да яго адчуванне і разуменне, што трэба жыць і працаваць па-новаму. І літаратура таксама пачынае рэагаваць на патрабаванне часу. Усё большая ўвага ў паказе працы ўдзяляецца чалавечаму фактару. Ідзе назапашванне новых якасцей, якія не могуць не прывесці да плённых вынікаў.

ВІНШУЕМ

Змітру БЯСПАЛАМУ — 50

Сёння спаўняецца 50 гадоў празаіку Змітру Бяспаламу. Праўленне СП Беларусі ад усяго сэрца павіншавала яго з юбілеем. У прывітанні гаворыцца:

«Дарагі Змітро Аляксандравіч!

Горача віншуем Вас, вядомага празаіка і публіцыста, з нагоды Вашага пяцідзесяцігоддзя з дня нараджэння.

Сын селяніна, Вы ў 1956 годзе скончылі Рэчыцкі землеўпарадчы тэхнікум, пасля працавалі землеўпарадчыкам у Гродзенскай вобласці. Два гады знаходзіліся ў радах Савецкай Арміі, вучыліся на аддзяленні журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, які паспяхова закончылі ў 1963 годзе.

Яшчэ ў часе вучобы Вы пачалі супрацоўнічаць у рэдакцыі часопіса «Вожык», потым

былі прызначаны намеснікам рэдактара аддзела гэтага часопіса.

З 1972 года Вы — адказны сакратар інфармацыйна-метадычнага бюлетэня «Родная прырода», а пасля рэарганізацыі бюлетэня ў часопіс — яго галоўны рэдактар.

Вы прыйшлі ў літаратуру ў 1964 годзе, абраўшы жанр сатыры і гумару. Вашы гумарыстычныя апавяданні і фельетоны, сабраныя ў кнізе «Сякера пад лаваю», былі прыхільна сустрэты крытыкай і чытачамі. Адначасова Вы пісалі для дзяцей, гэтая захопленасць стала вызначальнай у Вашай творчай дзейнасці.

На Вашым рахунку кнігі прозы — «Лясныя хітруны», «У лясной каморы», «Мядзведзеў пачастунак», «Страшны звер», «Дзіўны птах», «Казкі сіняга лесу», «С полным лукошком».

У сваіх кнігах Вы апяваеце хараство роднай прыроды, вучыце гуманістычным адносінам да яе насельнікаў і жыхароў, расказваеце пра незвычайнае, убачанае і зведанае проста і шчыра. Сустрэча з Вашымі кнігамі заўсёды прыносіць юным чытачам шчырае задавальненне.

Вы вядомы як і збіральнік беларускага фальклору. Кніга «Беларускія народныя жарты» — плён настойлівых Вашых пошукаў і працы.

Мы ведаем Вас і як актыўнага ўдзельніка ва ўсіх масава-грамадскіх мерапрыемствах, што праводзяцца нашай пісьменніцкай арганізацыяй.

Жадаем Вам, дарагі Змітро Аляксандравіч, новых цікавых кніг, здароўя, шчасця».

Калектыў штотыднёвіка далучаецца да гэтых шчырых пажаданняў.

ІНТЭРВ'Ю Ў НУМАР

ЯРКАЙ МОВАЙ ФАРБАЎ

Расказвае загадчык рэдакцыі мастацкага афармлення выдавецтва «Юнацтва» Іван БОКІЙ

Прайшло пяць гадоў з таго часу, як у нашай рэспубліцы пачало працаваць выдавецтва «Юнацтва». 157 назваў кніг яго з'явіцца на паліцах кнігарань і бібліятэк у новым 1986 годзе. Безумоўна, пра ўсе з іх расказаць немагчыма. Я пазнаёмлю чытачоў з некаторымі лепшымі кнігамі, якія выйдуць у 1986 годзе.

Пра вялікую ролю ілюстрацыі ў дзіцячай кнізе, пра яе мастацкае афармленне, пра работу рэдакцыі мастацкага афармлення і пойдзе размова ніжэй.

Рэдакцыя мастацкага афармлення выдавецтва «Юнацтва» па сваім складзе і ўзросце адносна яшчэ маладая. Але за пяць гадоў свайго існавання, ёй падрыхтавана і афармлена шмат прыгожых і цікавых кніг. Своеасаблівая пяцігодка і ў нашых мастакоў-ілюстратараў дзіцячай кнігі. На свой рахунак яны запісалі больш за 50 дыпломаў Усесаюзнага, Міжрэспубліканскага і Рэспубліканскага конкурсаў «Мастацтва кнігі».

Выданні «Юнацтва» экспанаваліся на Біенале ілюстрацыі дзіцячай кнігі ў Браціславе (Чэхаславакія), а таксама на міжнародных кніжных выстаўках у Мюнхене, Калькуце, Каіры і іншых гарадах.

Кожны год выдавецтва выпускае больш за 150 назваў дзіцячых кніг, з іх 10—12 кніг выходзяць у палепшаным афармленні. Нашы кнігі штогод атрымліваюць на Усесаюзным, Міжрэспубліканскім і Рэспубліканскім конкурсах «Мастацва кнігі» 10—13 дыпломаў рознай годнасці.

У гэтым годзе за кнігі А. Лось «Дзесяць дзён у Барку» (мастак А. Лось) і «Слова аб палку Ігаравым» (мастак Георгій Паплаўскі) выдавецтва атрымала адразу дзве вышэйшыя ўзнагароды рэспубліканскага конкурсу— дыпломы імя Францыска Скарыны. Гэта вялікае дасягненне выдавецтва і рэдакцыі мастацкага афармлення ў прыватнасці.

Кнігі для маленькіх чытачоў мастакі афармляюць цікава, ярка, з творчай выдумкай і фантазіяй. Вялікі ўклад у гэтую справу ўносяць не толькі вядомыя мастакі Арлен Кашкурэвіч, Васіль Шаранговіч, Георгій Паплаўскі, Алена Лось, Уладзімір і Міхаіл Басалыгі, Юрый Зайцаў, але і маладыя здольныя мастакі Валерый Славук, Уладзімір Савіч, Мікола Селяшчук, Таццяна Беразенская, Віктар Александровіч, Юрый Герасіменка і іншыя.

1986 год абяцае быць таксама цікавым на дзіцячыя выданні. Да 110-годдзя з дня нараджэння Цёткі (Алаіза Пашкевіч) да выбраных яе твораў таленавіты мастак Уладзімір Савіч падрыхтаваў ілюстрацыі.

Міхаіл Басалыга стварыў цэлы шэраг ілюстрацый у тэхніцы каляровай лінагравюры да паэмы Янкі Купалы «Курган». У іх ён вырашае складаныя пластычныя задачы, прасочвае народныя традыцыі і гісторыю. Другая цікавая кніга, афармленая Міхаілам Басалыгам у нашым выдавецтве, — зборнік вершаў «Дзень міру». Лінагравюры ствараюць у ёй радасны і святочны рад. Разам з гэтым, тут і пяшчота маці, і боль страты, і неўміручы подзвіг народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Як заўсёды, цікава, ярка і весела афармляюцца казкі. Наталля Паплаўская ў ілюстрацыях да зборніка казак замежных пісьменнікаў «Каліф-бусел» будуе свае кампазіцыі спакойна, мякка.

Беларуская народная казка «Прагны багацей», ілюстраваная здольным мастаком Міколам Селешчуком, вельмі тактоўна і вобразна расказвае маленькім чытачам, як быў пакараны за сваю прагнасць багаты брат.

Зборнік вясёлых песенек, казак, вершаў і апавяданняў «Светлячок» мастачка Алена Лось напоўніла каляровым дзівосным святам, якое яна ўбачыла ў нашым жыцці. Гэтая кніга, багата і цікава ілюстраваная, прызначана для пяцішасцігадовых слухачоў і чытачоў. Падобны зборнік «Малышок», для самых маленькіх, таксама прывабны, каляровы, святочны, вось-вось выйдзе з друку. Яго афармляў вядомы дзіцячы мастак Юрый Зайцаў.

Маладая мастачка Таццяна Беразенская, якую добра ведаюць па кнігах «Сядзеў мядзведзь на калодзе», «Жаронцы», «Мама мышка сушыла шышкі» і іншых выданнях, выканала ілюстрацыі да кнігі Васіля Зуёнка «Хата, поўная гасцей».

Вельмі папулярную ў дашкольнікаў серыю «Зрабі сам» у 1986 годзе папоўняць кніжкі-тэатр «Кот у ботах» і «Хлапчыш-Кібальчыш». Калі выразаць і склеіць малюнкі, змешчаныя ў гэтых кнігах, то дзеці змогуць паставіць свой маленькі спектакль. Кніжка-самаробка «Пятнаццаць сустрэч з казкай», з гэтай жа серыі, пазнаёміць дзяцей з казкамі народаў СССР. Трэба толькі разрэзаць лісты і скласці іх так, каб атрымалася 15 маленькіх кніжачак-казак пятнаццаці саюзных рэспублік.

Кніжка-цацка «Знайка», якая выходзіць у выдавецтве штогод, свой чарговы выпуск прысвячае цікавым гульням, незвычайным загадкам, галаваломкам, самаробкам і інш.

Абяцаюць быць цікавымі і прыгожымі ў наступным годзе выданні: зборнік беларускіх народных казак «Людзей слухай, а свой розум май» (мастак Валерый Славук), кніга югаслаўскага пісьменніка Е. Юрчыча «Як аднойчы казла судзілі» (мастак Мікола Казлоў), кніга апавяданняў У. Юрэвіча «Нястрашны страх» (мастак Віктар Шатуноў), казкі З. Бядулі «Клад» (мастак Мікола Селяшчук) і многія іншыя кнігі.

Рэдакцыя мастацкага афармлення запрашае чытачоў у дзівосны каляровы свет кніг выдавецтва «Юнацтва».

КНІГАПІС

І. НАВУМЕНКА. Вяртанне ў маладосць. На славацкай мове. Усходнеславацкае выдавецтва. Кошыцэ, 1985.

У кнігарнях Славакіі з'явілася кніга прозы Івана Навуменкі «Вяртанне ў маладосць». На славацкую мову творы беларускага пісьменніка пераклаў Юрай Андрычык.

У пасляслоўі да кнігі Вацлаў Жыдліцкі зазначае, што напачатку творчасць Івана Навуменкі была аўтабіяграфічнай, ён прадстаўнік таго пакалення моладзі, у якога напярэдадні вайны было за плячамі ўсяго «семнаццаць вёснаў». Гэтыя хлопцы-равеснікі вучыліся, захапляліся Жулем Вернам, марылі аб моры, сумавалі аб гераічных учынках, перажывалі сваё першае нясмелае каханне. І раптам рамантычныя мары абарваліся, жыццёвыя планы рухнулі, словы кахання засталіся нявыказанымі, а запланаваны выпускны вечар не адбыўся. Пачалася вайна!..

«На гэтым кантрастным моманце, — падкрэслівае аўтар пасляслоўя, — Навуменка пераважна і будуе сваю прозу. Найчасцей ён ужывае яго як кампазіцыйны прыём і сюжэтны «вузел» апавядання... Горкі лёс, які спасціг ягонае пакаленне, з'яўляецца цэнтральным матывам і праблемай Навуменкавай творчасці».

Далей крытык сцвярджае, што «вылучэнне трагічнага ваеннага лёсу збліжае Навуменку з Быкавым, хоць кожны з іх дасягае пастаўленай мэты сваім уласным спосабам... У іх творах існуюць абодва элементы — характар і атмасфера часу. Быкаў аднак аддае перавагу першаму з іх, яго талент з'яўляецца ярка характаратворчым, што датычыць Навуменкі, дык ён перш за ўсё стварае вобраз эпохі, яе тыповую атмасферу, дух часу...

Гэтае выдатнае адчуванне часу надае творам Навуменкі выключную свежасць, дзякуючы якой і чытачы і крытыка прымаюць іх горача і прыхільна».

Аўтар пасляслоўя звяртае ўвагу, што проза Навуменкі «агорнута лёгкай смугой рамантызму і рамантыкі, з'яўляецца эмацыянальнай і дзейснай».

У заключэнне Вацлаў Жыдліцкі піша, што дзякуючы гэтым своеасаблівасцям прозы пісьменніка ў свядомасць чытача глыбей урываюцца характары маладых людзей, якіх памяць сэрца захавала разам з атмасферай эпохі для нас і будучых пакаленняў.

Л. ЧАРЭШНЯ.

ПЛЁННЫЯ КАНТАКТЫ

Наваполацку пашанцавала на ўвагу пісьменнікаў. Сярод тых, хто ўславіў мастацкім словам горад нафтахімікаў, — П. Броўка, П. Панчанка, Т. Хадкевіч, А. Савіцкі, В. Лукша і іншыя.

Трывалыя творчыя сувязі ўсталяваліся ў калектыву выдавецтва «Юнацтва» з моладдзю, камсамольцамі маладога горада. Паміж выдавецтвам і ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга наваполацкай гарадской камсамольскай арганізацыяй заключаны дагавор аб творчым супрацоўніцтве, які дзейнічае ўжо другі год. Згодна дагавору супрацоўнікі выдавецтва павінны не толькі выступаць перад моладдзю Наваполацка, але інфармаваць гарадскую камсамольскую арганізацыю аб сваіх працоўных дасягненнях па выкананні плана выпуску літаратуры для дзяцей і юнацтва.

Менавіта з гэтай мэтай наведала Наваполацк група пісьменнікаў і супрацоўнікаў выдавецтва «Юнацтва» — Я. Каршукоў, П. Макаль, У. Мазго, Б. Спрынчан і У. Скарынкін. Адбылася цікавая сустрэча з моладдзю горада. З расказам аб працоўных справах камсамольцаў горада, аб тым, як яны сустракаюць XXVII з'езд КПСС выступіла першы сакратар гаркома камсамола С. Драздова. Пра выдавецкія справы, выпуск літаратуры за справаздачны перыяд расказаў галоўны рэдактар выдавецтва Я. Каршукоў. У прыватнасці, ён адзначыў, што новая кніжная серыя «Гарады камсамольскай славы» пачынаецца кнігай пра Наваполацк. У тэматычным плане выдавецтва — зборнік «Агні Нафтаграда», у які ўвойдуць творы вядомых пісьменнікаў, а таксама маладых літаратараў Наваполацка пра горад юнацтва на Дзвіне, якому ў 1988 годзе споўніцца трыццаць год.

В. МАСКАЛЕНКА.

ПАЭЗІЯ

Рыгор БАРАДУЛІН

З новай кнігі «Маўчанне перуна»

Цяпер

Я ведаю цяпер,
Што я не ведаю нічога,
Сказаць сабе адно магу,
Калі
Назад вяртаецца мая дарога,
Стаміўшыся ўцякаць за край зямлі.

Вяртаецца туды,
Адкуль даўно пачаты
Яе разбег і пахаплівы бег.
І ёй яшчэ схавацца хочацца пад шаты,
Як мне ў маленстве
Ад дажджу пад мех.

З гадамі ведаю,
Што край зямлі бывае,
Хоць круглая як воблака яна.
Я поўны да зямлі любові і павагі,
Як што не так рабіў,
Мая віна.

Адчуў, не дрэмле вечнасць —
Скупінда старая:
Дні, што дала мне ўранні напавер,
Хутчэй да хвілі забірае,
Калі мой вечар блізіцца,
Цяпер.

Я ведаю,
Што я хацеў бы ўрэшце ведаць.
Відней відаць мне цені на святле.
Дасюль
У мамы ўсё збіраюся паснедаць,
А ўжо вячэра стыне на стале...

●

Хваробішча, хваробіца
Не зробяць ні шыша,
Калі раптоўна робіцца
Відушчаю душа.

І патыхне адлегаю,
Адступяць халады,
Кароткаю адлегласцю
Здадуцца ўсе гады,

Гады, што колісь доўгія
Былі, былі, былі.
А сум пад локаць тоўхае —
І кроплі на зямлі.

А кроплі тыя ў келіху
Свяціліся ў гульбе.
Хаціны сталі келлямі,
Дзе быў спакой табе.

Хоць блізкі шлях на могліцы,
Жагнай, адчай, ілбы.
Яшчэ буйносць намоліцца
На абразы журбы.

Знікае міжусобіца,
Дзе зло дало зарок.
Душа відушчай робіцца
І змрок
Губляе зрок.

●

А самых самотных на свеце двое —
Чалавек на зямлі
І на небе бог,
Ахінуўшыся даўніной сівою,
Звінаюць і развінаюць сувоі
Зямных трывог,
Нябесных дарог.

А чалавек, ён не бог,
Нябога,
Зямныя трывогі ягоныя ўсе.
Ён моліцца болей на поўны бохан
І, спадзяваючыся на бога,
Сваёй гадоўлі авец пасе.

Свае дарогі нябесныя ў бога
Выбоістыя, як Млечны Шлях,
Самотнаму дома сядзець убога,
Пасе перуна,
Як быка рабога,
Што можа рогі ўсадзіць наўзмах.

У госці б схадзіць
Аднаму да другога,
Не выпадае,
Няма калі.
Чалавек без бога не да парога,
Нялёгка з месца скрануць старога.

Вятры ўсе сцежкі пазамялі.
Адзін на небе,
Другі на зямлі,
Абодва маўчаць,
А над імі без шуму
Плывуць аблачыны іхняга суму...

●

Сівеюць сады маладой завірухай,
Вясной
Сівізной маладзеюць сады.
Жарон сваіх клопатаў рухай
І слухай,
Як цяжкай хадою
Ідуць халады.

Ідуць халады,
Каб забраць тваю восень,
І зазімак даць табе ў павадыры.
Прыкінь, памяркуй,
Што яшчэ засталося,
Каб мог ты абменьваць
Дары на дары.

Даўно ты растраціў
Пазыкі юнацтва,
Пачаўшы гадоў недачэпных запас.
І як ні хацеў бы
З самотаю знацца,
Сякерай яе не заторкнеш за пас.

Адно што
Знянацкай спагады сініца
Заценькае ў садзе
Між голых сукоў,
І будзе трылузіцца,
Мроіцца,
Сніцца,
Што ты багацён,
А не гол як сакол.

Апошняй надзеі зара-зараніца,
Хаціну святла свайго не замыкай.
Іскрынка імгнення,
Спагады сініца,
Звіні маім дням,
Не знікай,
Не змаўкай!

Агаворка

Хай даруе мне класіка гэта,
Калі
Выслоўе пасмею крыху з'іначыць:
Каб ведаць паэта,
Трэба пабыць на ягонай зямлі
І паэтаву маці пабачыць...

Ясенін слухае Чарота

Прасмішкі і кпіны,
Свой сцісніце рот,
Здзіўленне, заслухайся,
Дрогнуўшы.
У «Стойле Пегаса»
Міхась Чарот
Чытае Ясеніну
«Босых на вогнішчы».

Ясенін
Янку Купалу чуў,
І ў перакладзе чытаў

ПРОЗА

Ля возера з тэхнічнаю вадою

Леанід ГАЎРЫЛКІН

АПАВЯДАННЕ

У РАЗМЯКЛАЙ глейкай зямлі ля самай вады стаяў пахілены бетонны слупок, на ім — іржавая бляха з ледзь бачнымі літарамі: «Купацца забаронена. У возеры тэхнічная вада». Насупраць гэтага слупка пад маладымі бучнымі ліпкамі, што шнурком выцягнуліся паўз бераг, на доўгай блакітнай лаўцы з выгінастымі чыгуннымі ножкамі сядзеў Букевіч. Яму было гадоў пяцьдзесят, а можа, і болей. Яго бледны, крыху азызлы твар сведчыў, што чалавек большасць часу праводзіць у кабінеце. Валасы, яшчэ па-маладому густыя, пабіў рэдкі іней, а на скронях і зусім пабяліў іх. У блакітна-шэрым гарнітуры, у светлых чаравіках, пад сінім у белую крапінку гальштукам, ён быў зусім непадобны на тых гуляк, што зрэдку сноўдалі тут у расхрыстаных тэнісках і выцертых джынсах.

Управа ад возера выцягнулася высокая плаціна з зялёнымі крутымі адкосамі. Па ёй распласталася дарога, якая злучала горад з зарэчным мікраёнам. Пасярэдзіне плаціны быў мост, ля парэнчаў якога застойваліся людзі, каб пацешыцца пеністай вадой, што з гулам кацілася праз драўляныя заслоны.

Прама, на супрацьлеглым беразе сярод садоў, што засталіся ад прыватных сяліб, вытыркаліся ў сіняе неба белыя будынкі-кубікі.

Над вадой, нібы абрэзкі алюмініевай фальгі, узнятыя ветрам, пабліскваліі ўзрушаныя чайкі. Калі яны сядалі на ваду, то здаваліся чорнымі абломкамі моранага дрэва, што часам выкідвала вада на паверхню са сваіх глыбінь.

Крыху лявей, дзе і берага не было відаць, у нерухомай сінечы віселі белыя парусінкі.

Але нічога гэтага не бачыў Букевіч, хоць, прыжмурыўшы вочы ад шырокага разліву святла, і глядзеў перад сабой. Ён наогул быў зараз не тут, а ў сваім далёкім мінулым, якое поўнілася зусім іншым жыццём...

Тады не было тут ніякага возера з тэхнічнаю вадою, а была пакручаная мудрагелістымі петлямі рачулка ў зараслях асакі, густога вербалозу, і толькі там, дзе з паплавоў да рэчкі збягала сцяжынка, вада падыходзіла да самага мурагу, праз яе свяціўся жоўты пясочак, што рабаціўся ценямі ад малькоў, якія адгараваліся на сонцы.

На самым пачатку лета кустоўе аж стагнала ад салаўінага перапалу, а рачулка смачна пакрэктвала сытымі галасамі жаб, уздыхала ўсплёскамі спуджаных шчупакоў, бруілася крыніцамі, ад якіх набіралася прахалоды нават у спякотнае лета.

Паўз рачулку на высокім беразе прымасцілася невялічкая вёсачка. Хаты былі пад саломай і толькі зрэдку пад дранкай ці чарапіцай, драўляныя, пахілыя, з маленькімі слепаватымі вокнамі. Відаць, ставіліся даўно, калі людзі не былі багатыя на шкло і дрэва, а пра шыфер наогул нічога не ведалі. Ад некаторых хат выпіраліся на вуліцу агародчыкі з разбуялым бэзам, з купкамі ружовых і белых мальваў, з выгоністым любісцікам, з якога малыя любілі выразаць трубкі аблівачак. За хатамі, за дварамі, заваленымі дрывамі, кучаравіліся сады, зелянелі вузкія палоскі бульбы ўперамешку з пажаўцелым жытам і блішчастым просам.

Жылі ў той вёсцы ўжо не вяскоўцы, а гарадскія людзі, бо амаль усе яны рабілі на заводах і фабрыках вялікага горада, які быў побач, а дзеці іх вучыліся ў гарадской школе.

У той вёсачцы і пачынаў сваё жыццё Букевіч, Мікалай Пятровіч Букевіч, а тады — проста Колька...

Калі Букевіч думаў пра сваю вёску, пра сваё жыццё ў ёй, то кожны раз успамінаў адзін і той жа момант, і не з дзяцінства, хоць яно захавалася ў памяці да драбніц, а з юнацтва, а больш дакладней, з тае пары, калі яно толькі пачыналася.

Сядзеў тады Колька з вудай на тоўстых счарнелых каранях вербалозу і не зводзіў вачэй з ружовага, выразанага з тоўстай сасновай кары, паплаўка.

— Бярэцца? — нечакана пачулася за спіной. Азірнуўся і ўбачыў Лілю. Невысокая, не па сваіх гадах паўнаватая, у кароткім жоўтым плацейку, якое не закрывала і каленяў. Па адзенні дык яшчэ і не падлетак, а дзіцянё, бо тады толькі дзеці так выстаўлялі свае ногі. На бялявай галоўцы жаўцеў вяночак з люцікаў. Ахапак такіх жа кветак яна трымала ў руках. Ён добра ведаў Лілю. Дзецьмі яны разам ладзілі гульні, пасвілі на лузе коз, хадзілі на забалочаныя старыцы па белыя гарлачыкі, вучыліся ў адным класе, але зараз ён нібы ўпершыню ўбачыў яе. Можа, такое было ад таго, што яна з'явілася нечакана, ці таму, што занадта багата жоўтага было на ёй і гэтым яна ўразіла яго, як уражвае нечаканы сонечны прамень у шэрай хмурнасці дня.

— Ды трохі, — запознена адказаў ён.

— Як прыгожа! — не зводзіла яна з яго сваіх вялікіх блакітных вачэй.— Я прысяду тут. Можна?

— Давай, — неяк разгублена буркнуў ён.

Яна прысела на цёплую траву, падагнуўшы пад сябе ногі, моўчкі пляла нешта з люцікаў. Атрымалася высокая шапка з жоўтым кудлатым чубчыкам зверху. Ліля паднялася, абцерушыла падол ад наліплых травінак і пялёстак, падышла да Колькі і пасадзіла тую шапку з халаднаватым каляным абручыкам на яго выгаралую пад сонцам бялявую галаву.

— Як папуас, — засмяялася яна паправіла. — Дай палавіць...

Ён моўчкі перадаў ёй вудзільна, адсунуўся ўбок, саступаючы ёй месца. Ён разумеў, што трэба нешта сказаць, ну хоць бы пра тое, што рабіць, калі закалышацца паплавок, але раптам усе словы зніклі ў глыбіні яго памяці, як тая рыба ў цёмнай вадзе, калі зрываецца з кручка.

— Ой, я і забылася, — раптам яна кінула вудзільна, падхапілася. — Мне ж дамоў трэба. Мама казала травы прынесці казе.

— Каза ж на пашы, — знайшоўся Колька.

— На зіму сушым. Мама казала, каб кожны дзень насіла, — яна кіўком галавы адкінула з ілба пасмачку валасоў, потым яшчэ і памацала яе рукой, праверыла, ці лягла тая на сваё месца.

Надоечы.
Цяпер,
Санцавейны свой сцішыўшы чуб,
Беларускую мову
Слухае стоячы.

Кажы,
Пераскочыўшы рэчку, гоп.
Беларускую —
Белую, незачэрненую
Зразумець і не тужыцца
Марыенгоф,
Ясенін
Жытнім словам вячэрае.

Прыцмоквае:
— Лепшы.
А тут за рукаў
Разанскі «леший»
Па-свойску тузае.
Ці гэта мядзведзь,
Ці пярун зарыкаў,
Ці чарацінка
Зайшлася музыкай.

А ў кожным слове
Свой смутак, свой боль,
Ясенін смяецца ўзрадавана:
— Хоць ён не імага,
Як мы з табой,
Паэт сапраўдны,
А значыць — брат ён нам...

І хоча Пегас
Перапасці брод
У рэчцы
Забытлівай вечнасці.
На беразе двое —
Гаротны чарот
І клён неапалы,
Сонцам прасвечаны...

Дыпціх прысвячэння

Міхасю СТРАЛЬЦОВУ

I

Імшэюць нашыя дамы,
Прытулкі радасці,
Дзе мы
Саміх сябе пачуць хацелі.
Глушэюць нашыя грамы,
Што нас маглі
З глухой зімы,
Як тую рунь,
Падняць з пасцелі.
Цішэюць нашыя дымы —
Працяг зялёнае думы
Смалістай баравой арцелі.
Вайна перадала шрамы
Надскепам бліскавіц,
Траншэям.
Не верыцца, што гэта мы
Імшэем,
Глушэем,
Цішэем.

II

Да грамніц пільнуйся рукавіц!
Ты азваўся свету на грамніцы.
За драты калючых бліскавіц
Браўся галаруч
І навальніцу
Запрашаў паслухаць цішыню,
Ды ў адказ і цішыня грымела.
Дазваляў пад сэрцам грэцца дню,
Перапісваў прызімак набела.

Кідаў рукавіцу перуну,
Прэчыў асцярожнасці законы,
Пазычаў у пеўня пер'іну
Смутны,
Неадумны,
Рызыкоўны,
Каб у сшытку неба
Млечны сказ
Перакрэсліць
І пачаць пра тое,
Як, ад нас уцёкшы,
Просіць час
У спагады даўняга пастою.

Час каня забытнасці вядзе,
Прымярае конь
Старую збрую.

На грамніцы дадзена вадзе
Зноў успомніць
Сілу маладую.

Снежная казка.

Фотаэцюд М. БЯЛЬКОВІЧА.

Потым Колька прыкмеціў, калі дзяўчына хацела схаваць сваё засмучэнне, яна заўсёды рабіла так.

Хоць акунькі яшчэ браліся нядрэнна, яму ўжо не хацелася рыбачыць, не хацелася заставацца тут аднаму. І рачулка, якая яшчэ зусім нядаўна вабіла яго глыбокім небам у сабе, фіялетавымі швайкамі, што таўкліся над вадой, санлівым шапаценнем прыбярэжнай травы, раптам страціла нешта такое, без чаго зрабілася апусцелай і сумнай. Ён сядзеў, глядзеў на паплавок, на ваду, а ў думках было неяк непрывычна трывожна, з ім рабілася нешта незразумелае, раней нязведанае, ад чаго так соладка замірала сэрца.

Колька зматаў вуды, скіраваў дамоў. Пайшоў не напрасткі, як хадзіў звычайна, а, даўшы кругаля, паўз канаву, дзе ўсе рвалі траву сваім козам. Там Лілі не было.

Дзяўчына сядзела на лавачцы ля свайго двара з кнігай на каленях. Чытала.

— Багата налавіў? — Ліля сама зачапіла яго.

— Ыгы.

— Можа б, мяне навучыў?

— Пайшлі заўтра. Я вазьму і на цябе вуду.

— Калі дожджыка не будзе, — і залілася смехам.

— Я сур'ёзна.

— Я таксама.

Пасля абеду Колька нікуды не пайшоў, хоць сябры і клікалі яго ў лес ганяць барсукоў, — перад гэтым яны знайшлі барсуковыя норы, — а, схаваўшыся ў дрывотніку, ледзь не да вечара правалаводзіўся, робячы дзяўчыне вудзільна. Хацеў, каб яно было лёгкае, зграбнае, прыгожае. Падабраў самы лепшы кручок, навастрыў яго, з сасновай кары зрабіў паплавок у выглядзе кветкі і пафарбаваў яго ў белы колер. Паплавок атрымаўся, як маленькі гарлачык. За хлявом на сметніку накапаў чарвякоў. Чарвякоў не браў усіх запар, як звычайна, а толькі невялікага памеру, пругкіх і зграбных, каб яны прыгожа віселі на кручку.

Назаўтра ранкам, калі і сонца яшчэ не паднялося, збіваючы босымі нагамі пякучую расу, ён падаўся да ракі на сваё ўчарашняе месца...

Вось і сонца паднялося высока, і ўжо рыба не бралася, а дзяўчыны ўсё не было. Можа, заспала? Але ж не можа яна спаць увесь дзень? Можа, маці загадала рабіць што пільнае? Тады зробіць, што трэба, і прыбяжыць. Вядома ж, прыбяжыць. Сама ж напрасілася рыбачыць. Але не дачакаўся ён яе. Дамоў пайшоў учарашняй дарогай. Дзяўчыны не было на канаве, не было на лузе, дзе пасвіліся козы, не сядзела яна і ля двара з кнігай. Сустрэў ён яе толькі пад вечар, калі нёс з рэчкі ваду паліваць агуркі — усе палівалі грады толькі рачной вадой, а не з калодзежа, у якім вада была занадта халодная для раслін. Ліля бегла яму насустрач з парожнім вядзерцам. Мокры падол яе кароценькага плацця прыліпаў да ног. Відаць, яна збегала на рэчку ўжо не адзін раз.

— А я чакаў, — нібы паскардзіўся ёй.

— Я з сяброўкамі ў кіно хадзіла.

— Сказала б...

— Я яшчэ магу схадзіць. Вельмі красівы фільм.

Ён узрадаваўся, што яна захацела пайсці з ім у кіно, а яшчэ болей узрадаваўся, што яна пайшла не адна, а з сяброўкамі, бо баяўся, што не знойдзе пра што гаварыць з ёй. А так ён быў з ёй, нават у кінатэатры сядзелі побач, але яна, здавалася, не заўважала яго, больш шчабятала з сяброўкамі. Калі ж у цемры, пранізанай рухавымі промнямі, ён паглядаў на дзяўчыну і, сустрэўшы позірк яе бліскучых вачэй, убачыўшы на яе твары палахлівую хуценькую ўсмешку, адчуваў, як у яго грудзях усё захлынулася так, што, здавалася, вось-вось спыніцца дыханне...

Потым яны яшчэ не адзін раз хадзілі ў кіно, — яна заўсёды была з сяброўкамі, — не адзін раз, збіраючыся гуртам — хлопцы і дзяўчаты,— хадзілі ў лес у грыбы, а потым штодня разам хадзілі ў гарадскую школу, і ніколі яны не заставаліся адны, але заўсёды адчувалі паміж сабой узаемную зразумеласць, нейкую своеасаблівую роднасць, яшчэ больш хвалюючую, што пра гэта ніхто не ведаў і не здагадваўся.

Наогул, яго закаханасць у дзяўчыну расла паступова і натуральна, як і ўсё навокал, — трава, кветкі, дрэвы, як цякла іхняя рэчка, паступова набіраючы паўнаводнасць і сілу цячэння. І яно, каханне, здавалася, ва ўсякім разе яму, чыстым і бясконцым. Ён быў перакананы, што Ліля таксама адчувае ўсё якраз так, як і ён, таму і гаварыць пра гэта не было патрэбы. Не гаварылі яны пра свае пачуцці нават пасля выпускнога вечара, калі яны, схадзіўшы разам з усімі развітацца з горадам, вяртаючыся дамоў, адсталі ад усіх, потым яшчэ доўга сядзелі на лавачцы ля яе двара... Не, яны моўчкі не сядзелі, гаварылі. Праўда, больш гаварыў ён.

То быў час, калі людзі жылі нялёгка. Яшчэ не зусім загаіліся раны нядаўняй вайны, яшчэ толькі прывыкалі да міру, таму захапляліся простым і звычайным у жыцці, спявалі пра залатую пшаніцу, хоць і елі дрэнна, спявалі пра яблыневы цвет, хоць і высякалі сады. Акрыленыя першымі зрухамі да лепшага, марылі пра яшчэ больш сонечнае заўтра. Жыў тады болей сваімі марамі пра будучае жыццё, вучобу, працу і Колька.

— Гэта ж толькі падумаць, — разважаў ён. — Не так даўно вось такім ранкам абудзілі цішыню фашысцкія бомбы. Нашы равеснікі з выпускных вечароў ішлі ў ваенкаматы... Многія не дажылі да перамогі. Дык як жа мы павінны жыць, працаваць, радавацца, каб...

Ліля стрымана засмяялася.

— Я не так гавару? — насцярожыўся юнак.

— Не, гэта я ўспомніла, — і пазяхнула.

Зараз Букевіч не мог дакладна ўспомніць, ці адразу пасля першай сустрэчы з Ліляй, ці пазней усё тое, чым ён жыў да гэтага, раптам страціла ўсялякую вартасць, зрабілася нязначным і нецікавым. Цяпер яго жыццё, сэнс жыцця, вызначаліся сустрэчамі з дзяўчынай. Усё ж тое, што было між сустрэчамі, — і рыбалка, і гульні з сябрамі, і прачытаныя кніжкі, — успрымалася як сумная неабходнасць, адышло на другі план...

Асабліва гэтае адчуванне ўзмацнілася пасля заканчэння школы. Ён добра помніў тое лета. Яна рыхтавалася ў інстытут, ён чакаў позвы ў ваенкамат. Яны не сустракаліся так часта, як раней, калі хадзілі ў школу. Яна тлумачыла яму, што бацькі не дазваляюць доўга гуляць, бо тады не высыпаюся, дрэнна рыхтуюся да экзаменаў. У яго не хапала цярпення дачакацца прызначанага спаткання. Ён днямі мог сядзець на вуліцы ля свайго двара, сачыць, калі яна пойдзе вады да калодзежа, каб хоць здаля ўбачыць яе.

Калі ж перад адыходам у армію яму дома наладзілі развітальную вячэру, — тады гэтыя вячэры былі сціплыя, не такія шматлікія, як цяпер, на іх запрашалі толькі самых блізкіх родзічаў, — Колька не адважыўся запрасіць Лілю. Але маці сама загадала яму схадзіць па дзяўчыну, маўляў, хавацца нечага, усё роўна ўсе даўно пра ўсё ведаюць.

Пасля вячэры ён праводзіў дзяўчыну дамоў.

Было па-асенняму ядрана. Месяц ліў такое святло, што і зорак не было відаць. Поле заінела ад буйной вераснёўскай расы. Стальной стужкай блішчэла рэчка. Стаяла такая цішыня, якая і бывае толькі ўвосень. Нават сабакі не гаўкалі, схаваўшыся ў заціішных будках ад начной зябкасці.

Мікола не адзін раз бачыў такімі і поле, і рэчку, і сваю прыціхлую вёску, але цяпер нібы ўсё гэта ўпершыню адкрыў для сябе, адкрыў якраз тады, калі з усім гэтым трэба развітвацца.

— Прыгожа... — уздыхнуў ён. — Можа, сходзім у поле?

Яна не адказала. Ішла моўчкі, затуліўшыся з рукамі ў вязаную шарсцяную кофту. Ля свайго двара спынілася, глянула на хлопца дапытлівым позіркам.

— Мае недзе спяць.

— Баішся разбудзіць? — сказаў першае, што трапіла яму на язык.

— Я ў сенцах сплю. Дзверы яны ніколі не замыкаюць. А калі і замкнуць, я ведаю, як адамкнуць, — яна памаўчала. — Там у мяне ўтульненька, цёпленька. І нават свой уласны цвыркун. Як толькі лягу, так ён і пачынае — цур-цур... Не верыш?

— У мяне таксама цвыркун, — ён прыхінуў яе да сябе. Яна паслушна падалася. Маўчала. Маўчаў і ён, прыслухоўваючыся да яе частага дыхання.

— Ой, ногі замёрзлі, — скаланулася яна.

— Прысядзем на лавачку, — і калі яна ўселася, ён затуліў яе ногі ў свой пінжак. — Так цёпленька?

Яна нічога не адказала.

— Вярнуся, а ты ўжо тры курсы інстытута скончыш, — сказаў ён. — Не даганю цябе потым...

(Працяг на стар. 10).

ТЭАТРАЛЬНЫЯ ДАЛЯГЛЯДЫ

«ТЭАТР У ПРАПАНАВАНЫХ АБСТАВІНАХ» — пад такой назвай 29.XII.1985 г. наш штотыднёвік змясціў дыялог кіраўнікоў Дзяржаўнага рускага тэатра БССР імя М. Горкага — дырэктара Э. Герасімовіча і галоўнага рэжысёра В. Маслюка. У дзелавой і зацікаўленай гутарцы быў закрануты шэраг надзённых пытанняў тэатральнага жыцця. Нагадаем некаторыя з іх...

Ці адпавядаюць арганізацыйныя і творчыя ўмовы, у якіх існуе тэатр, патрабаванням сённяшняга дня? Ці даюць яны сцэнічным калектывам пэўную самастойнасць у вырашэнні сваіх праблем? Ці ў поўнай меры спрыяюць выкананню пачэснай і адказнай місіі тэатральнага мастацтва ў сучасным грамадстве?

Мы запрасілі практыкаў сцэны, спецыялістаў у галіне кіраўніцтва тэатральна-відовішчнымі прадпрыемствамі прыняць удзел у абмеркаванні пытанняў.

Сёння ў гаворку ўключаецца галоўны рэжысёр Рэспубліканскага тэатра юнага гледача У. КАРАТКЕВІЧ.

Уладзімір КАРАТКЕВІЧ,
галоўны рэжысёр Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача імя 50-годдзя камсамола Беларусі.

ЧАС ПЕРАМЕН І АДКАЗНАСЦІ

ПРАПАНОВЫ, думкі, меркаванні, выказаныя ў дыялогу кіраўнікоў Рускага тэатра БССР імя М. Горкага, падтрымліваю і падзяляю, як кажуць, цалкам і поўнасцю. Незадавальняючыя «прапанаваныя абставіны» павінны быць зменены, і як мага хутчэй. Практыкі тэатра, спецыялісты ў галіне эканомікі і арганізацыі тэатральнай справы гавораць пра гэтыя праблемы апошнія дзесяць-пятнаццаць гадоў на ўсялякіх семінарах, нарадах, у друку ці проста ў гутарках. Прыкра, што над усім панує лічба, што існуючая сітуацыя зручная для пасрэдных п'ес, рэжысёраў і акцёраў, што гасне творчая ініцыятыва... Завядзёнцы гэтай не адзін год, пра яе ўсе ведаюць, ды пакуль што ад слоў да справы мы не пераходзім. Так, трэба, каб у вытворча-фінансавым плане былі толькі дзве пазіцыі: колькасць гледачоў і прыбытак; так, кіраўнікі тэатра павінны мець права самастойна мяняць штатны расклад; так, толькі нам самім вырашаць, колькі і калі выпускаць спектакляў...

Напрыклад, сёння нашаму тэатру патрэбны асістэнт рэжысёра, каб хутчэй увесці ў спектаклі новых выканаўцаў замест акцёраў, якія перайшлі ў Маладзёжны тэатр БССР; патрэбны спецыяліст па беларускай мове і яшчэ адзін педагог; неабходна новая сістэма аплаты акцёрскай працы. Трэба, трэба, неабходны...

Змены наспелі — гэта бясспрэчна. Але хочацца, каб усе новыя рашэнні былі належным чынам прадуманы і як след узважаны. Мы павінны дакладна ведаць, як гэтыя змены адаб'юцца на творчых калектывах, на акцёрах—людзях, а не проста функцыянерах.

Тут дарэчы будзе сказаць, што мець сёння адзіны беларускі тэатр юнага гледача — няхай сабе нават і адзіны ў свеце — мала. Вельмі мала, калі ўлічыць рэзкае амаладжэнне тэатральнай аўдыторыі.

АЛЕ ўявім сабе, што адбыліся змены ў вытворчай дзейнасці тэатраў, у аплаце яго работнікаў. Што яшчэ трэба вырашаць разам з рэформай? У прыватнасці, у нашым дзіцячым тэатры?..

Трэба рашуча мяняць сістэму культпаходаў у Тэатр юнага гледача. Вядома, залежыць гэта ад нас, як мы запрашаем гасцей. Як мы прадаём білеты, але і без зацікаўленасці школ, педагогаў, бацькоўскіх камітэтаў нам не абысціся. Педагагічныя навыкі неабходна прывіваць тым, хто прадае білеты, гэтаксама як і тэатральныя азы — выкладаць тым, хто вучыць дзяцей. Тады для школьнікаў прагляд спектакля не будзе дзевятым ці дзесятым урокам, тады тэатр не будзе, як сведчаць сацыёлагі, займаць адно з апошніх месцаў сярод дзіцячых захапленняў і прыхільнасцей побач з наведваннем мастацкіх выставак і філарманічных канцэртаў.

Усё пачынаецца з дарослых — настаўнікаў і бацькоў. Рашучага павароту да мастацтва, да тэатра вымагае рэформа школы, але пакуль што мы не адчуваем сапраўднай зацікаўленасці. Ёсць сябры тэатра, ёсць нашы прыхільнікі, але ўвогуле адносіны тэатра і школы, школы і тэатра застаюцца фармальнымі. Калі хлопчыкі і дзяўчынкі, як кажуць, «не прымаюць» тое, што адбываецца на сцэне, у гэтым, найперш, вінаваты мы. Мабыць, не тую п'есу ўзялі ў рэпертуар, не так паставілі спектакль, не тымі тэатральнымі сродкамі карысталіся. Па-другое, вінаваты дарослыя, якія не зацікавілі падлетка тэатральным мастацтвам, не падрыхтавалі да сустрэчы з ім, не растлумачылі ягоных прынцыпаў. На мой погляд, адбыўся нейкі перапынак у развіцці глядацкай культуры. Бацькі і настаўнікі адышлі ад тэатра гадоў дзесяць-пятнаццаць назад і прыводзяць на спектаклі сваіх дзяцей і вучняў, як правіла, абыякава, выпадкова, па абавязку, а не па сэрцы. Таму, што так трэба, а не таму, што хочацца. Мы адкрылі тэатральны універсітэт для бацькоў, семінар для кіраўнікоў школьнай самадзейнасці, клуб аматараў тэатра і шэраг іншых форм тэатральнага «лікбезу», але гэта кропля без актыўнай і сяброўскай дапамогі з боку школ і бацькоў.

А ПАМЯШКАННЕ, якое займае сёння ТЮГ, — хіба гэта не праблема? Дакладней адсутнасць яго... Цяпер яно хутчэй нагадвае кінатэатр, толькі са славутай «вешалкай». Юны глядач наведвае тэатры імя Я. Купалы і музычнай камедыі, наш глядач бачыць інтэр'еры кінатэатраў «Масква» і «Кастрычнік», а потым трапляе да нас. Розніца відавочная. Нецікава, блякла, а галоўнае, — як створыш у такіх умовах атмасферу святочнасці і прыўзнятасці. Цесна, цесна, яшчэ раз цесна! Вялікія надзеі ўскладаем на капітальны рамонт, але памяшканняў новых мала атрымаецца, таму жыццё вымагае прасіць перадаць нам некалькі пакояў Дома піянераў, часткай якога, дарэчы, мы з'яўляемся.

ШТО такое сучасны спектакль для дзяцей? Да якой мяжы мы можам паглыбляцца ў складанасці жыцця, якія тэатральныя сродкі павінны ўжываць, якая мера ўмоўнасці і праўды, якая эстэтыка, якія рытмы? Якім патрабаванням павінен адпавядаць першы спектакль, які хлопчык ці дзяўчынка ўбачаць у сваім жыцці? На ўсе гэтыя і безліч іншых пытанняў трэба знайсці адказ рэжысёру дзіцячага тэатра. Але ў першую чаргу ён павінен сумленна працаваць не для дарослых, не для сяброў і крытыкаў, якія могуць пахваліць яго за фантазію, вынаходлівасць у мізансцэнах, за рэжысёрскія метафары, — а для сённяшняга маленькага гледача з яго мінімальным веданнем тэатра, з яго вялікім «кінатэлевопытам», з дасведчанасцю ва ўсялякіх сучасных эстрадных плынях. На жаль, сёння ў нас здабыткаў мала. І ў мяне, і ў калег з іншых тэатраў юнага гледача...

На Генеральнай асамблеі АССІТЭЖ, калі ў Маскву з'ехаліся дзеячы тэатра для дзяцей і юнацтва з усяго свету, мы глядзелі лепшыя спектаклі тюгаў краіны. Шмат было цікавага, але сапраўднага ўзрушэння не ставала, дый за мінулы пасля Асамблеі год таксама не здарылася нічога, на мой погляд, адметнага... Канцэпцыя сённяшняга спектакля для дзяцей яшчэ не склалася... Вось чаму так неабходны сумесныя намаганні крытыкаў і практыкаў, ці то канферэнцыі, ці то дыскусіі, ці то фестывалі. Да ўдзелу ў іх варта запрасіць і

ЛЯ ВОЗЕРА З ТЭХНІЧНАЮ ВАДОЮ

(Працяг. Пачатак на стар. 8—9).

Наогул у тую ноч яны амаль не гаварылі. Болей маўчалі. Нават ён, які любіў памарыць услых, не ведаў, што сказаць. Як ветрам выдзьмула ўсё з галавы. Яна таксама маўчала, толькі часта і стоена ўздыхала, тулячыся да яго.

— Світае, — агледзеўся ён. — Восень, а такая кароткая ноч...

— Пры чым тут ноч? — хмыкнула яна, нібы хацела ўпікнуць яго ў нечым, паднялася, падала яму пінжак, які ўпаў з ног на траву. — Не замёрз сам? Не ўяўляю, які з цябе будзе салдат, — і засмяялася.

У тым смеху было нешта такое, чаго ён ніколі не заўважаў раней і ад чаго яму стала няёмка. За сябе. Ён доўга помніў той смех, і доўга не мог зразумець, чаму яна раптам усумнілася, што з яго атрымаецца добры салдат.

А хутка ён ужо ляжаў на верхняй лаўцы старога скрыпучага вагона і не адрываў вачэй ад пазалочаных восенню пералескаў, ад чорных палёў з шэрымі сціртамі саломы, і думаў пра Лілю. Яго не пакідала адчуванне, што яны так і не сказалі адно аднаму самага галоўнага, патрэбнага, без чаго ў іх адносінах не стае нечага вельмі істотнага. А, можа, такое адчуванне было ад нечаканай ростані, — ростані заўсёды нечаканыя, яны нават нечаканыя і тады, калі пра іх ведаюць загадзя, — ад суму...

Вось за акном пачалася ноч і ён ужо нічога не бачыў, акрамя расплывістага ў няроўным шкле адбітка купэ, таварышаў, што сядзелі на ніжніх лаўках... Вось адзін з іх, худы, доўгі, з абстрыжанай, як і ўсе, вузкай сіняватай галавой, узлез таксама на верхнюю полку і бадзёра, пераймаючы інтанацыю капітана, які іх суправаджаў, спытаў:

— Што засумаваў, друг? Маці? Бацька? ...Яна?

— Яна.

— Жонка?

— Не-е.

— Хэ, знайшоў па кім сохнуць. Яшчэ не адну сустрэнеш.

Мікола толькі ўздыхнуў.

— Адзіная?..

Мікола, як гэта часта бывае ў дарожных умовах, не тоячыся, усё расказаў пра Лілю.

— Ведаеш, што? — прыўзняўся, абапёршыся на локці, сусед, насмешліва глянуў на Міколу сваімі глыбокімі, як у мядзведзя, вочкамі. — Гэта ўсё дзіцячыя гульні. Я з дачкой суседа, ведаеш, што?.. Сама бегала. Пазвоніць, спытае, ці адзін дома, і грукае ў дзверы. Вось так... А ты кніжачкі, кіно... Але не журыся. Яшчэ сваё возьмеш. Будзеш першакласным рубакам. Па вітрыне відаць... Можа, хочаш падыміць перад сном?.. І курыць не навучыўся? Ну і даеш!.. Навучышся таксама. У жыцці ўсяму навучышся, — заключыў ён голасам чалавека, які зведаў усё, і падаўся ў тамбур...

Болей Мікола ніколі і нікому не расказваў пра сваё каханне. А пісьмы ад Лілі хаваў на самым дне свайго чамаданчыка. Тым больш, што іх няцяжка было хаваць. Ліля пісала рэдка. Раз у месяц, а то і меней. Ён жа пісаў ёй заўсёды, калі толькі выдавалася вольная хвіліна. Сябры яго празвалі пісьмапісцам, а камандзір прызначыў рэдактарам насценнай газеты «Вернасць абавязку».

Калі Мікола быў ужо на другім годзе службы, пачалося асваенне цалінных зямель. Салдаты ўсё часцей і часцей гаварылі, каб усім разам паехаць на цаліну. Ехаць ці не ехаць,— такога пытання для Міколы не было. Ён толькі і жыў тым, каб болей карысці прынесці Радзіме, тым больш, што ў арміі, як ён лічыў, нічога значнага яму так і не ўдалося здзейсніць: служыў, як і ўсе. І вось сама гісторыя ішла яму насустрач. Пра гэта ён і напісаў Лілі: «Помніш, мы некалі марылі пра значнае ў жыцці, шкадавалі, што найбольш вялікія падзеі адшумелі без нас. Дарэмна мы так думалі. У кожнага пакалення ёсць свой абавязак перад гісторыяй. Для нас — цалінныя землі. Упэўнены, што там нас чакае сапраўднае шчасце. Мы ніколі не даруем сабе, калі апынемся на абочыне гісторыі, не адчуўшы яе гарачага дыхання...»

Ліля адказала яму вельмі коратка: «Калі і куды выязджаць?»

Гэта было яе апошняе пісьмо.

Неўзабаве ён атрымаў вестку, што Ліля выйшла замуж. Яго так уразіла гэтая нечаканасць, што ён вырашыў ніколі ў жыцці не вяртацца дамоў. Відаць, пасля арміі ён адразу б і паехаў на цаліну, каб бацькі не напісалі, што іх вёску знеслі, а жыхароў рассялілі па ўсім горадзе. Ён прагасцяваў у бацькоў ледзь не тыдзень, тым больш, што не трэба было хадзіць па той вуліцы, дзе выспела такая здрада яму.

Потым была праца механізатара ў адным цалінным саўгасе, камсамольская работа, вучоба ў Маскве... Імкліваe і клапатлівае жыццё завіхурыла яго так, што не было калі нават успамінаць пра мінулае...

Але з узростам усё часцей і часцей успаміналася дзяцінства, маладосць, і нарэшце, пацягнула наведаць тыя мясціны, дзе ўзыходзіла яго жыццё. І цяпер кожны раз, калі ён прыязджаў у родны горад і калі яму выпадала вольная часіна, ён браў машыну, ехаў туды, дзе раней стаяла яго вёска, машыну пакідаў на шашы адразу за возерам, а сам ішоў паўз ваду, усаджваўся на доўгую блакітную лаўку на выгінастых чыгунных ножках...

Ён глядзеў на шырокі абсяг вады так, нібы верыў, што свет яго дзяцінства жыве не толькі ў яго памяці, а недзе і пад тоўшчай вады, і , можа, нават з'явіцца перад вачыма таго, хто вельмі верыць у яго існаванне... Што тычылася Лілі, то яму здавалася, яна наогул сочыць за ім. Часам ён нават адчуваў на сабе яе ўчэпісты позірк. Гэта ён тлумачыў надзвычай ужо яркімі ўспамінамі пра той даўні свет, які, аказваецца, застаўся непадуладным часу і заўсёды маладым. Успамінаючы яго, і сам Букевіч быццам маладзеў тут, на беразе возера з нежывой тэхнічнай вадой, зноў трапляў у светлы палон юначых парыванняў, радаваўся, што не здрадзіў ім, пранёс праз усё жыццё. Хай не ўсё рабіў так, як марыў, але заўсёды імкнуўся да гэтага. Яго юначыя мары былі яму тым падмуркам, на якім, аказваецца, трымаўся яго цяперашні духоўны свет, упэўненасць і вера ў жыццё. Мінулае для яго было тым баластам на караблі, што памагае адолець любыя штормы ў акіяне жыцця. Мінулае для яго было і асабліва стала цяпер тым камертонам, да якога ён прыслухоўваўся, каб у ягонай душы не загучалі раптам фальшывыя ноткі...

рэжысёраў, якія ставяць дзіцячыя спектаклі ў «дарослых» тэатрах рэспублікі. Мабыць, прыйшоў час сабрацца разам, паглядзець спектаклі калег і разам з крытыкамі абмеркаваць нашы здабыткі, адкінуць старое, пазначыць шляхі пошукаў...

ХТО мае права іграць для дзяцей, хто можа выйсці на сцэну перад маленькім гледачом? Хто ён, акцёр дзіцячага тэатра?

Таленавітая асоба і высокі прафесіянал. Ён павінен разумець сучаснага падлетка, яго клопаты і радасці, крыўды і надзеі, яго густы, захапленні. І не толькі разумець, але сэрцам адгукацца. Наш глядач не выносіць фальшу, падману — і ў вялікім, і ў малым. Імгненна рэагуе смехам, гулам, рэплікамі...

Акцёр, які забыў сваё дзяцінства, не адчувае праблем маленькага гледача, нудзіцца ў дзіцячай аўдыторыі, не павінен працаваць у дзіцячым тэатры. Тут могуць служыць толькі адданыя рыцары Дзяцінства і Юнацтва.

КОРАНЬ усіх нашых бед — адсутнасць сапраўды таленавітай дзіцячай п'есы. Сучаснай, праўдзівай і цікавай... Агульная мясціна ў выказваннях усіх рэжысёраў — «няма п'есы», ды вымушаны быць неарыгінальным, бо гэта так. Амаль усё, што даводзіцца чытаць — далёка ад жыцця сённяшніх дзяцей і асабліва падлеткаў.

Памятаю, як В. Розаў амаль кожны год даваў тэатрам п'есу. Спачатку ён дапамагаў мне асэнсаваць жыццё як гледачу, потым, ужо акцёр, я выконваў ролі ў ягоных творах, атрымліваючы вялікае задавальненне ад цішыні і разумення залы. Нарэшце, як рэжысёр, я чакаў яго новых п'ес. Час «розаўскіх хлопчыкаў» мінуў, а што ўзамен? Колькі год назад яшчэ можна было выбіраць з п'ес А. Алексіна, Г. Палонскага, Г. Мамліна, І. Шамякіна, К. Губарэвіча... Сёння ж школьнікі вымушаны знаходзіць герояў у іншых відах мастацтва. Праблема сучаснай п'есы для ТЮГа паўстала надзвычай востра, ды ніхто — ні сталыя майстры, ні маладыя драматургі — не спяшаюцца яе вырашаць.

ЯШЧЭ прапановы... Лічу, што дзеля прапаганды тэатра сярод моладзі трэба больш актыўна выкарыстоўваць магчымасці друку, радыё і тэлебачання. Хацелася б бачыць тэатральны аналаг «Кінатыдня Мінска». Ёсць, вядома, «Тэатральны Мінск», ды яго можна купіць, калі ўжо знаходзішся ў тэатры, а дзе атрымаць папярэднюю інфармацыю пра пастаноўкі? Гэтаксама і на блакітных экранах магла б з'яўляцца рэгулярная перадача, накшталт «Спадарожніка кінагледача». Трэба расказваць пра ўсе новыя спектаклі ў рэспубліцы, каб тэатралы ехалі на прэм'еры ў Мінск з іншых гарадоў, а мінчане імкнуліся паглядзець цікавы спектакль у Гродне, Віцебску, Гомелі, ці ў Брэсце...

НА заканчэнне — яшчэ адзін успамін пра XIII Генеральную асамблею АССІТЭЖ. На пасяджэнні адной з секцый у дзень дыскусіі мы горача спрачаліся, як трэба сфармуляваць праблему: «Рэжысёр — гэта выхавацель калектыву і пастаноўшчык спектакляў» ці «Рэжысёр — гэта пастаноўшчык спектакляў і выхавацель калектыву»... Слухаў-слухаў нас рэжысёр з Іспаніі і сказаў прыблізна так: маўляў, мне б вашы клопаты, у кожнага з вас ёсць свае памяшканні, прыбіральшчыцы чысціню наводзяць, а я прыеду на радзіму і буду зноў шукаць пляцоўку для спектакля і грошы на дэкарацыі... А на апошнім пасяджэнні Асамблеі адзін партугальскі рэжысёр звярнуўся з просьбай прыняць зварот да ўрада Партугаліі, каб не зачынялі дзіцячыя тэатры...

Сёння мы патрабуем змен, патрабуем справядліва... Ды павінны ўсведамляць і адказнасць за вялікія магчымасці, якія зараз маем у руках, і за тыя, што з'явяцца ў выніку перабудовы тэатральнай справы.

ВІНШУЕМ

Аляксандру МЕЛЬНІКАВУ — 50

7 студзеня спаўняецца 50 гадоў паэту Аляксандру Мельнікаву. З нагоды юбілею праўленне СП Беларусі накіравала яму прывітальны адрас, у якім гаворыцца:

«Дарагі Аляксандр Пятровіч!

Сардэчна віншуем Вас з пяцідзесяцігадовым юбілеем!

Вы нарадзіліся ў вёсцы Васількі Бялыніцкага раёна. Любоў да родных мясцін, да працы перадаліся Вам ад вашых бацькоў, якія ўсё жыццё прарабілі на зямлі, ад землякоў, працалюбівых і шчырых людзей.

Закончыўшы Галаўчынскую дзесяцігодку, а затым Ленінградскі медінстытут, Вы вярнуліся на родную Магілёўшчыну, дзе працуеце ўрачом да гэтага часу.

Яшчэ са школьных гадоў Вы спрабавалі свае сілы ў паэзіі.

Тыя дзве кніжкі паэзіі «Спасибо, жизнь» і «Три слова», якія ўбачылі свет у апошнія гады, і Вашы шматлікія публікацыі ў перыядычным друку сведчаць, што ў літаратуру прыйшоў шчыры паэт, вершы якога вызначаюцца душэўнай цеплынёй, багатым эмацыянальным зместам. Галоўная тэма Вашых паэтычных пошукаў — родная бацькоўская зямля, чалавек працы, багаты духоўны свет сучасніка. Лепшыя з Вашых твораў вызначаюцца сваім адметным поглядам на з'явы жыцця. Прыемна адзначыць, што Ваша майстэрства расце і ўдасканальваецца ад публікацыі да публікацыі.

Жадаем Вам, дарагі Аляксандр Пятровіч, новых творчых здзяйсненняў, здароўя, шчасця!».

Супрацоўнікі штотыднёвіка далучаюцца да гэтых пажаданняў.

СУСТРЭЧА З ПЕСНЯЙ

Філіял Белдзяржфілармоніі адкрыты ў рэспубліканскім Палацы культуры прафтэхадукацыі. Першы канцэрт адбыўся ў мінулую суботу. Ён прысвячаўся творчасці народнага артыста рэспублікі І. Лучанка. Узнёслае, пранікнёнае слова пра кампазітара сказала музыказнавец І. Зубрыч. Затым уладарыў на сцэне сам госць. Задушэўную гаворку з маладым пакаленнем вёў ён, прыгадваючы дні свайго маленства, першыя крокі ў вялікае мастацтва, успамінаючы паездкі па краіне і за межы бацькаўшчыны. Шчыры, папулярны расказ дапаўняўся лірычнымі і патрыятычнымі песнямі ў выкананні беларускіх артыстаў і самога сябе пад свой жа акампанемент на раялі.

З асаблівым захапленнем сустрэлі прыфутныя хор мінскай музычнай школы пры кансерваторыі пад кіраўніцтвам Л. Стульскай. Зладжана, парыўна праспявана «Балада аб мужкасці». І выканаўцы ўхвалены дружнымі воплескамі слухачоў.

— Песня прысвечана,— гаворыць І. Лучанок,— І. Ф. Шчэрбу, які ў свой час здзейсніў на алжырскай зямлі гераічны ўчынак. Ён сёння тут, у зале.

На сцэну ў суправаджэнні маладой асобы падымаецца высокі, стройны мужчына. І ўсе ўсхвалявана змаўкаюць. Удзячна слухае маладая змена рабочага класа шаноўнага прамоўцу, які і зараз, з'яўляючыся старшынёй Беларускага таварыства сляпых, выконвае свой грамадзянскі абавязак.

Хор прапануе слухачам яшчэ адну песню — «Пакланіцеся, унукі, дзеду».

За раялем зноў І. Лучанок. Душу насельнікаў залы лагодзіць фантазія на розныя аўтарскія песні, сярод якіх і даўно прызнаныя ў народзе «Мой родны кут...», «Спадчына», «Жураўлі на Палессе ляцяць...».

Л. ЮРЧЫК.

ПАМЯЦІ МАЙСТРА

У Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага адбылося юбілейнае пасяджэнне, прысвечанае 70-годдзю з дня нараджэння Г. Жыхарава — віднага дзеяча беларускага народнага інструментальнага мастацтва. З дакладамі выступілі дацэнты М. Солапаў і Г. Асмалоўская, старшыя выкладчыкі В. Шчэрбак і В. Чабан. Яны расказалі пра шматгранную дзейнасць выдатнага музыканта-асветніка, яркага прапагандыста розных форм выканальніцтва на народных інструментах, выдатнага педагога, які стаяў ля вытокаў прафесійнай асветы ў Беларусі.

У канцэрце, праграма якога складалася пераважна з аранжыровак Г. Жыхарава, выступілі майстры беларускай сцэны — яго вучні, студэнцкія аркестравыя калектывы, ансамблі народных інструментаў.

Т. КАРОТКАЯ.

ПА П'ЕСЕ БЕЛАРУСКАГА ДРАМАТУРГА

У мінулым годзе маскоўскія тэатры неаднаразова звярталіся да твораў беларускіх аўтараў. У апошнія дні 1985-га адбылася яшчэ адна прэм'ера. На гэты раз на сцэне Маскоўскага драматычнага тэатра імя А. Пушкіна. Галоўнага рэжысёра тэатра Б. Марозава зацікавіла п'еса маладога драматурга Анатоля Кудраўцава «Іван і Мадонна», твор, у якім вядзецца прынцыповая гаворка аб такіх вечных чалавечых каштоўнасцях, як сумленнасць, праўдзівасць, раскрываюцца складаныя характары.

Пастаноўшчык спектакля Б. Марозаў, мастак М. Рыбасава, кампазітар Ю. Логінаў. Ролю Івана выконвае папулярны савецкі акцёр, заслужаны артыст РСФСР Г. Буркоў, Мар'і — заслужаная артыстка РСФСР Н. Папова.

М. ГЕЛЬСКІ.

Акрамя ўсяго, прыязджаючы сюды, ён адпачываў ад імклівага і турботнага часу, знікаючы ў сваім мінулым, дзе ўсё было так ясна...

— Ці не Колька? — пачулася пад самым вухам.

Букевіч падумаў, што яму падалося, што гэты голас прагучаў у яго памяці. І сапраўды, не магла ж незнаёмая жанчына, што стаяла перад ім і крывіла нафарбаваныя вусны ў разгубленай усмешцы, загаварыць Лілінымголасам.

— Ліля? — спытаў Букевіч, не сумеўшы схаваць ні здзіўлення, ні разгубленасці: у размажнелай жанчыне тая даўняя дзяўчына з жоўтым вяночкам на галаве была схавана яшчэ болей надзейна, чым увесь той даўні свет пад тоўшчай вадасховішча.

— Няўжо я так змянілася? — яна з недаверам і са шчырым жахам у вачах глядзела на яго. — Я лічыла, што я ўсё тая ж. Мне ўсе так гавораць... Ты ж ніколькі не змяніўся. Я цябе адразу пазнала...

— Я таксама... пазнаў адразу, — схлусіў ён. — Але так нечакана. Хоць, — ён ледзь не прызнаўся, што заўсёды спадзяваўся яе сустрэць тут. — Вельмі прыемна, вельмі прыемна. Ты і не ўяўляеш, як здорава ўсё гэта. Ды прысядзь ты, — ён падняўся, чакаючы, пакуль яна сядзе.

— Ой, у мяне ж часу няма, — яна падняла падол вузкага плацця, прысела, крыкнула двум мужчынам і жанчыне, якія, адышоўшыся крыху, спыніліся, чакаючы яе. — Ідзіце, я вас даганю, — і глянула на Букевіча, які сціпла прысеў ледзь не на край лаўкі, так, як звычайна глядзяць на даўно забытую рэч, нечакана адшуканую ў шафе. — А ведаеш, ты ўсё ж змяніўся. Але толькі стаў болей падобны на сябе, — яна ўсміхнулася, бліснуўшы залатымі зубамі. — Усё яшчэ больш праявілася. У вачах тая ж летуценнасць, рамантыка, — зноў у голасе насмешлівая інтанацыя. Змерала яго прыдзірлівым позіркам, затрымала пагляд на чырвоным сцяжку на лацкане пінжака. — Я сёння на кухні вару абед і раптам чую па радыё, што ў нашым горадзе адбылася нейкая нарада і на ёй выступіў... Назвалі тваё прозвішча. Я яшчэ падумала, ці не ты...

— Не, не я, — Букевічу нешта перашкаджала шчыраваць з ёй. — Супадзенне...

— Шкада, — яна, відаць, не вельмі паверыла яму, яшчэ раз прыдзірліва агледзела яго. — Я падумала, ты... Яшчэ ўзрадавалася. Падумала, трэба б знайсці цябе, пагаварыць. Можа, думаю, успомніць,— памаўчала, відаць, вагаючыся, гаварыць ці не.— Думаю пайду паскарджуся. Можа, не адмовіцца, паможа... Сына з нявесткай ніяк не аддзялю. У гарсавеце круцяць адну і тую ж пласцінку. У вас хапае плошчы. Канечне, хапае, калі глядзець фармальна. Тры пакоі, пяцьдзесят квадратаў. Але дзве сям'і на адной кухні... Хто цяпер так хоча жыць? З нявесткай ворагамі станем. Кажуць, самі мяняйцеся. Канечне, казаць лёгка. Выменяеш катух. Роднаму сыну лепшую ж аддасі. А потым, хіба мы з мужам не заслужылі? Мы ж у магілу з сабой тую кватэру не возьмем, застанецца дзяржаве. А галоўнае, не хачу пераязджаць, хачу тут дажываць. Калі вёску зносілі, я настаяла, каб тут кватэру далі, не хацела перабірацца на другі край горада. — Замаўчала, чакаючы, што ён скажа. Але Букевіч засяроджана маўчаў. — Ну як жывеш? Ёсць жонка, дзеці?

— Ёсць. І жонка, і дзеці. Сыны. Большы жанаты, меншы ў арміі.

— Цікава, цікава, — глянула на гадзіннік. Было відаць, што яна страціла ўсялякую цікавасць да Букевіча.

— Што цікава?

— Я думала, у цябе ніколі дзяцей не будзе, — паднялася, папраўляючы падол плацця. Хацела была пайсці, але не спяшалася, акінула яго насмешлівым позіркам. — Ты заўсёды быў такі рамантычны. Не хадзіў па зямлі, а лётаў.

— Таму і адмовілася паехаць на цаліну? — спытаў Букевіч і дадаў:— Ці наогул збаялася?

Ёй прыемна было, што яна разварушыла гэтага ганарлівца. І цяпер ёй хацелася не толькі пакрыўдзіць яго, а нават прынізіць.

— Не, не збаялася, — пагардліва глянула на яго. — Не любіла я цябе, Колька, — замаўчала, каб пацешыцца тым уражаннем, якое зрабіла на яго. — Праўда. Ды алкуль яна магла быць тады, тая любоў?.. Яшчэ ў сёмым ці восьмым класе, не помню, мы з сяброўкай вырашылі закахацца. Ведаеш, начыталіся кніжак... А ў каго? Ну, выбралі сабе хлопцаў. Але не маглі ніяк дамовіцца, каму ў якога. Памераліся. Мне выпаў ты. Я і пачала за табой ганяцца. Праўда, доўга не давялося. Ты адразу клюнуў. А мая сяброўка так нічога і не дамаглася. Нейкі дэбіл ёй трапіўся. Не зразумеў яе. І глядзець не стаў. Дык яна і цяпер, замужам даўно за іншым, а, дурная, лічыць, што па-сапраўднаму кахала толькі яго. А ты... Я не чакала, што ты так закахаешся. Аж смешна было, як ты хутка згубіў галаву. З часам і ў мяне нешта з'явілася. Я гэта адчула на выпускным вечары. Не, не каханне. Адчула, што мне шкада цябе страціць. А калі ў армію ішоў, я ўжо гатова была на ўсё. Але ты... Сам страціў мяне. Каб меней гаварыў, а то... Калі ты мяне паклікаў на цаліну, якраз тады мне сустрэўся адзін журналіст з радыё. Той не любіў кідаць словы на вецер. Праз тыдзень павёў запісвацца... Потым пачалі зносіць нашу вёску. Кожнай сям'і давалі кватэру. Нам з мужам далі. Тры пакоі. Тады яго бацькі яшчэ жылі, мы іх таксама прапісалі. А што было рабіць? Ты ж ведаеш, як у горадзе з кватэрамі. А тут... Як кажуць, ніякіх праблем... Нельга ж было ўпусціць момант. Муж харошы ў мяне. Хочаш, пазнаёмлю? З намі і наша суседка. Таксама з мужам. Мы часта разам ходзім у бар. Там, на беразе. І людзей амаль нікога. Пайшлі? Тут недалёка. Адразу за паваротам. Пасядзім, пагаворым, успомнім...

— А што ўспамінаць? — ён паспрабаваў бесклапотна ўсміхнуцца, але гэта яму не ўдалося.

— Як што? Нешта ж помніцца,— яна падумала, што ён вагаецца, зноў прысела на лаўку. На яе твары з'явілася больш добразычлівасці, ласкавай жаночай лагоднасці. — Я сама часта з работы паўз бераг хаджу. За дзень як надрынкаюць у вушы юныя геніі, потым так хочацца цішыні. Іду, гляджу на ваду, успамінаю, як жылі тут...

Ён не верыў ёй. Яшчэ гучала ў вушах, як сказала яна, што не любіла яго. Жанчына, відаць, разгадала яго настрой, вось і падладжваецца, хоча расчуліць.

— Пра якое дрынканне ты гаворыш? — пасля непрацяглай паўзы спытаў. — Ты ж рыхтавалася ў політэхнічны...

— Нават паступіла, — усклікнула так, нібы асуджала свой даўні ўчынак. — І правучылася два гады... А потым...

— Замуж?

— Не. Муж у мяне наконт гэтага якраз нічога. Сам закончыў кансерваторыю, так што... Я тады пра што падумала? Ну, стану інжынерам і што? За якіх сто рублёў укалваць ад цямна да цямна? Ведаю, як інжынеры робяць. Калі яшчэ мужчына, то, глядзіш, у начальнікі выб'ецца, а баба? Рэдка якая... Хіба няпраўда? Я падумала, падумала, ды і кінула. Якраз тады сын нарадзіўся. Потым паступіла ў музычнае вучылішча. Завочна. На вуха, слава богу, слон не наступіў. Муж памог. Скончыла. І нядрэнна. Цяпер я гора не ведаю. Тры дні ў тыдзень раблю і то няпоўныя, і пару

(Заканчэнне на стар. 12).

Тварам да ПРАЎДЫ

Святлана КУЗЬМІНА—Марта ў спектаклі «НЕ БАЮСЯ ВІРДЖЫНІІ ВУЛФ» на сцэне Тэатра-студыі кінаакцёра

...ЯНА ЎВАХОДЗІЦЬ у свой дом з вуліцы, з дажджу проста ў гасціную. Гучна грукае дзвярыма, на хаду нядбайна шпурляе свой модны капялюш... Быццам упершыню ўбачыўшы пакой, патэтычна зазначае: «Якое ўбогае жытло!» Аднак жытло зусім не ўбогае — яно такое, якое могуць сабе дазволіць не надта багатыя, але і не бедныя інтэлігенты: утульнае, са зручнай мэбляй, карцінамі, кнігамі. Хіба толькі занадта многа бутэлек, хіба толькі занадта вялікая тахта, што ганарліва займае ўвесь цэнтр пакоя... Жытло, якое калісьці — раней, у лепшую для яго гаспадароў часіну — уладкоўвалася для шчасця, працы, кахання.

Але хутка мы даведаемся, што шчасця не адбылося, работа не прыносіць задавальнення, а каханне... каханне вырадзілася. І не разбярэш, што гэта — нянавісць, пагарда, абражанае самалюбства, вытанчаная бязлітаснасць, душэўны стрыптыз — ці хваравітае, знявечанае, ды ўсё ж каханне?! Бо калі знікне зусім яно — згасне ў жыцці Джорджа і Марты мігатлівы агеньчык чалавечнасці...

ЧАС І МЕСЦА дзеяння ў п'есе «Не баюся Вірджыніі Вулф», даўнім і ці не лепшым творы Э. Олбі, вызначаны дакладна: пасля вайны, у амерыканскім універсітэцкім гарадку. Героі: выкладчык гістарычнага факультэта Джордж, яго жонка Марта, дачка рэктара універсітэта, малады выкладчык біялагічнага факультэта Нік і яго жонка Хані. У маленькай «дзяржаве», шматзначна названай Новым Карфагенам, — свае законы, правілы, звычкі, але разам з тым гэта зрэз з цэлага грамадства, дзе духоўная «эліта» перажывае глыбокі крызіс. П'еса Э. Олбі даследуе праблему адчужэння, сутнасць якой, паводле вызначэння аднаго амерыканскага крытыка, у тым, што «...не жыццё ўвогуле абсурднае і бессэнсоўнае, а... ёсць людзі, чыё жыццё, адчужанае ад іх саміх, зрабілася пустым і бессэксоўным». Спектакль «Не баюся Вірджыніі Вулф» у тонкай і ўдумлівай рэжысуры Б. Луцэнкі прымушае задумацца над «адвечнымі» пытаннямі: што адбываецца з чалавекам сёння? хто ён? Разам з героямі шукаем мы адказаў, пражываем жудасную «вальпургіеву ноч» жорсткіх гульняў у дзіўным доме Джорджа і Марты. У кампаніі людзей спустошаных і знявераных — адно ў адным і за ўсіх чалавечых каштоўнасцях.

І — тэатр! — перажываем хвіліны асалоды ад акцёрскага мастацтва. Выканаўцы роляў І. Мацкевіч і П. Юрчанкоў (Джордж), Л. Мардачова і Н. Курсевіч (Хані), Ю. Казючыц (Нік) і С. Кузьміна (Марта) складаюць сапраўдны ансамбль, існуюць на сцэне з рэдкім узаемным разуменнем, дакладным пранікненнем у свет п'есы.

Першая сярод іх — Святлана Кузьміна. Яе Марта — нерв, боль, гнеў і душа спектакля.

У ГЭТАЙ РОЛІ паўстала перад намі зусім новая, нечаканая актрыса. Ва ўсялякім выпадку, за тыя гады, што мы бачым Кузьміну на мінскай сцэне або ў кіно, не было ролі, якая б так шырока і свабодна выявіла прыхаваныя дагэтуль яе магчымасці. Мы ведалі Кузьміну стрыманую, здольную дакладна ўвасобіць задуму спектакля, адчувалі яе глыбокі тэмперамент. Яе гераіні былі стрымана-таямнічымі, загадкавымі.

І раптам — быццам выбух. Настаў, мабыць, момант, калі пачуцці і думкі актрысы, што назапашваліся і стрымліваліся, прарваліся ў свет, прычакаўшы свайго часу. Спатрэбілася, каб Б. Луцэнка прапанаваў ёй п'есу Олбі.

У ролі Марты моцна пераплялісся непрымальнасць фальшу і душэўная нявыхаванасць, прага кахання і няўменне кахаць, пяшчота і жорсткасць, — дыялектыка характару, сфарміраванага грамадствам, дзе ўсе чалавечыя каштоўнасці — навыварат... Зайздросная роля — адна з самых цікавых і самых каларытных у сучаснай заходняй драматургіі.

Марта Кузьміной і прывабная, і агідная, і напорыстая, і нястомная, і вынаходлівая, і прыроджаны лідэр, і спакушаны рэжысёр сямейных баталій... З гнуткім моцным голасам, які то абрынае пярун нябесны, бо робіцца з'едлівым, то чыстым і праўдзівым, бы крыніца. Статная, прыгожая — прыгажосць яе твару не могуць перакрэсліць ні грымасы, ні дэманстратыўная абыякавасць да таго, якое робіць яна ўражанне...

Прынамсі, абыякавасці няма — Марта мяняе ўбранні і нават у час кульмінацыі скандалу не забывае паправіць складкі сукенкі, бо скандал — гэта ж яшчэ адзін спектакль, які невядома чым завершыцца і невядома, якія павароты ў ім узнікнуць.

Дзеянне развіваецца ўрыўкамі, падобнымі на графік кардыяграмы. Моманты зацішша выбухаюць пікамі сварак, калі героі — партнёры? праціўнікі? ворагі? — абменьваюцца ўдарамі, не разлічваючы сілы, дакладна выбіраючы самае балючае месца. У спектаклі ўладарыць мастацкая логіка, строгая і выверана рэжысёрская пабудова, але гэта не замінае выканаўцам выказвацца на поўны голас. Кузьміна іграе Марту, здаецца, на мяжы сіл — душэўных і фізічных, дасягаючы сапраўды мастацкага выніку. Толькі яна — адна — адказвае за знявечаную, прагную да ўсялякіх уцех, разбэшчаную і ўсё ж глыбока, непаўна няшчасную, абдзеленую жыццём Марту.

Таленавітая, яркая, здольная на моцныя пачуцці дзяўчынка, якую ў юнацтве арыентавала «жалезная» рука ў аксамітавай пальчатцы... Тата — рэктар... Дамы і паны з «лаяльнага і адданага калектыву» універсітэта... Марта, напэўна, узбунтавалася б, але ж «прыгнёту» ў звыклым сэнсе не было. Замест жорсткага ўціску — умелая, прафесійная нівеліроўка асобы. Да «агульнага назоўніка» яе прывялі спакваля, пад памяркоўнае, добрапрыстойнае журчанне дазволеных размоў, пад салодкае вуркатанне ўзаемных камплімантаў і прызыўны звон ільду ў крыштальных бакалах з віскі. Закаханасць у Джорджа хутка змянілася расчараванасцю: яе абраннік не апраўдаў рэктарскіх спадзяванняў, ён не падыходзіць пад амерыканскі ідэал моцнай асобы. Праўда, гэты працяты рэфлексіяй інтэлігент нядаўна навучыўся даваць адказ на Марціны выбрыкі, чым абуджае ў ёй і непадробную цікаўнасць, і нават іскрынку павагі. Выбуховая сумесь яшчэ не цалкам забітага кахання, пагарды і расчаравання падштурхоўвае Марту правакаваць мужа — дражніць, прыніжаць, з увагай натураліста назіраючы, як Джордж курчыцца ад гневу, крыўды, знявагі.

Што трымае Марту ля Джорджа — няўдачніка, які без бою здаў адну за адной усе свае жыццёвыя пазіцыі? Рэшткі кахання, цудам не прыкончанага ў сямейных звадах? Альбо міф, створаны імі ў кароткія перадышкі між бойкамі, міф, які канчаткова спаяў гэтых бяздзетных мужа і жонку — шматзначна, сімвалічна бяздзетных?..

Гэта іх горкая і салодкая агульная тайна — сын, які існуе толькі ва ўяўленні. Прачнучы кахання і не дасягнуўшы яго, яны стварылі міф пра сына. Але існаваў ён так рэальна, што Марта не вытрывала і выдала чужым людзям тайну, якую яны абое так строга захоўвалі. А калі грымнула катастрофа — Джордж аб'явіў пра смерць сына, — тады Марта амаль што страціла розум і бароніцца ад болю так, як баранілася б, калі б усё было не міфам, а праўдаю.

...ТОЛЬКІ ШТО ЯНА, адчуўшы нядобрае, прыгадвала мілыя падрабязнасці маленства, светлыя дні і дзіцячыя хваробы сына, яго гульні, даказвала сваё мацярынскае права на асаблівую прывязанасць хлопчыка. Ужо не да клопатаў пра знешнасць — недарэчна апранутая, з застылымі вачыма, яна прыцягвае вялізную скрыню з цацкамі, пачынае раскладаць іх паўсюль. Усё гэта было, ёсць і не можа знікнуць! — быццам крычыць Марта... Але Джордж бязлітасна ўпрыгожвае кожную цацку белаю кветкаю — «кветкаю памерлых». З міфам трэба скончыць. Час скончыць з прывідам, фантомам... Можа быць, у гэтым — надзея?..

Мы пакідаем Марту сціснутай, раздаўленай, павержанай... Марту, якая на нашых вачах робіцца відушчаю! Што наперадзе? Пустэча, чарада безнадзейных шэрых дзён?.. Ці, нягледзячы ні на што, жыццё без самападману? Жыццё самнасам з праўдаю?!

Лілія БРАНДАБОЎСКАЯ.

ЛЯ ВОЗЕРА З ТЭХНІЧНАЮ ВАДОЮ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 8—11).

соцень маю. Вучацца ў мяне ў асноўным дзеці гандляроў. У іх мода такая... Так што ніякіх праблем з дэфіцытам. А што яшчэ трэба нашаму брату?.. А ты дзе робіш?

— Ды тут, недалёка, — няпэўна адказаў ён.

— На заводзе?

— На заводзе.

— На якім?

— Ёсць адзін... сакрэтны.

У яго голасе не было пэўнасці. Яна моўчкі глядзела на яго, чакаючы, што ён больш скажа пра сваю працу.

— Ну і як? Кватэра добрая? І наогул?..

— Кватэра добрая і наогул.

— Дык, можа, пойдзем пасядзім, пагаворым? А то нешта гуляем у хованкі, — яна зноў паднялася, стаяла, чакаючы яго. — А што? Пайшлі. Столькі не бачыліся...

Ён глянуў на гадзіннік.

— Каго чакаеш? А я...

— Прызначыў тут адной спатканне, ды няма нешта...

— Можа, мяне ўбачыла?

— Можа.

— Дурная. Каб на мой характар, не пацярпела б. Усіх разагнала б, — яна зноў спыніла свой позірк на лацкане яго пінжака. — А, можа, памог бы адсяліць сына?

Ён прамаўчаў.

— Ну, прабач, што перашкодзіла. Бывай, — зрабіўшы некалькі крокаў, азірнулася. — А, можа, калі б сустрэліся? А? — І каб, відаць, схаваць сваю збянтэжанасць, нечакана гучна засмяялася, кіўком галавы адкінула з ілба ўяўную пасмачку валасоў, потым памацала яе рукой.—А што?

І праз гэты жэст, такі прывычны для яе яшчэ змалку, ён раптам у гэтай зусім незнаёмай жанчыне ўгледзеў тую далёкую Лілю, якую лёс падараваў яму ў юнацтве, і нешта вельмі шчымлівае, як раптоўны ўдар электрычнага току, варухнулася ў душы, ён аж анямеў ад такой нечаканасці. Калі ж ачомаўся і хацеў кінуцца ўслед; каб пагаварыць з ёй зусім не так, як толькі што гаварыў, то ўбачыў, як па сцежцы, перавальваючыся з нагі на нагу, спяшалася цяжкая, камлюкаватая жанчына, якую можна было толькі хіба пашкадаваць...

Было такое адчуванне, што адбылося з ім нешта брыдкае і непрыстойнае. Адкуль яно? Можа, ад таго, што Ліля аказалася зусім не такой, якой ён яе ўяўляў? І не толькі знешне. А душэўна. Тыповая абывацелька, прыстасаванка. І даволі актыўная. Свайго не ўпусціць. Можа, яна і раней такая была, ды ён яе не разгледзеў? А, можа, яе жыццё перайначыла?.. Але якой бы яна ні была, з ім не таілася, была шчырая, адкрытая. А ён гуляў у хованкі. На шчырасць не хапіла смеласці. Слухаў, ківаў галавой, хоць у думках і не пагаджаўся. Выходзіць, хлусіў ёй. Сабе таксама. Можа, і не толькі зараз? Можа, ад гэтага такая брыдкасць на душы?.. Але ж і яна не была шчырая з ім. З самага пачатку сяброўства. Выходзіць, ён цяпер адпомсціў ёй. Не сказаў ніводнага слова праўды пра сябе...

Букевіч, здавалася, па-ранейшаму глядзеў на азёрны разліў, але нічога не бачыў, бо думаў цяпер пра сябе ўчарашняга і сённяшняга.

Потым падняўся і нетаропка пайшоў да дарогі, дзе яго чакала машына.

Насустрач папалася парачка. Яна, хударлявая, танклявая, у вузкіх джынсах, павісла на шыі свайго кавалера, лена перабірала нагамі, а ён, каржакаваты, як штангіст, барадаты, з яркімі, як падмаляванымі губамі, дрынкаў на гітары і ледзь не ў вуха сваёй сяброўцы напяваў:

Мы сустракаліся з табой
Ля возера з тэхнічнаю вадой...

Але Букевіч не заўважыў парачкі, для якой і гэты малады парк, і возера з тэхнічнаю вадой стануць самай прыгожай і дарагой мясцінай на зямлі, і не пачуў, пра што спяваў барадаты.

ПОСПЕХ ФІЛЬМА

Камітэт дзяржаўнай бяспекі СССР прысудзіў прэміі 1985 года за лепшыя творы літаратуры, кіна- і тэлефільмы, якія расказваюць пра чэкістаў і воінаў граніцы. Сярод адзначаных трэцяй прэміяй — стваральнікі мастацкага фільма «Юрка — сын камандзіра» на кінастудыі «Беларусьфільм» — аўтары сцэнарыя С. Бадроў і М. Кругавых, рэжысёр-пастаноўшчык М. Лук'янаў, аператар-пастаноўшчык А. Кляйменаў, выканаўцы галоўных роляў А. Анкудзінаў і Я. Нікіцін.

В. ТАРАСЕНКА.

ЛАЎРЭАТЫ «ЛИТЕРАТУРНОЙ ГАЗЕТЫ»

За актыўны ўдзел у рабоце «Литературной газеты» ў 1985 годзе рэдакцыйная калегія адзначыла прэміямі шэраг аўтараў. Сярод іх Алесь Адамовіч і Васіль Быкаў.

Г. СНЕЖЫН.

ВЫНІКІ КОНКУРСУ

«Литературная газета» падвяла вынікі свайго чарговага фотаконкурсу. Сярод адзначаных трэцяй прэміяй — мінчанін Я. Мяцеліца. Мінскі журналіст В. Драчоў поруч з іншымі аўтарамі атрымаў заахвочвальную прэмію. Рэдакцыя выказала падзяку за ўдзел у конкурсе народнаму фотаклубу «Мінск» і фотаклубу «Вячэрні Мінск».

В. РАЕВІЧ.

Камісія па літаратурнай спадчыне Варлена БЕЧЫКА

Створана камісія па літаратурнай спадчыне заўчасна памёршага вядомага беларускага крытыка і літаратуразнаўцы Варлена Бечыка. У склад камісіі ўвайшлі С. Андраюк (старшыня), Л. Кароткая (маці пісьменніка), А. Кудравец, В. Палтаран.

КІНО

ЗДЫМКІ ПАЧАЛІСЯ

Над кінематаграфічнай версіяй аповесці В. Быкава «Знак бяды» працуе здымачная група «Беларусьфільма». Сцэнарый будучай двухсерыйнай карціны напісаны Я. Грыгор'евым і А. Нікічам. Рэжысёр-пастаноўшчык Міхаіл Пташук, мастак Уладзімір Дзяменцьеў, аператар-пастаноўшчык Таццяна Логінава. У галоўных ролях здымаюцца заслужаная артыстка РСФСР Ніна Русланава (Сцепаніда), народныя артысты БССР Генадзь Гарбук (Пятрок), Уладзімір Куляшоў (Карніла).

Работа вядзецца ў наваколлі Баранавічаў. Тут, на падворку старога хутара і ў сценах сялянскай хаты, здымаюцца эпізоды жыцця герояў у час акупацыі. Наперадзе — тыдні, месяцы творчай працы...

Рабочы момант.

Сцепаніда — заслужаная артыстка РСФСР Н. Русланава.

У ролі Петрака—народны артыст БССР Г. Гарбук.

Кадр з фільма.

Фота А. ДЗМІТРЫЕВА.

ПЕРШЫ ЛАЎРЭАТ

Як вядома, Дзяржаўны камітэт БССР па кінематаграфіі і Саюз кінематаграфістаў БССР з мэтай стымулявання развіцця лепшых традыцый нацыянальнай кінарэжысуры, павышэння ідэйна-мастацкага і прафесійнага ўзроўню фільмаў устанавілі прэмію імя Юрыя Віктаравіча Тарыча, выдатнага савецкага рэжысёра, аднаго з пачынальнікаў беларускага кіно.

Першым лаўрэатам стаў рэжысёр-пастаноўшчык студыі «Беларусьфільм» народны артыст БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Віктар Тураў. Прэмія імя Ю. В. Тарыча прысуджана рэжысёру за стварэнне васьмісерыйнага тэлевізійнага мастацкага фільма «Палеская хроніка» паводле твораў Івана Мележа і значны ўклад у развіццё беларускага кінамастацтва.

Тэлесерыял па матывах «Палескай хронікі» І. Мележа — вынік вялікай работы В. Турава, якая працягвалася некалькі гадоў. Яму, аўтару сцэнарыяў і рэжысёру-пастаноўшчыку экранізацыі, удалося на высокім ідэйна-мастацкім узроўні, маштабна і эмацыянальна ўвасобіць у кінастужцы плынь мележаўскай прозы, складанасць узаемаадносін і напружанасць духоўнага жыцця герояў.

У. МАРОЗ.

МУЗЫКА

«Круглы стол» «ЛіМа»

У размове ўдзельнічаюць заслужаныя артысты рэспублікі, салісты Беларускага радыё і тэлебачання Тамара Раеўская і Яраслаў Еўдакімаў; музычны кіраўнік ансамбля «Планета», аранжыроўшчык Ацатоль Архіпаў; лаўрэат Усесаюзнага конкурсу, салістка Беларускай дзяржаўнай філармоніі Таццяна Арлоўская; дыпламант Усесаюзнага тэлевізійнага конкурсу «З песняй па жыцці», салістка Аб'яднання музычных ансамбляў Наталля Бярнадская.

Такі нялёгкі «лёгкі» ЖАНР

Пра поспехі і праблемы ў развіцці сучаснай беларускай песні разважаюць выканаўцы

КАРЭСПАНДЭНТ. Нямала сказана і напісана пра гэты жанр. Пра тое, што песня заўсёды адрасуецца самаму шырокаму слухачу. Пра тое, што стваральнікі песні павінны вельмі адказна ставіцца да гэтага жанру: узнімаць тэмы «вялікія» і малыя», шукаць свежыя меладычныя інтанацыі, незаштампаваныя гармоніі, новую рытмічную аснову. Словам, рабіць усё, каб песня не толькі прыносіла задавальненне, але выхоўвала ў сваіх прыхільніках добры мастацкі густ і высокую эстэтычную патрабавальнасць. Не выпадкова праблемы развіцця масавых жанраў у беларускай музыцы шырока абмяркоўваліся на выязным пленуме праўлення Саюза кампазітараў рэспублікі ў Гомелі.

Сёння слова — выканаўцам песень. Тым, хто выносіць супольную працу паэта і кампазітара на суд слухачоў. Ад вас, выканаўцаў, у значнай ступені залежыць поспех ці няўдача песні.

Т. РАЕЎСКАЯ. Спявак, вядома, заўсёды павінен займаць актыўную пазіцыю ў адносінах да песні. Вельмі важна разумець і адчуваць тое, пра што мы спяваем, не быць абыякавымі выканаўцамі. Гэта аднолькава датычыць песень патрыятычных, лірычных, так званых забаўляльных...

Я. ЕЎДАКІМАЎ. Спявак павінен памятаць і пра адказнасць перад слухачом, патрабавальна ставіцца да песні: важна, **што** мы выбіраем для выканання!

Калісьці, яшчэ ў пачатку свайго творчага шляху, я спяваў пераважна рускія, украінскія народныя песні, эстрадныя шлягеры. Песень патрыятычных у маім рэпертуары не было. Я нават і не задумваўся над тым, **што** спяваю: голас быў — і спяваў. І вось з'явілася песня Аляксандры Пахмутавай «Гарачы снег». Тут я ўпершыню ў час выканання адчуў, што са мной робіцца нешта дагэтуль невядомае. Я ўпершыню быў усхваляваны тым, **пра што** спяваў! Зразумеў: каб слухачы суперажывалі табе ў час выканання песні, спявак сам не павінен быць раўнадушным. Вось тое першае ўзрушэнне ад песні я дагэтуль памятаю і стараюся захоўваць яго.

КАРЭСПАНДЭНТ. Цяпер у вашым рэпертуары багата патрыятычных, грамадзянскіх песень беларускіх кампазітараў. Гэта, напрыклад, «Ліст з 45-га», «Помніць Вена», «Франтавыя дарогі» Ігара Лучанка, песні Валерыя Іванова, Эдуарда Зарыцкага, цыклы песень Леаніда Захлеўнага «Памяць» і «Я перад вамі з памяццю сваёй» і інш.

Я. ЕЎДАКІМАЎ. Дарэчы, пра песні Леаніда Захлеўнага. Апошняя яго значная работа— цыкл «Я перад вамі з памяццю сваёй», напісаны да 40-годдзя Вялікай Перамогі. У яго ўвайшлі вельмі добрыя песні, але асабліва мне спадабаліся дзве: «Я перад вамі з памяццю сваёй» і «Пяхота». Гэта творы сапраўднага, сталага кампазітара. Калі ў Маскве на Цэнтральным тэлебачанні паказаў іх, там былі здзіўлены, даведаўшыся, што напісаў гэтыя песні малады чалавек. Гаварылі, што так мог напісаць толькі той, хто зведаў гора вайны, сам прайшоў яе дарогамі. Наогул, беларуская патрыятычная песня заваявала ўсесаюзнага слухача, выйшла за межы рэспублікі дзякуючы менавіта такім добрым, сапраўдным песням.

КАРЭСПАНДЭНТ. Апошнім часам нашы кампазітары прапаноўваюць вам у асноўным песні патрыятычныя. Ці не атрымліваецца, што вы пачалі абмяжоўваць свой творчы дыяпазон?

Я. ЕЎДАКІМАЎ. Мне нават слухачы пішуць, што хацелі б пачуць мяне і з песнямі лірычнымі, жартоўнымі. Зразумела, спявак не мае права спыняцца, засяроджвацца на чым-небудзь адным. Разумею разам з тым, што занадта сучасны шлягер не спяю, бо я спявак іншага плана. Але вось добрую лірычную песню выканаю з вялікім задавальненнем. А з такімі песнямі ў мяне сёння праблема. Вялікія надзеі звязваю з дзвюма новымі песнямі Эдуарда Зарыцкага. Такіх у маім рэпертуары яшчэ не было: яны цікавыя па форме, прыгожыя па мелодыцы. Адна песня на верш Генадзя Бураўкіна, другая — на верш Мікалая Грыбачова. З радасцю бяруся за работу.

Т. РАЕЎСКАЯ. Па сабе ведаю: спеваку вельмі хочацца вырвацца з нейкага ўстойлівага стэрэатыпу. У нас ёсць выдатныя грамадзянскія, патрыятычныя песні, часта мне даверяюць выконваць лірычныя, лірыка-драматычныя песні. А чаму б не напісаць добрую жартоўную, вясёлую, рухомую песеньку — трэба ж некалі чалавеку ў наш бурны, імклівы час расслабіцца, адпачыць!

Н. БЯРНАДСКАЯ. Сапраўды, можна гаварыць, што песенная творчасць беларускіх кампазітараў мае акрэсленую аснову — гэта лірыка: патрыятычная, грамадзянская, любоўная. І тут, лічу, ёсць нямала адметных узораў...

КАРЭСПАНДЭНТ. А вы не прыгадаеце сваю першую сустрэчу з беларускай песняй? Восем гадоў назад вы прыйшлі на прафесійную сцэну...

Н. БЯРНАДСКАЯ. Да гэтага ў самадзейнасці я спявала танцавальныя песні, шлягеры. Павел Яўгенавіч Кандрацюк, дырыжор-кансультант нашай філармоніі, дапамог мне ў фарміраванні беларускага рэпертуару. Напачатку былі песні Уладзіміра Будніка «Водар чаромхі», «Пах чабаровы», потым з'явіліся песні Ігара Лучанка «Помніце», Уладзіміра Дарохіна «Як тры гусі», Уладзіміра Прохарава «Гуляюць 'дзеці». Да тэлевізійнага конкурсу «З песняй па жыцці» Эдуард Зарыцкі спецыяльна па маёй просьбе напісаў песню «Беражыце матуль» на вершы Расула Гамзатава. Словам, у мяне цяпер ёсць што спяваць.

Але хочацца паспрабаваць сябе і ў забаўляльнай беларускай песні. Іх у нас амаль што няма — пра гэта гаварылася і на пленуме праўлення Саюза кампазітараў у Гомелі. Мяне, напрыклад, трывожыць тое, што маладыя, пачынаючыя кампазітары ў песні ідуць па пратаптанай сцежцы, не хочуць шукаць новага. Часам яны зусім недасведчаныя ў напрамках развіцця сучаснай эстраднай песні. А трэба ж шукаць, спрабаваць!

Між іншым, адразу пасля конкурсу «З песняй па жыцці» некаторыя маскоўскія аўтары прапанавалі мне свае песні, лірычныя і забаўляльныя, як, напрыклад, песня Юрыя Саульскага «Шчаслівая вясна». Яна мне падабаецца. Гэта сапраўдная музыка для адпачынку, добрая песня, сучасна аранжыраваная. І вось нядаўна я ўпершыню падрыхтавала і забаўляльную беларускую песню. Гэтую цікавую песню «Дзе ты, мілы» напісаў Эдуард Агароднік на вершы Ніла Гілевіча. Запісала яе на радыё, але адчуваю, што над выкананнем трэба яшчэ працаваць і шукаць нейкую асаблівую манеру, асаблівы выканаўчы стыль.

Т. АРЛОЎСКАЯ. Так, каб добра выконваць сучасную забаўляльную песню, трэба шмат працаваць і над вакалам, і над сцэнічным рухам. Я займаюся цяпер ва Усерасійскай тэатральнай майстэрні мастацтваў у Маскве. Мой настаўнік, Людміла Леанідаўна Нікалаева (у яе ў свой час займаўся Валерый Лявонцьеў), дапамагае мне ў працы над сольнай праграмай. Хачу, каб у гэтай праграме былі і шлягеры, і лірычныя песні. Беларускі рэпертуар у мяне пакуль невялікі, але ўсё, што я паказала ў Маскве,

(Заканчэнне на стар. 14—15).

Змітро БЯСПАЛЫ

ЖЫВОЕ ВОЗЕРА

Я ЖЫЎ у дзеда Кірылы, у яго невялікай, чатыры на чатыры метры, прысадзістай, урослай у зямлю, з круглых бярвенняў хаціне, накрытай вельмі даўно чаротам, па якім за доўгія гады разаслаўся зялёны мох.

Вакол хаты ніякай агароджы не было. Толькі метраў за дзесяць ад яе — невялічкі гародчык — загончык для бульбы і на грады — быў абгароджаны плотам у тры жэрдкі ад ласёў і дзікоў.

З паўночнага боку за хатаю стаяў стары бор. Самыя бліжнія тоўстыя хвоі раслі ад хаты на такой адлегласці, што калі б якая і ўпала, яна вяршалінаю не дасягнула б будыніны. Пад хвоямі тулілася невялікая хіленькая лазня, якая нагадвала старэнькі хлявок. Здавалася, што каб падзьмуў моцны вецер — яна развалілася б.

З паўднёвага боку ў дзедавай хаціне было толькі адно невялікае акно. Гэтым адзіным акенцам яна глядзела на возера, бераг якога пачынаўся за вузкім роўным лужком, што падступаў да самай вады.

Возера было невялікае — метраў на трыста ўшыркі. З захаду яно пераходзіла ў балота — там бераг зарос густым чаротам. З усходу ж па-над возерам высіліся, абвітыя хмелем, голыя, без лісця, і таму здаваліся вельмі высокімі, тоўстыя вольхі, у падножжы якіх разрасліся лаза і крушына.

У хаце ўсё было проста, як і яе гаспадар: у адным кутку — печ, у другім — дапатопны нікеляваны жалезны ложак з сеннікам, з даматканымі коўдрамі і вялікай пуховай падушкай. Каля акна — самаробны стол з дубовых дошак, з двух бакоў якога стаялі дзве лаўкі. Каля дзвярэй — гнілаваты ўслончык з вядром для вады.

Сцены, пачарнелыя ад часу, былі голыя, і пабеленая печ выглядала дужа ж белай. Толькі з аднаго боку акна на суканай тоўстай нітцы вісеў маленькі перакідны каляндар, з другога — ходзікі з шышкінскімі мядзведзямі на цыферблаце, пад якімі на ланцужку вісела яловая шышка — жалезная гірка.

Надвор'е пад канец лістапада мянялася амаль штодня: то ліў дождж і з хаты не выйсці, то сыпаў снег з градам-крупою, то свяціла сонца, было ціха, бязветрана, і ўночы падмарожвала, то шумеў, часам лютаваў халодны паўночны вецер.

Дзед Кірыла добра напальваў увечары печ. Іншы раз так напаліць, што хоць дзверы адчыняй. У хаце было цёпла і ў непагадзь неяк вельмі добра і ўтульна.

Пасля вячэры дзед Кірыла лез на печ і разагграваў, як ён казаў, старыя косці, выганяў ламату з суставаў. Я ж пры лямпе чытаў кніжку ці вёў з дзедам нетаропкую гаворку. Часам гутарка пачыналася пра гараджан, пра гарадское жыццё. Дзед Кірыла ажно прыўзнімаўся на локцях і, прыжмурыўшы вочы, з хітраватай усмешкаю гаварыў пра гараджан: маўляў, нашто яны купляюць шмат адзежы, посуду, кватэры забіваюць мэбляй, нечага некуды ўсё бягуць-спяшаюцца, мітусяцца... «Не, не разумею я іх... — казаў дзед Кірыла. — Нашто чалавеку ўсё гэта?.. Чалавеку многа не трэба... Ёсць што есці, ёсць што апрануць, ёсць дзе жыць... А што яшчэ трэба?..»

Пераканаць яго ў адваротным было немагчыма.

Засынаў ён хутка, а я яшчэ доўга, амаль да самых пеўняў, чытаў тыя самыя кніжкі, якія ў горадзе не хацелася браць у рукі, а тут, у дзедавай хаце, у цішыні, дзе нішто не адцягвала ўвагу, ад іх было не адарвацца.

Дзед, як і ўсе старыя, уставаў рана і знікаў на цэлы дзень у лес — там у яго заўсёды было безліч розных спраў.

Я адзін цэлымі днямі сядзеў у хацінцы і, калі нічога не хацелася рабіць, калі нават не чыталася, падоўгу сядзеў за сталом каля акенца і з цёплай хаты назіраў за возерам. І чым больш я назіраў за ім, тым больш яно западала мне ў душу, тым больш яно здавалася такім жа жывым, як дзед Кірыла, як і сам я.

Калі свяціла сонца, возера было нейкае добрае і ласкавае, было такое светлае, што ў ім бачылі сябе высокія чорныя вольхі і жоўты чарот з рыжымі мяцёлкамі.

Калі ж над возерам плыла шэрая ці чорная хмара ды налятала ветравая хваля, яно хмурнела, чарнела, маршчынілася, — нібы чалавечы твар.

Праплыве хмара, прабяжыць вецер... І вось на возера зірне сонца, — адразу ж мяняецца і яго твар, яно святлее, харашэе.

Калі неба назусім засланялі хмары, калі ўсё наваколле было хмурнае, такім жа рабілася і возера — хмурным і непрывабным.

Назіраючы за возерам, я прыгадваў, як дзед Кірыла казаў: «У возера, як у чалавека, ёсць душа: у сонечны дзень яно ласкавае, прыветнае, а ў хмурнае надвор'е — змрочнае». Ды мне і самому пачало здавацца, што мой настрой быў суладны з возерам. У сонечны дзень я не мог налюбавацца яго прыгажосцю, кожны раз знаходзіў у ім нейкую прыцягальную рысачку, мой настрой быў цудоўны, узнёслы. Не было ж сонца, — і я скісаў, не хацелася глядзець і на змрочнае возера, хоць на ім штодня плавалі качкі, за якімі я назіраў.

Дзед Кірыла, як толькі вяртаўся надвячоркам дамоў, адразу цікавіўся: «Як там мае качурыкі?» Гэтак ласкава ён называў качак.

— Сёння выплывалі амаль на самую сярэдзіну... Усёй чарадою.

— Не палічыў, колькі іх? — цікавіўся дзед.

— Спрабаваў, але збіўся...

Качкі штодня падвечар выплывалі з чароту, плавалі па возеры, куляліся: галава ў вадзе — хвост угору... Я колькі разоў ужо спрабаваў іх палічыць, але ў мяне нічога не атрымлівалася: адзін раз налічыў больш за сотню, другі раз — менш.

Качкі даплывалі толькі да сярэдзіны возера, а да «нашага» берага чамусьці не набліжаліся, хоць іх ніхто не палохаў, не чапаў. У дзеда і стрэльба вісела за печчу, але ён ні разу не ўзняў яе на птушак.

— Хутка паляцяць... — нібыта мне, нібыта сам сабе гаварыў дзед Кірыла. — Зіма будзе ранняя...

— Адкуль вы ведаеце?

— Нутром адчуваю...

Пасля тыдня халоднага, пранізлівага ветру з дажджом праяснілася. Удзень так награвала паўднёвую сцяну хаты, што на ёй ажывалі і поўзалі мухі. Ночы ж былі ядраныя, зябкія, светлыя: месяц браўся на поўню.

На рыжым ад пабурэлай травы лужку штодня ўсё больш і больш вырастала чорных курганкоў — нястомны крот усё капаў і капаў, а лішнюю зямлю са сваіх тунелікаў выпіхваў напаверх. Відаць, ён столькі капаў перад маразамі.

Аднаго дня пасля абеду зірнуў я на возера: качак на ім плавала зусім мала, палавіны таго не было, што дзень таму назад.

Увечары падзяліўся гэтай навіною з дзедам.

— Па-ля-а-це-э-лі, — уздыхнуў ён. — Зіма ідзе.

На другі дзень я налічыў усяго дзевяць качак.

— Уночы будзе мароз — вось і ўцякаюць. Яны лепей які нас з табою ведаюць, што да чаго.

Ужо з печы ён гаварыў:

— Замерзне возера... астудзіцца, ахаладзее яго добрая, мяккая душа.

У гэты вечар я рана патушыў лямпу і палез на мяккі дзедаў ложак. Доўга ляжаў. Сон чамусьці не браў. Думкі набягалі адна на адну... Дзед таксама не спаў. Варочаўся, пакрэктваў. Відаць, таксама аб нечым думаў. За ўвесь вечар мы не абмовіліся ні словам — кожны быў заняты сваім. У мяне чамусьці не выходзілі з галавы дзедавы словы пра возера, пра яго мяккую, добрую душу. Ці не таму ён вось так гаварыў, што ў возера добрая, мяккая душа?..

Днямі мы напалілі лазню.

Лазня ў сярэдзіне мела такі ж, не вельмі прывабны выгляд, як і звонку. Невялікая чорная печ, побач — вялікі чыгун для гарачай вады. Каля адной сцяны шырокая лаўка, як аднаму легчы, каля другой — вялікае альховае карыта з халоднай вадою, якой я нанасіў з возера. Падлога была з тоўстых і шырокіх хваёвых дошак, між якімі былі такія шчыліны, што палец можна было прасунуць.

Я як зазірнуў у лазню, дык адразу падумаў: «Які ж тут дух будзе... тут жа можна прастудзіцца... можна запаленне падхапіць»...

І вось мы з дзедам Кірылам пайшлі парыцца... Лінуў ён гарачай азёрнай вады на камяні — раз лінуў, другі... і пай-

ТАКІ НЯЛЁГКІ «ЛЁГКІ» ЖАНР

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 13.

— і ў майстэрні, і некаторым маскоўскім кампазітарам, — вельмі спадабалася. Гэта песня Ігара Лучанка «Закасі мае вёсны» на словы Анатоля Вялюгіна, песні Эдуарда Зарыцкага «Гэта не я» на словы Ларысы Тараканавай і «Начныя кастры» на словы Сяргея Грахоўскага, «Шукаю цябе» Людмілы Ісупавай на словы Пятра Ламана, некалькі песень Ганны Казловай.

Мне прыемна, што менавіта з песнямі нашых беларускіх кампазітараў я выходжу на Цэнтральнае тэлебачанне. Сярод іх, напрыклад, песня «Начныя кастры». У ёй атрымалася вельмі арганічнае спалучэнне добрага тэксту Грахоўскага і арыгінальнай музыкі Зарыцкага. Ведаю, як уважліва працавалі аўтары над паэтычным словам, перш чым яно загучала ў песні.

Т. РАЕЎСКАЯ. Бывае, бярэшся за тую ці іншую песню, але штосьці ў тэксце песні цябе не задавальняе. Няхай мне даруюць кампазітары, але я лічу, што фундамент у песні — гэта добры тэкст. Мне часта даводзілася і даводзіцца звяртацца да паэтаў з просьбай нешта перарабіць у тэксце песні, якую я ўзяла ў рэпертуар. Як правіла, усе з ахвотай адгукаюцца. Многа працавала з паэтам Уладзімірам Карызнам. Напрыклад, успамінаецца наша сумесная праца над песняй «Хаджу сунічнымі барамі». Тэму гэтай песні я падказала паэту. Было многа варыянтаў тэксту, пакуль не з'явіўся канчатковы, які лічу добрым. Паэт адчуў і зразумеў, што я хацела сказаць у гэтай песні. А цудоўную яе музыку напісаў Яўген Глебаў. Або песня «Люблю цябе, Белая Русь». У ёй рэдкае спалучэнне тэксту Уладзіміра Карызны і музыкі Юрыя Семянякі. Вершы простыя, але не спрошчаныя і вельмі шчырыя. Гэта песня стала ў маім рэпертуары своеасаблівым цэнтрам прыцягнення.

Н. БЯРНАДСКАЯ. Галоўнае, каб кампазітары абавязкова, нават і ў забаўляльнай песні, думалі пра тэкст! Няхай гэта шлягер, але ў тэксце павінна быць думка. Возьмем, напрыклад, песні Райманда Паулса: «Мільён пунсовых руж», «Зялёнае святло» — у іх жа і тэксты змястоўныя. Вось я ўспамінаю, як нараджалася песня Уладзіміра Дарохіна «Прызнанне» на словы Уладзіміра Някляева. Калі мне прапанавалі гэтую песню, музыка спадабалася, а тэкст падаўся банальным: была нейкая слязлівая любоўная лірыка. Кампазітар прапанаваў паэту змяніць тэкст. У выніку атрымалася неблагая песня «Прызнанне» пра любоў да нашай Радзімы.

Я. ЕЎДАКІМАЎ. А часам жа, калі ёсць прыгожая мелодыя і не зусім дасканалы тэкст, здаецца, што песня атрымалася. Слухаеш мелодыю і... падабаецца. Але калі прыслухаешся да спалучэння тэксту і мелодыі, адчуваеш, што менавіта тэкст — ніякі. Для мяне проста неабходна, каб у песні былі добрыя вершы. Дарэчы, вельмі падабаюцца мне вершы Генадзя Бураўкіна, якія гучаць у песнях многіх нашых беларускіх кампазітараў...

КАРЭСПАНДЭНТ. Але словы, пакладзеныя на музыку, — гэта яшчэ не песня...

Я. ЕЎДАКІМАЎ. Канечне! Велізарнае значэнне, часам рашаючае, мае аранжыроўка. Бывае і песня добрая, але чагосьці не хапае ў аранжыроўцы, і песня не набывае прыхільнікаў і наўрад ці шырока загучыць.

Т. АРЛОЎСКАЯ. Я сказала б, што аранжыроўка ў сучаснай песні выйшла на першы план. Мне, напрыклад, падабаецца, як робіць аранжыроўкі Анатоль Архіпаў. Ён добра адчувае, якой павінна быць сучасная песня.

Т. РАЕЎСКАЯ. Згодна, гэта вельмі важна! Таму што, бывае, і песня здаецца добрай, а ўсё роўна нечага ў ёй «не хапае». Пачынаеш разважаць, шукаць прычыны і прыходзіш да высновы, што песня не так «апранута», на ёй быццам адзенне з чужога пляча. Вось цудоўная песня Ігара Лучанка «Трэба дома бываць часцей» на цудоўны верш Рыгора Барадуліна. Песня пра родныя для паэта мясціны, родную Беларусь, а ад Беларусі... нічога няма, акрамя слоў на беларускай мове. Віной гэтаму, лічу, нейкая стандартызаваная аранжыроўка, якая магла б быць і ў любой іншай, «прахадной» песні.

Ці яшчэ песня І. Лучанка — «Маё каханне» на словы Ніла Гілевіча. Ёсць паэзія і ёсць прыгожая мелодыя. Аранжыроўка занадта ж гладкая, без эмоцый. А калі ўчытацца ў вершы, то там: «Прыдзі, як снег, на квецень мая, прыдзі, як бура на зямлю...». Маю на ўвазе не тое, што пра любоў, маўляў, трэба гаварыць гучна, нешта даказваць. І пра значнае ж можна сказаць ціха. Я пра тое, што адсутнічае ў аранжыроўцы нерв, адчуваецца нейкая абыякавасць таго музыканта, які аранжыраваў песню. У дадзеным выпадку і выканаўцы — ансамбль «Сябры» — не адчулі драматургію песні. Песня хоць і невялікі твор, але твор са сваім зместам, кульмінацыяй, развязкай. І ўсё гэта за тры-чатыры мінуты трэба паказаць!

Зрабіць добрую аранжыроўку — гэта мастацтва. Мне вельмі спадабалася аранжыроўка песні Уладзіміра Будніка на словы Алега Лойкі «Калі ласка», якую зрабіў Уладзімір Дамарацкі. Гэты кампазітар працуе ў сур'ёзных жанрах, і раптам — аранжыроўка песні. Я чула гэтую песню і ў выкананні «Сяброў», і ў выкананні Віктара Вуячыча. Шкадавала, што гэтая песня як бы прайшла міма мяне. А песня ж прыгожая, з глыбокім сэнсам, з добрым паэтычным тэкстам. І вось мне захацелася зрабіць яе такою, якою задумаў паэт,— шчыра беларускай. Ну што ж можа быць прыгажэй за два гэтыя словы: «Калі ласка»! Уладзімір Дамарацкі зрабіў цудоўную аранжыроўку — там жа сапраўды Беларусь адчуваеш...

Н. БЯРНАДСКАЯ. У рэспубліцы сёння ёсць цікавыя прафесійныя аранжыроўшчыкі. Гэта Ігар Палівода, Ігар Сафо-

шоў, паплыў сухі, гарачы дух, які, здавалася, прабіраў усяго наскрозь, заходзіў ва ўсе жылкі.

Я пад канец хацеў было яшчэ памыцца і мылам, але дзед Кірыла не даў:

— Усё тут асталося, усё выпарылася... Ніякае мыла не трэба... Такая мяккая, добрая вада, а ты яшчэ мыла...

Пасля лазні дзед, лежачы на печы, кректаў:

— Памаладзеў, памаладзеў... Ад такой мяккай, ласкавай вадзіцы хіба не памаладзееш...

Не ведаю, наколькі памаладзеў дзед, а сам я адчуваў сябе вельмі ж добра. Усё цела поўнілася бадзёрасцю і лёгкасцю.

Відаць, азёрная вада і сапраўды валодала цудадзейнай сілай, відаць, у яе і сапраўды [illegible]а «добрая душа».

Ноччу, як і казаў дзед Кірыла, быў ладнаваты мароз. Берагі возера зацягнула метраў на дваццаць роўным празрыстым лядком. На чыстай вадзе, бліжэй да чароту плавала толькі адна качка. Прыгледзеўся добра — гэта быў качар.

Увесь дзень ён у адзіноце плаваў ці на адной лапцы падоўгу стаяў на беражку лёду каля вады.

У наступную ноч зноў марозіла. Возера зацягнула яшчэ больш. Толькі пасярэдзіне заставаўся метраў на пяцьдзесят круг незамерзлай вады, дзе і плаваў удзень качар.

Калі надвячоркам я глянуў на возера, там рабілася нешта незвычайнае. Уся палонка была запоўнена качкамі. На лёдзе іх таксама стаяла шмат. Пачаў лічыць... Дзе там? Тры сотні налічыў і зблытаўся.

— Залётныя-пералётныя госці, — сказаў дзед Кірыла, калі паглядзеў на возера. — Гоніць іх зіма... Гоніць холад...

Толькі адны суткі качкі трымаліся на возеры.

Палонка за наступную ноч яшчэ больш звузілася. У ёй плаваў толькі адзін качар.

Я з берага крычаў, махаў шапкаю, пужаў яго, каб ён пакінуў возера, паляцеў за сваімі ў вырай, але ўсё было марна — птушка не звяртала на мяне ніякай увагі. Падысці ж да палонкі я не асмельваўся, бо лёд быў яшчэ тонкі.

Увесь вечар мы з дзедам пагаварылі пра птушак, пра адзінокага качара: ці выжыве ён да раніцы, ці не падкрадзецца ўночы да яго ліс і не знясе...

Перад сном я ўсунуў ногі ў боты, накінуў на плечы кажух і выйшаў з хаты.

Над хацінаю, над возерам, над лесам панавала дзіўная ноч. Усё наваколле запаланіла вільготная густая імгла. Праз яе з неба цьмяна прасвечваўся жаўтаваты круг поўні-месяца. Ад яго разыходзіліся расплывістыя кругі — месяц з імі нагадваў круглую жаўтаватую вясёлку.

Бралася на моцны мароз. Я адчуваў, як хапае за шчокі, як халодзіць ногі вышэй халяў. Клаўся іней. Усё навакол рабілася шэрым: і дзедава хата, і лужок перад ёю, і лес, і возера. Толькі пасярод яго чарнела вялікая круглая пляма яшчэ не замерзлай вады. Качара не разгледзеў. Відаць, ён плаваў у палонцы, але я не бачыў яго з-за шэрані.

Я вярнуўся ў цёплую хату.

Усталі мы з дзедам позна. З ім такое здарылася ўпершыню.

У хаце панаваў змрок, бо густазаінелыя, сівыя шыбы слаба прапускалі святло.

Калі я выйшаў з хаты, у вочы ўдарыла сляпучая бель пушыстага інею. Ён укрыў, ухутаў усё навокал: лужок з чорнымі курганкамі перад хатаю схаваўся пад пуховай коўдрачкаю, нават сцены хаты сівелі ад інею. Стаяў у нерухомай белай маўклівасці ўрачысты, нейкі нерэальны, быццам казачны бор: апушаныя інеем кроны хвой раздаліся ўшыркі, нібыта разрасліся — іней надаў ім яшчэ большую велічнасць і прыгажосць.

Возера таксама хавалася пад варсістай белай коўдраю. Не было відаць пасярэдзіне і чорнай плямы-палонкі. Яно ўсё замерзла.

А дзе ж качар?

«Вось і ён пакінуў возера,— падумаў я. — Дарэмна мы з дзедам Кірылам хваляваліся... Хутка і я падамся ў горад і застанецца на возеры адзін дзед Кірыла»...

Сонца паднялося вышэй. Асляпляльна іскрылася ўсё наваколле. І такая была навокал бель, што ажно рэзала вочы.

Праз нейкую гадзіну сонца злізала іней на дрэвах, на кустах, на траве, на хаце... Усё навокал адразу парыжэла, пачарнела і толькі на возеры ляжаў вялікі белы абрус, бо на лёдзе іней не раставаў. Глянуў я на сярэдзіну і — убачыў на белым абрусе чорны гурбячок. Сэрца сціснулася — няўжо качар?

Я ўзяў кол і, стукаючы ім па лёдзе перад сабою, каб не праваліцца, крок за крокам, памаленьку пачаў прабірацца на сярэдзіну возера, раз-пораз кідаючы позірк на чорны гурбячок.

І вось я наблізіўся да яго. Не хацелася верыць у тое, што ўбачыў. Гэта быў качар. Ён замёрз, умёрз у лёд. У яркіх сонечных промнях мігцела, пералівалася чорна-сіне-зялёным бляскам яго пер'е. І гэтак прыгожа ён выглядаў на белым фоне інею, што не хацелася верыць у яго смерць. Галоўка з шырокай дзюбай прыўзнята ўгору. Здавалася, ён хоча вырвацца з лёдавага палону. Здавалася, ён жывы, толькі нерухомы.

Уночы, відаць, качар плаваў у палонцы, потым задрамаў і не адчуў, як пачаў умярзаць у лёд. Калі ж ачнуўся і памкнуўся вызваліцца, было позна ўжо — лёд моцна трымаў яго ў сваіх абдымках.

Мы з дзедам Кірылам высеклі птушку з лёду, прынеслі ў хату. Калі яна адтала, ён перабраў, перамацаў крылы, лапкі, усе костачкі, каб дазнацца, ці не быў ён паранены, ці мог лятаць: пашкоджанняў ніякіх не знайшоў.

Колькі мы ні гадалі, чаму ён не пакінуў возера, але адказу не знаходзілі. Толькі ўвечары дзед Кірыла, лежачы на печы, прыйшоў да высновы, што гэта быў вельмі стары качар — ён ад старасці нікуды і не паляцеў, а застаўся назаўсёды на сваім возеры.

— Дый не памёр ён, — казаў дзед Кірыла, — ён заснуў і не прачнуўся.

Як тут было не паверыць яму?

Качар, чучала з яго, і цяпер стаіць, жыве ў маім пакоі, а разам з ім жывуць і ўспаміны пра дзеда Кірылу, старэнькага, сівенькага, сухенькага лесавічка з рэдзенькімі белымі валасамі на галаве і з маленькай, сівенькай, што шматок моху, бародкай.

наў, Уладзімір Кофман, Уладзімір Ткачэнка, Барыс Бернштэйн, Анатоль Архіпаў. Прычым, аранжыроўкі, якія яны робяць, вельмі розныя, адметныя. Як правіла, музыканты, якія займаюцца аранжыроўкамі, у курсе ўсіх сучасных напрамкаў эстраднай музыкі, але гэта зусім не значыць, што яны нешта слепа пераймаюць, не. Яны працуюць творча.

А. АРХІПАЎ. З 1968 года я займаюся аранжыроўкай. Работа ідзе па-рознаму: бывае, кампазітар прыносіць клавір песні, бывае — толькі вакальны радок. Аранжыроўшчык мае права ў песні нешта дапрацоўваць ці перапрацоўваць...

КАРЭСПАНДЭНТ. Вы супрацоўнічаеце з многімі нашымі кампазітарамі, назіраеце за развіццём песеннага жанру ў рэспубліцы. Вашы меркаванні пра яго праблемы?

А. АРХІПАЎ. Усё ж мала ў нас песень забаўляльных, маладзёжных, вострасучасных. У чым бачу прычыны гэтага? Па-першае, марудна адгукаюцца кампазітары на патрабаванні часу. Па-другое, недастаткова прапагандуюцца новыя песні. Зрэшты, гэта абумоўлена малой колькасцю такіх песень. Тут усё ўзаемазвязана, і адна праблема вынікае з другой. Мне здаецца, для таго, каб новых песень было больш у нашым музычным побыце, трэба апаратыўна запісваць новыя песні. А хто будзе гэта рабіць? ВІА нашы часта знаходзяцца на гастролях. Сабраць разам, напрыклад, наш ансамбль і салістаў філармоніі ці Аб'яднання музычных ансамбляў — таксама цяжка (у кожнага свой план работы). Свайго мабільнага эстраднага калектыву Беларускае радыё не мае. Вось і атрымліваецца, што з новых песень беларускіх кампазітараў у год мы можам пачуць максімум дваццаць чатыры.

КАРЭСПАНДЭНТ. Гэта пры цяперашніх тэхнічных умовах запісу, калі на радыё двойчы ў месяц выходзіць рубрыка «Прэм'ера песні»...

А. АРХІПАЎ. Так. А для таго, каб выклікаць у слухачоў жывую вострую цікавасць да беларускай песні, думаю, трэба ў месяц выпускаць каля дваццаці песенных прэм'ер. Зразумела, не ўсе з іх будуць удалымі, але добрыя песні затрымаюцца ў памяці слухачоў абавязкова.

Сёння вельмі востра адчуваецца праблема тэхналогіі сучаснага працэсу гуказапісу, праблема апаратуры, студыі гуказапісу. У нашай рэспубліцы гэтыя праблемы пакуль не вырашаны. А, напрыклад, у Эстоніі, у Казахстане ёсць некалькі студый спецыяльна для запісу песень, забаўляльнай музыкі, ёсць сучасныя шматканальныя магнітафоны. Праблемы, пра якія я гавару, вельмі спецыфічныя, але ў нейкай ступені, думаю, яны тлумачаць сённяшні недахоп так званай музыкі для адпачынку, адсутнасць яркіх забаўляльных песень, — наогул, недахоп добрай эстраднай музыкі.

Т. РАЕЎСКАЯ. Хтосьці няправільна сказаў, што песня— жанр лёгкі. Ён, безумоўна, лёгкі таму, што слухач успрымае яго лягчэй, чым, напрыклад, сімфонію ці камерны твор. Але колькі паўстае праблем, калі мы пачынаем аналізаваць свае поспехі і няўдачы!

Я. ЕЎДАКІМАЎ. Дадамо, што гаворка пра песню заўсёды важная для спевака. Бо ад вартасцей песні ў значнай ступені залежыць і папулярнасць выканаўцы. Праца творчая абавязвае нас шукаць і знаходзіць сваю песню, знаходзіць і зноў шукаць...

КАРЭСПАНДЭНТ. І на заканчэнне сённяшняй гаворкі можна выказаць спадзяванні на новыя сустрэчы з песнямі — з добрымі песнямі беларускіх кампазітараў. Такіх сустрэч чакаюць і выканаўцы, і слухачы.

Матэрыял падрыхтавала
Т. ПЕСНЯКЕВІЧ.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

У 1980 годзе, калі адзначалася 140-я гадавіна з дня нараджэння Францішка Багушэвіча, у беларускім друку ды выступленнях па тэлебачанні і на юбілейных вечарах неаднойчы выказвалася думка, што даўно пара прывесці ў парадак сядзібу гэтага выдатнага беларускага пісьменніка-дэмакрата, якая знаходзіцца ў Кушлянах Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці. Гаварылася, што ў адноўленым драўляным доме, пабудаваным Багушэвічам у канцы мінулага стагоддзя, трэба стварыць літаратурны музей. Такія слушныя меркаванні тады рашуча падтрымала мемарыяльная камісія Саюза пісьменнікаў БССР. Пасля гэтага былі зроблены першыя арганізацыйныя крокі: Гродзенскі абласны гісторыка-археалагічны музей пачаў складаць план экспазіцыі, прысвечанай Багушэвічу, а рэстаўрацыйныя майстэрні Міністэрства культуры БССР распрацавалі цікавы праект аднаўлення дома. Аказалася, што бярвенні, з якіх ён узведзены, паддаваліся выратаванню — замены патрабавалі толькі самыя ніжнія вянцы. З дапамогай унучкі Ф. Багушэвіча, якая тады яшчэ жыла ў Польшчы, былі высветлены найбольш істотныя дэталі інтэр'ера, а таксама размяшчэнне навакольных пабудоў і прысад. Здавалася, што кушлянскай сядзібе наканавана новае і доўгае жыццё, што яна стане яшчэ адным карысным грамадска-культурным і турыстычным цэнтрам...

Аднак дзесьці ў 1983 годзе падрыхтоўка да рэстаўрацыі спынілася. Між тым час ішоў. Старыя бярвенні пачалі паскорана псавацца. Адзіная ў Беларусі пісьменніцкая сядзіба, што захавалася ад XIX стагоддзя, сёння занядбана. Гэта абурае шматлікіх турыстаў, што самадзейна прыязджаюць, нягледзячы на дрэнную дарогу, у Кушляны — тут бываюць госці нават з суседніх рэспублік. Свае пачуцці яны выказваюць у кнізе, якую захоўвае вартаўнік сядзібы Міхаіл Сымонавіч Ляпеха. Ён, просты селянін, пачаў садзіць алею з шасцідзесяці дубкоў — як жывую памяць пра шэсцьдзесят гадоў, пражытых Багушэвічам. Ён адзін рупіўся, каб агарадзіць памятны камень, каб аднавіць паэтаву альтанку. На жаль, такі патрыятызм Міхаіла Сымонавіча, такая яго ініцыятыўнасць не знаходзяць падтрымкі.

Між тым праз чатыры гады мы будзем адзначаць ужо 150-годдзе з дня нараджэння Багушэвіча. Найлепшым падарункам гэтаму юбілею было б аднаўленне сядзібы нашага класіка, адкрыццё ў яго доме літаратурнага музея. Спадчына Францішка Багушэвіча — гэта неад'емная частка нашай духоўнай спадчыны, нашай гістарычнай памяці. Яе ж трэба зберагаць і памнажаць. Бо прыгадаем адпаведныя словы з артыкула Ю. Афанасьева «Мінулае і мы», змешчанага ў 14 нумары часопіса «Коммунист» за 1985 год. «Як мнемозія — страта памяці — разбурае індывідуальную чалавечую асобу, так гістарычная мнемозія разбурае грамадскую свядомасць, варварызуе і пазбаўляе сэнсу жыццё грамадства».

Адам МАЛЬДЗІС,
пісьменнік, намеснік старшыні мемарыяльнай камісіі СП БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР.

АДНАВІЦЬ БАГУШЭВІЧАВУ СЯДЗІБУ Ў КУШЛЯНАХ

СУПРАЦЬ ФАЛЬСІФІКАТАРАЎ ГІСТОРЫІ

З кожным годам становіцца велічней подзвіг савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, які ўнёс галоўны ўклад у разгром нямецкага фашызму і выратаванне ўсяго чалавецтва ад закабалення. Разам з тым па-ранейшаму многія буржуазныя гісторыкі і публіцысты імкнуцца сказіць гісторыю другой сусветнай вайны, абяліць злачынствы фашыстаў, дыскрэдытаваць міралюбівую знешнюю палітыку СССР. Шэраг падобных канцэпцый развенчаваюцца ў брашуры В. Раманоўскага «Праўда гісторыі супраць фальсіфікатараў», выпушчанай выдавецтвам «Навука і тэхніка».

Аўтар, выкарыстоўваючы багаты фактычны матэрыял, звяртаючыся да публікацый замежных гісторыкаў, паказвае, што ўсе спробы буржуазных фальсіфікатараў не могуць схаваць ад народаў свету праўду аб мінулай вайне, а злачынцы гітлераўцаў забыццю не падлягаюць.

К. РОСІЧ.

ДАРОГАМІ ЛЕГЕНДАРНАГА ЭЦЬЕНА

Імя легендарнага савецкага разведчыка Льва Маневіча стаіць у адным шэрагу з прозвішчамі Герояў Савецкага Саюза Рыхарда Зорге, Поля Армана, Хаджы Мансурова і іншых таленавітых прадстаўнікоў ваеннай разведкі дваццатых-трыццатых гадоў. Ураджэнец Беларусі, ён быў вядомы пад прозвішчамі Эцьен, Конрад Кертнер, Чынкванта Чынкве, Якаўлеў, Старасцін, і толькі праз дваццаць гадоў пасля вайны памерла легенда і ўсё стала, як кажуць, на сваё месца. За доблесць і мужнасць, праяўленыя пры выкананні спецыяльных заданняў Савецкага Ўрада перад другой сусветнай вайной і ў барацьбе з фашызмам, палкоўніку Л. Маневічу пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Пра гераічнае жыццё Л. Маневіча, яго барацьбу супраць фашызму ў свой час расказаў на старонках рамана «Зямля, да запатрабавання» (дарэчы, перакладзенага на беларускую мову) пісьменнік Я. Вараб'ёў. Неўзабаве выйшаў аднайменны двухсерыйны фільм. І вось чытач мае магчымасць зноў далучыцца да легендарнага лёсу Л. Маневіча.

У бібліятэчцы часопіса «Пограничник» выйшла аповесць Я. Вараб'ёва «Эцьен і яго цень». У якасці прадмовы прапанавана рэцэнзія К. Сіманава на раман «Зямля, да запатрабавання»—«Знакаміты і невядомы», апублікаваная 18 красавіка 1971 года на старонках «Праўды».

С. ВІРЗОЎСКІ.

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ «ЛіМа»

«СЛУХАЧЫ ДЗЯКУЮЦЬ»

Так называлася карэспандэнцыя старшага выкладчыка Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, начальніка штаба канцэртна-шэфскай работы на сяле. Яна была змешчана ў «ЛіМе» 22 лістапада 1985 года. Аўтар закранаў праблему матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння канцэртна-шэфскіх брыгад кансерваторыі.

Рэдакцыя атрымала ліст за подпісам загадчыка аддзела культуры ЦК ЛКСМБ У. Пракапцова. Паведамляецца, што паводле дамоўленасці з начальнікам штаба канцэртна-шэфскай работы на сяле тав. Р. Назаранкам і камітэтам камсамола БДК у 1986 годзе мяркуецца на фонды штаба студэнцкіх будаўнічых атрадаў ЦК ЛКСМБ выезд адной брыгады ў летні перыяд, трох-чатырох брыгад — у верасні—кастрычніку, тэрмінам на 6—7 дзён.

ЭСТАФЕТУ ПРЫМАЕ ТЫГР

На навагодніх віншавальных паштоўках, у кіёскаў сувеніраў, масак і значкоў прыкметна схуднелы за год Бык перадае эстафету энергічнаму і моцнаму Тыгру. Кожны Новы год японцы ўспрымаюць як нейкую псіхалагічную мяжу, за якой застаюцца старыя праблемы. Пра новыя ж у гэтыя дні стараюцца не думаць. Спяшацца няма куды. Школы, установы і большасць магазінаў зачынены. Наступае, як лічаць у Японіі, самы бесклапотны перыяд часу.

Паспрабуем пазнаёміцца з «тыповым» сцэнарыем рытуалу сустрэчы Новага года ў гэтай краіне.

У апошні дзень адыходзячага года ў Токіо, на плошчы перад імператарскім палацам пачынаецца традыцыйны абрад «мацідзукі». Нягледзячы на зімовую сцюжу, лепшы барэц сумо 1985 года ў адной набедранай павязцы становіцца на памосце і ў вялізнай, амаль у рост чалавека, ступе пачынае пераціраць цяжкім, падобным на дубіну драўляным таўкачом вараны рыс для прыгатавання моці — рысавых ляпёшак. Тут жа, на плошчы, дзяўчаты ў святочных кімано з латкоў прадаюць гэты прыгатаваны на вачах у шматтысячнага натоўпу навагодні пачастунак.

Аднак пераважная большасць японцаў збіраецца ля тэлевізараў і назіраюць за рытуалам, не выходзячы з дому. Увогуле сустрэчу Новага года японцы лічаць толькі дамашнім святам. Усю падрыхтоўку да яго гаспадыні заканчваюць да наступлення цемнаты. Вечарам усе зноў усаджваюцца, падцяснуўшы пад сябе ногі, перад экранам, і пад гукі песень традыцыйнага навагодняга конкурсу пачынаецца святочная вячэра. На ёй абавязкова будзе соба — лапша з грэчневай мукі — ёю праводзяць стары год. Лічыцца, што чым яна даўжэйшая, тым больш доўгае і шчаслівае будзе жыццё ў чалавека.

Каля дваццаці трох гадзін многія жыхары Токіо і іх госці накіроўваюцца да храма Мэйдзі. Тут штогод збіраюцца да двух мільёнаў чалавек. Роўна ў поўнач па ўсёй Японіі пачынаюць гудзець званы будыйскіх храмаў. Наступае Новы год.

Вось цяпер у цесным сямейным крузе можна бесклапотна памарыць, падумаць пра год, які толькі што ўвайшоў пад дах дома, паглядзець чарговую тэлепраграму. Можна колькі хочаш іранізаваць з гэтай нацыянальнай страсці, але, як сцвярджае статыстыка, 90 працэнтаў японцаў праводзяць навагоднюю ноч іменна ля экранаў тэлевізараў.

...Адна са старажытных усходніх легенд расказвае, што неяк пад Новы год Буда вырашыў склікаць усіх жывёл свету. Тым, хто прыйдзе павіншаваць яго з Новым годам і выкажа сваю павагу, ён паабяцаў у падарунак па годзе. Каб не адстаць ад іншых, мыш неўзаметку ўзабралася на быка і, скокнуўшы, апынулася напярэдадні ўсіх. За ёй у наступным парадку з'явіліся бык, тыгр, трус, дракон, змяя, конь, авечка, малпа, певень, сабака і дзік.

Атрымаўшы свой год, кожная жывёліна перадала яму і ўласныя рысы. Паводле японскіх паданняў, людзі, народжаныя ў той або іншы год 12-гадовага цыкла, маюць рысы адпаведнага звера або птушкі.

Сутры будыстаў вызначаюць 1986 год як год Тыгра. Яны лічаць, што будучыя дванаццаць месяцаў будуць асабліва спрыяльныя для нараджэння хлопчыкаў. Тыгр адважны, настойлівы, акрамя таго, ён здольны на глыбокі роздум, моцнае каханне, вызначаецца вялікай эмацыянальнасцю. Некаторыя спадзяюцца, што Тыгр дасць старт новаму эканамічнаму «скачку». Тады, магчыма, паменшае армія цалкам беспрацоўных, якая дасягнула ўжо 1,6 мільёна чалавек. А як яно будзе на самой справе, ці не «скочыць» Тыгр назад, да крызісу?

За межамі Японскіх астраваў на вуснах усіх модніц адно «надзённае» пытанне: якой жа масці Тыгр, якога колеру строі рыхтаваць да навагодняй ночы? Не хацелася б іх расчароўваць, але першакрыніцы — будыйскія сутры на гэты конт маўчаць. Недаўменне выкліча гэтае пытанне і ў любога японца. Традыцыя апранаць у Новы год адзежыну пэўнага колеру, як ні дзіўна, прыйшла з Захаду, хоць і ўпарта прыпісваецца японцам... А модніцам, можа, паспрабаваць апрануць што-небудзь паласатае?

ВАРВАРСКІЯ ЭКСПЕРЫМЕНТЫ

Пісьмо гучала, як крык адчаю. Нейкая Рут Марыарці, што жыве ў Халіауке, штат Масачусетс, пісала: «Я хачу расказаць вам аб парушэнні правоў чалавека ў ЗША... У дадзеным выпадку гаворка ідзе пра асабліва вытанчанае і працяглае парушэнне такіх правоў. На ваеннай базе Уэстфілд, у штаце Масачусетс, вось ужо на працягу 25 гадоў праводзяцца эксперыменты, у ходзе якіх ажыццяўляецца мікрахвалевае электроннае абпраменьванне навакольнай тэрыторыі. Ахвярамі абпраменьвання робяцца жыхары, якія нічога не падазраюць, у тым ліку і дзеці. Задача — выявіць доўгатэрміновае ўздзеянне мікрахвалевага абпраменьвання людзей на іх псіхічны стан і здароўе патомства. Эксперыменты, у прыватнасці, імкнуцца паўплываць на паводзіны чалавека. У выніку доследаў у жыхароў выяўляюцца ракавыя захворванні, многія паміраюць ад сардэчных прыступаў... Мы ўжо даўно пратэстуем супраць такога беззаконня, але ўрад знарок ігнаруе нашы пратэсты. Шукалі мы паратунку і ў сродкаў масавай інфармацыі, якія накіравалі запыт аб гэтых эксперыментах у Пентагон. Аднак замест адказу ваеннае ведамства пачало распаўсюджваць сцвярджэнні пра тое, што такое абпраменьванне праводзіць... СССР».

Сваё пісьмо Рут Марыарці накіравала замежным журналістам у Вашынгтоне, ужо не разлічваючы больш на дапамогу «свабоднай» прэсы ў ЗША. Яе сведчанні, між тым, — далёка не сенсацыя. Даўно вядома і пацверджана канкрэтнымі фактамі, што ваеннае ведамства Злучаных Штатаў, сакрэтныя службы краіны праводзілі і працягваюць праводзіць цэлы шэраг засакрэчаных праграм псіхахімічных, біялагічных і іншых доследаў над людзьмі, выкарыстоўваючы для гэтага пацыентаў клінік, засуджаных і часам нават — за сходную плату — «добраахвотнікаў». Пентагон спрабуе знайсці такія сродкі ўздзеяння на псіхіку і паводзіны чалавека, якія маглі б зрабіць яго слабай бязвольнай істотай. У выпадку развязвання ваеннага канфлікту падобным шляхам можна было б эфектыўна выводзіць са строю праціўніка. У мірны ж час вынікі доследаў па «мадыфікацыі паводзін», як у ЗША называюць такія эксперыменты, Пентагон, ЦРУ і ФБР не адмаўляюцца выкарыстаць супраць «праціўніка» ўнутранага — для падаўлення палітычнай іншадумнасці ў краіне, і перш за ўсё антываеннага руху. «Нейтралізуючы» яго кіраўнікоў.

«Артышок», «МК-ультра», «Сіняя птушка», «МК-серч» — вось толькі некаторыя з назваў праграм, у рамках якіх праводзіліся антыгуманныя даследаванні ў галіне чалавечага розуму. Па іроніі лёсу якраз у той дзень, калі пісалася гэта карэспандэнцыя, па адным з каналаў мясцовага тэлебачання быў паказаны вядомы ўжо фільм «Як збегчы з вар'яцкага дома», галоўны герой, ролю якога выдатна выканаў таленавіты акцёр Джэк Нікалсан, стаў ахвярай аднаго з эксперыментаў па «мадыфікацыі паводзін». Сучасныя эскулапы шляхам аперацыі на мазгах падавілі ў ім чалавека, які мысліць, супраціўляецца пачварным парадкам.

Мікрахвалевае электроннае абпраменьванне — асабліва варварскі від эксперыментаў па ўздзеянні на паводзіны людзей. Інфармацыйнае агенцтва АП у свой час паведаміла, што па заказе ваенна-паветраных сіл ЗША такія доследы праводзіліся на жывёлах ва універсітэце штата Вашынгтон, якому на гэтыя мэты было выдаткавана паўтара мільёна долараў. Некалькі гадоў назад прафесар нью-йоркскага універсітэта Мілтан Зарэт у інтэрв'ю штотыднёвіку «Нэшнл інквайерэр» паведаміў, што доследы па мікрахвалевым абпраменьванні «паддоследных трусоў» праводзяцца і на медыцынскім факультэце яго ВНУ. Прычым работы пачаліся яшчэ ў 1958 годзе. «Ваенна-марскі флот, — сведчыць М. Зарэт, — правёў таксама ўласнае даследаванне, у час якога абпраменьваліся ў невялікіх дозах некаторыя з добраахвотнікаў, у выніку чаго ў іх выявіліся раннія стадыі сардэчна-сасудзістых захворванняў. У ходзе другога эксперыменту абпраменьванне паўплывала на разумовыя здольнасці людзей. Такімі доследамі чалавека можна давесці да вар'яцтва».

Яшчэ некалькі гадоў назад пра такія д'ябальскія эксперыменты шмат гаварылі на тэлестудыях, пра іх пісалі на старонках газет і часопісаў. Аднак які ж вынік? Абсалютна ніякага. Пентагон проста праігнараваў перасцярогі вучоных і прэсы. Больш таго, каб прыкрыць гэтыя эксперыменты, ЦРУ і міністэрства абароны некалькі гадоў назад сфабрыкавалі версію аб «абпраменьванні», пад якое нібыта падпалі супрацоўнікі амерыканскага пасольства ў Маскве. «Распаўсюджваючы сцвярджэнні пра абпраменьванне, якое праводзіцца ў СССР, — адзначае ў сваім пісьме Рут Марыарці, — Пентагон тым самым вырашыў закамуфляваць уласныя зладзействы».

Злачынствы Пентагона працягваюцца і сёння. Паводле сведчанняў Р. Марыарці, жыхары раёнаў побач з ваеннай базай Уэстфілд у штаце Масачусетс плацяць здароўем і жыццём за гэтыя злачынствы Пентагона. «У нашай краіне шмат гавораць аб правах чалавека, — абураецца аўтар пісьма, — аднак з-за такіх эксперыментаў многія амерыканцы пазбаўляюцца сваіх самых асноўных правоў — права на жыццё, свабоду, здароўе і чалавечую годнасць».

Паводле матэрыялаў ТАСС.

ГАЛІВУДСКАЯ «КУХНЯ СМЕРЦІ»

Страляць з аўтаматаў у Галівудзе пачалі ў гангстэрскіх фільмах часоў «сухога закона». Пастралялі і супакоіліся. Супершпіён Джэймс Бонд, суперпаліцэйскі «Брудны Гэры» і іншыя супергероі фільмаў доўгія гады карысталіся пісталетамі, да аўтаматычнай зброі прыбягалі толькі ў масоўках. Зараз у ход ідуць агнямёты, гранатамёты, цяжкія кулямёты і нават бронемашыны. На афішах новых карцін выканаўцы галоўных роляў пазіруюць як мінімум з адным аўтаматам у руках.

Тэма зброі, дакладней, рэклама сучаснай аўтаматычнай зброі, стала вядучай у кінапрадукцыі Галівуда. Зараз у краіне налічваецца 65 мільёнаў пісталетаў і рэвальвераў, па два на кожныя тры амерыканскія сям'і. А за апошнія пяць гадоў найбольшым попытам стала карыстацца зброя для вядзення сучаснага бою. У руках уласнікаў знаходзіцца 500 тысяч адзінак сучаснай стралковай зброі: аўтаматы, лёгкія і цяжкія кулямёты, хуткастрэльныя вінтоўкі і г. д. Колькасць гандляроў зброяй павялічылася за апошнія пяць год утрая. Спробы неяк спыніць, не гаворачы ўжо аб забароне, гандаль зброяй у ЗША нязменна церпяць правал і ў кангрэсе, і на месцах, у заканадаўчых сходах штатаў.

Наадварот, летам гэтага года на Капіталійскім узгорку быў адобраны законапраект, які аблягчае адкрыццё новых магазінаў па продажы аўтаматычнай зброі. Попыт на яе ў многім выклікаецца шырокай рэкламай.

Зброя і раней рэкламавалася ў спецыялізаваных часопісах тыпу «Салдат удачы». Але галоўную ролю адыгрывае рэклама сучаснай зброі ў кіно і па тэлебачанні. На экранах практычна страляюць круглыя суткі. На сцэнах масавых забойстваў пад няўмоўчны грукат страляніны і выбухаў выхоўваецца новае пакаленне, якое ўспрымае забойства як адзіны, нічым не абмежаваны і некаральны метад дзеяння.

Галівуд жа тым часам стварае новыя фільмы, дзе галоўным героем выступае не чалавек і нават не робат-забойца, а сучасная аўтаматычная стралковая зброя. На экраны выходзяць «Рэма Уільямс. Прыгода пачынаецца» (у галоўнай ролі, па словах газеты «Лос-Анджэлес Таймс», «чалавечая машына смерці»), «Уварванне ў ЗША» з удзелам спецыяліста па кулачнай расправе Чака Норыса. У Ізраілі здымаецца фільм «Група «Дэльта».

Галівудская «кухня смерці» працуе поўным ходам.

НА ЭКРАНЕ

З 6 па 12 студзеня

6 студзеня, 18.10

«КУРГАНЫ ШМАТ ЧАГО НАМ ГАВОРАЦЬ»

Па старонках паэмы Янкі Купалы «Курган». У перадачы прымаюць удзел пісьменнік Янка Брыль, літаратуразнаўцы В. Рагойша, Т. Кабржыцкая, археолаг Г. Штыхаў.

8 студзеня, 19.10

АБМЯРКОЎВАЕМ ПРАЕКТ АСНОЎНЫХ НАПРАМКАЎ ЭКАНАМІЧНАГА І САЦЫЯЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ СССР

Выступае народная артыстка БССР Л. Давідовіч.

8 студзеня, 19.50

У канцэртнай зале Полацкага Сафійскага сабора. Гучаць творы Моцарта, Шуберта, Мендэльсона. Выконаўцы — лаўрэат Усесаюзнага конкурсу, заслужаная артыстка РСФСР спявачка Н. Герасімава, лаўрэат Усесаюзнага і Міжнароднага конкурсаў Г. Забара (кларнет), Ю. Гільдзюк (фартэпіяна), У. Брычыкаў (кларнет).

11 студзеня, 12.00

«МАЕ ЛЮБІМЫЯ ТВОРЫ»

Апавяданне М. Гарэцкага «Роднае карэнне» чытае народная артыстка БССР Марыя Захарэвіч.

11 студзеня, 12.20

Лаўрэаты Рэспубліканскага тэлевізійнага конкурсу «ЗЯМЛЯ МАЯ». Выступае народная харавая капэла Дома культуры работнікаў асветы г. Гомеля.

11 студзеня, 14.15

«НАВІНКІ КНІГАРНІ»

11 студзеня, 19.55

«ТЭЛЕСТУДЫЯ «ЛІРА»

Адбудзецца сустрэча з лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР пісьменнікам А. Дударавым.

11 студзеня, 23.10

«СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ АДЗІНАЦЦАЦІ»

Эстрадная музычная праграма з удзелам А. Пугачовай, В. Лявонцьева, А. Вескі, Я. Еўдакімава, вакальна-інструментальных ансамбляў «Песняры», «Сябры».

12 студзеня, 17.05

«ТВОРЧЫЯ ПАРТРЭТЫ»

Перадача прысвечана заслужанаму дзеячу мастацтваў БССР Маю Данцыгу.

12 студзеня, 19.05

Іграе Мікалай Прашко (балалайка). У праграме творы Андрэева, Дворжака, Глебава.

12 студзеня, 20.15

Эстрадны канцэрт з удзелам А. Вескі, Н. Брэгвадзе, вакальна-інструментальнага ансамбля «Верасы».

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКАЯ ОРДЭНА ДРУЖБЫ НАРОДАЎ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАНСЕРВАТОРЫЯ ІМЯ А. В. ЛУНАЧАРСКАГА

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНТНАЙ ПАСАДЫ ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКАГА СКЛАДУ ДЛЯ АСОБ, ЯКІЯ МАЮЦЬ МІНСКУЮ ПРАПІСКУ:

1. Кафедра спеваў
Прафесар — 1.

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання.

Заявы і дакументы, згодна з палажэннем аб конкурсе, накіроўваць на імя рэктара на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30. Даведні па тэл.: 22-49-42; 22-96-71.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
АТ 04586 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела публіцыстыкі — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела тэатра і выяўленчага мастацтва — 33-21-53, аддзела музыкі і кіно — 33-21-53, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела інфармацыі — 33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рэдакцыя прымае і разглядае апавяданні, нарысы, артыкулы — да 12 старонак, рэцэнзіі, інтэрв'ю, карэспандэнцыі, нататкі — да 6 старонак, вершаваныя творы — не больш як 150 радкоў. Матэрыялы прымаюцца надрукаваныя на машынцы ў двух экземплярах.
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь ЖУК.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Уладзімір ГІЛЕП, Мікола ГІЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Віктар ТУРАЎ, Паўла УКРАІНЕЦ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.